Нацыянальны інстытут адукацыі

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

Г. М. Валочка, В. У. Зелянко

# Беларуская мова
# Тэставыя работы

## 8–11 класы

АВЕРСЭВ

Нацыянальны інстытут адукацыі

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

Г. М. Валочка, В. У. Зелянко

# Беларуская мова
# Тэставыя работы
# 8–11 класы

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне

Мінск • «Аверсэв» • 2013

УДК 373.3.016:811
ББК 74.268.1Беи
В15

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*

**Валочка, Г. М.**
В15 Беларуская мова : тэставыя работы : 8—11 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко. — 2-е выд. — Мінск : Аверсэў, 2013. — 158 с. — (Кантрольна-вымяральныя матэрыялы).
ISBN 978-985-19-0521-4.

Зборнік утрымлівае навучальныя і кантрольныя тэставыя работы, а таксама падрабязны метадычны каментарый па іх правядзенні.

Прызначаны вучням устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

**УДК 373.3.016:811**
**ББК 74.268.1Беи**

*Вучэбнае выданне*

КАНТРОЛЬНА-ВЫМЯРАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Тэставыя работы**

**8—11 класы**

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Д. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк 06.11.2012. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,30. Ул.-выд. арк. 5,54. Тыраж 3100 экз. Заказ

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
ЛИ № 02330/0003944 ад 03.02.2009. Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск.
**E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by**
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78.
Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП № 02330/0494165 ад 03.04.2009.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, Віцебск.

**ISBN 978-985-19-0521-4**

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012
© Афармленне. ТДА «Аверсэў», 2012

# Уводзіны

Дапаможнік уключае тэставыя работы па беларускай мове для вучняў 8—11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Прапанаваныя тэсты можна выкарыстоўваць у якасці ***навучальных*** і ***кантрольных*** работ. Навучальныя тэставыя работы складаюцца з 10 заданняў, на выкананне якіх адводзіцца частка ўрока (10—15 хвілін); кантрольныя тэставыя работы змяшчаюць 20 заданняў, на іх выкананне адводзіцца цэлы ўрок.

Тэставыя заданні накіраваны на:

— паўтарэнне, замацаванне і сістэматызацыю вывучаных моўных і маўленчых тэарэтычных звестак (правіл);
— удасканаленне арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў;
— развіццё граматычнага ладу маўлення;
— узбагачэнне слоўнікавага запасу;
— удасканаленне культуры маўлення вучняў.

Асобныя заданні звязаны з разнастайнымі відамі моўнага разбору (фанетычным, лексічным, марфемным, словаўтваральным, марфалагічным, сінтаксічным, стылістычным). Аснову некаторых заданняў складае тэкставы матэрыял, які спрыяе развіццю і ўдасканаленню моўных і камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў.

Тэставыя работы ўключаюць заданні закрытага тыпу (з выбарам ад аднаго да чатырох правільных адказаў з некалькіх прапанаваных) і адкрытага тыпу (на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі мностваў, самастойны адказ на пытанне без магчымасці выбару з шэрагу варыянтаў).

Пры праверцы тэставых работ настаўнік павінен кіравацца наступнымі крытэрыямі ацэнкі:

| Адзнака | Ступень выканання заданняў |
|---|---|
| 1 | Выканана менш за 20 % прапанаваных заданняў |
| 2 | Выканана не менш за 20 % прапанаваных заданняў |
| 3 | Выканана не менш за 30 % прапанаваных заданняў |
| 4 | Выканана не менш за 40 % прапанаваных заданняў |
| 5 | Выканана не менш за 50 % прапанаваных заданняў |
| 6 | Выканана не менш за 60 % прапанаваных заданняў |
| 7 | Выканана не менш за 70 % прапанаваных заданняў |

| Адзнака | Ступень выканання заданняў |
|---|---|
| 8 | Выканана не менш за 80 % прапанаваных заданняў |
| 9 | Выканана не менш за 90 % прапанаваных заданняў |
| 10 | Выкананы ўсе прапанаваныя заданні |

Рэкамендуем настаўніку такі спосаб ацэньвання: за кожнае цалкам правільна выкананае заданне налічваецца 5 балаў; калі пры выкананні задання вучнем дапушчаны памылкі, налічваецца па адным бале за кожны правільны адказ; калі тэставая работа складаецца з дзесяці заданняў, агульная колькасць набраных вучнем балаў множыцца на два.

Напрыклад, нумары правільных адказаў — 1, 4. Калі вучань адзначыў менавіта гэтыя пункты, ён атрымае 5 балаў за выкананне тэставага задання. Калі адзначаны пункты 2, 4 (дадзены толькі адзін правільны адказ — 4), налічваецца 1 бал; калі адзначаны пункты 1, 3, 4 (дадзены два правільныя адказы — 1, 4), налічваецца 2 балы; калі адзначаны пункты 3, 5 (усе адказы няправільныя), налічваецца 0 балаў і да т. п.

Пасля падліку агульнай колькасці балаў выстаўляецца адзнака:

| Адзнака | Колькасць набраных балаў |
|---|---|
| 1 | 1—9 |
| 2 | 10—19 |
| 3 | 20—29 |
| 4 | 30—39 |
| 5 | 40—49 |
| 6 | 50—59 |
| 7 | 60—69 |
| 8 | 70—79 |
| 9 | 80—89 |
| 10 | 90—100 |

Прапанаваныя тэсты разлічаны як на працу ў класе пад кіраўніцтвам настаўніка, так і на самастойную работу дома (з гэтай мэтай у дапаможніку падаюцца адказы да заданняў).

# 8 КЛАС

## Словазлучэнне

### Варыянт 1

**1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнік з’яўляецца галоўным словам:

1) бацькоўскі наказ;
2) сшытак брата;
3) любы сэрцу;
4) жаданне не спазніцца;
5) позна ноччу.

**2.** Адзначце радкі, у якіх усе словазлучэнні з’яўляюцца іменнымі:

1) край стала; кожны з нас; клічны сказ;
2) мокры ад расы; асноўная думка; недалёка ад дарогі;
3) надзвычай весела; што-небудзь цікавае; снежнай бураю;
4) незвычайна добры; падзел на сказы; хтосьці з нас;
5) нечым вострым; бліжэй да стала; будаўнічы матэрыял.

**3.** Адзначце радкі, у якіх усе словазлучэнні з’яўляюцца простымі:

1) шэсць дрэў; асноўная думка; хлопец высокага росту;
2) балоцістая глеба; вобраз аўтара; самы дарагі чалавек;
3) здабыткі беларускага народа; звычайны звярок; кара дрэў;
4) абмыты ліўнем; назіраючы за жыццём; падняцца высока;
5) трыццаць пяць гадоў; майская цёплая ноч; буду чытаць кнігу.

**4.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць схеме «прыметнік + назоўнік»:

1) ганаровая вахта;
2) дарагі сэрцу;
3) родныя вобразы;
4) чырвоны ад сораму;
5) больш магутны самалёт.

**5.** Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі — дапасаванне:

1) паехаць у горад;
2) зялёны колер;
3) матчын клопат;
4) ехаць хутка;
5) дом на колах.

**6.** Адзначце сказы, у якіх ёсць непадзельныя словазлучэнні:

1) А праз некалькі дзён абодва партызаны зноў прыйшлі на хутар (*Ф. Янкоўскі*).
2) Зіна з санітарнай сумкай бегла разам з байцамі (*У. Ліпскі*).
3) Мікола дастаў фінскі нож і пачаў крышыць лёд (*У. Ліпскі*).
4) Пятру Купрыянаву было пятнаццаць, калі грымнула Вялікая Айчынная вайна (*М. Шыманскі*).
5) Кожны з нас прыпасае Радзімы куток, каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны (*П. Панчанка*).

**7.** Адзначце словазлучэнні з агульным граматычным значэннем дзеяння і прадмета:

1) лячыць хворага;
2) прысвяціць бацьку;
3) разважаць мудра;
4) паехаць купацца;
5) аддаць дакумент.

**8.** Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў кіраванні:

1) дараваць сябру;
2) рагатаць над сказаным;
3) паслаць за братам;
4) выправіцца ў грыбы;
5) бачыцца па суботам.

### Тэкст да заданняў 9, 10

Незадоўга [1]***перад вечарам*** сабралася на дождж. Хмары доўга хадзілі навокал, [2]***збіраліся і разыходзіліся***, зноў збіраліся. Прыпякала [3]***яшчэ мацней***, і парнасць была цяжкай і духмянай. Нарэшце на паўднёвым захадзе густа засінела, адтуль прабег слабы свежы ветрык, і хутка сіні [4]***кавалак неба*** ператварыўся ў навіслую свінцовую хмару. [5]***Сонца схавалася***. Па полі пабеглі палахлівыя цені, змяняючы і [6]***блытаючы колеры***. Поле прытаілася ў чаканні, а хмара набліжалася і цямнела. Час ад часу яе пранізвалі блакітныя ніці маланак (*Паводле Т. Хадкевіча*).

**9.** Вызначце тып маўлення. Адказ запішыце.

---

**10.** Вызначце, якія з пранумараваных спалучэнняў слоў з'яўляюцца словазлучэннямі. Выпішыце іх нумары.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнік з'яўляецца галоўным словам:

1) салёны ад слёз;
2) вавёрчыны прыпасы;
3) добры для нас;
4) прыемны мне;
5) позняй ноччу.

**2.** Адзначце радкі, у якіх усе словазлучэнні з'яўляюцца прыслоўнымі:

1) ледзь чутна; па-свойму прыгожы; першы злева;
2) думаць па-новаму; вельмі весела; цікава слухаць;
3) асабліва прыемна; прыгожа ў полі; радасна ад сустрэчы;
4) трохі далей; надзвычай радасна; горка ад успамінаў;
5) вельмі высокі; добра маляваць; нашмат далей.

**3.** Адзначце радкі, у якіх усе словазлучэнні з'яўляюцца складанымі:

1) пайсці ў грыбы і ягады; сто сорак пяць дрэў; перайсці цераз дарогу;

2) адметнага таленту чалавек; працаваць вельмі доўга; людзі добрай волі;

3) дасягненні сучаснай навукі; артыстка нашага тэатра; маці майго сябра;
4) расці паўз мяжу; няхай прачытае заўтра; будзе думаць да вечара;
5) трыста дваццаць дрэў; праца над раманам; брат вышэйшы за мяне.

**4.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць схеме «прыметнік + назоўнік» (× над назоўнікам):

1) вольны ад працы;
2) мокры без вады;
3) рабочы з завода;
4) бязвоблачнае неба;
5) самы шчаслівы дзень.

**5.** Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі — кіраванне:

1) два сталы;
2) прыйсці пад вечар;
3) сказаць усім;
4) прыйсці адразу;
5) жаданне паехаць.

**6.** Адзначце сказы, у якіх ёсць непадзельныя словазлучэнні:

1) Дзве глыбокія каляіны былі запоўнены мутнай вадою (*Х. Лялько*).
2) Ускрай паляны між алешніку трапляюцца бурштынавыя маліны (*Л. Калодзежны*).
3) Неўзаметку ляцелі насустрач чыгуначныя вёрсты (*М. Лынькоў*).
4) Разам са мной у купэ ехалі яшчэ дзве дзяўчыны (*А. Жук*).
5) Недзе недалёка ляноціцца Мінскае мора (*Р. Барадулін*).

**7.** Адзначце словазлучэнні з агульным граматычным значэннем дзеяння і яго прыметы:

1) крычаць моцна;
2) думаць па-новаму;
3) прачытаць у кнізе;
4) захацець шчыра;
5) прысвяціць сябру.

**8.** Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў дапасаванні:

1) абодва сябра;
2) тры гарады;
3) чатыры яблыка;
4) тры паверхі;
5) абедзве жанчыны.

### Тэкст да заданняў 9, 10

Жыццё не спыняецца. Пятра заўсёды [1)]***радасна здзіўляла*** гэтая неператможнасць жыцця. Радавала, як хутка [2)]***пасля бамбёжак*** [3)]***ажываў горад***. Здзіўляўся ў шпіталі, дзе людзі, што страцілі ногі, рукі, чапляліся за жыццё і марылі пра шчасце. Радуе непераможнасць жыцця і тут, на захопленай ворагам зямлі. Колькі [4)]***гора і смерцяў*** сеюць тут карнікі! Здаецца, што [5)]***ўсё накіравалі*** яны на знішчэнне, разбурэнне, на паслугу смерці. Але [6)]***не ўдаецца ім*** спыніць жыццё! (*Паводле І. Шамякіна*).

**9.** Вызначце тып маўлення. Адказ запішыце.

______________________________________________

**10.** Вызначце, якія з пранумараваных спалучэнняў слоў з'яўляюцца словазлучэннямі. Выпішыце іх нумары.

______________________________________________

# Двухсастаўныя сказы

## Варыянт 1

**1.** Адзначце неразвітыя двухсастаўныя сказы:

1) Зіма халодная.
2) Зімой дні кароткія.
3) Горад будуецца, становіцца прыгажэйшым.
4) Прыемная прахалода.
5) Ты заходзь, сястрыца, не забывайся.

**2.** Адзначце сказы, у якіх дзейнік выражаны сінтаксічна непадзельным словазлучэннем:

1) За прагалам віднеліся тры высачэзныя дубы (*І. Пташнікаў*).
2) Днём, пасля ўрокаў, дадому яе [настаўніцу] праводзіў звычайна хтосьці з вучняў (*А. Васілевіч*).
3) Між тым наўкола ляжала чыстая снегавая дарога... (*В. Быкаў*).
4) Пах хлеба напаўняў хату, расплываўся па двары, падбадзёрваў, абуджаў радасць (*Ю. Грыбаў*).
5) Усе жыхары былі сагнаны ў той канец вёскі, дзе стаяла старая вялікая адрына (*Я. Брыль*).

**3.** Адзначце сказы з састаўнымі іменнымі выказнікамі:

1) Сенажаць была куп'істая, занядбаная, парослая драсёнам ды шчаўем (*М. Зарэмба*).
2) Праз колькі хвілін Кастусь усё ж прыўзняўся на локцях і пачаў узірацца ў касагор ля дарогі (*М. Зарэмба*).
3) Антось мог без памылкі ўявіць сабе ўсё гэта падводнае царства (*А. Камароўскі*).
4) Дружок быў кемлівым вучнем, Кастусёвы каманды лавіў на ляту (*М. Зарэмба*).
5) Бусліха не вытрымала і ўзляцела, села на ўсохлай вяршаліне бліжняга дуба (*А. Камароўскі*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх выказнікі ўжыты ў правільнай форме:

1) Тры вучні пагадзіліся дапамагчы аднакласніку.
2) Некалькі чалавек адразу ж пераселі на іншы аўтобус.
3) Трое партызан спалі на падлозе.
4) Большасць пасадак не прыжыліся.
5) Сем дзён мінула так хутка, што мы не паспелі засумаваць па маме.

**5.** Адзначце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам патрэбна паставіць працяжнік:

1) Пяць плюс сем ___ дванаццаць.

2) Хлопец ужо з маленства адчуў, што жыццё ___ не вясёлае, бесклапотнае свята... (*І. Мележ*).

3) Лось ___ вялікі майстар прабірацца па балоце (*В. Вольскі*).

4) У яго ўяўленні гэтыя людзі ___ героі, на якіх можна пазіраць толькі з вялікай пашанаю (*Я. Колас*).

5) Да пэўнай ступені бусел ___ сімвал Беларусі (*У. Караткевіч*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прыдаткамі:

1) Чародкі маладых дзяўчат-***паляшучак*** і маладзіц, убраных, як макавыя кветкі ў агародзе, падштурхвалі адна адну... (*Я. Колас*).

2) Дзед ***Талаш*** любіць лес, балоты і сваю родную Прыпяць (*Я. Колас*).

3) З глыбокіх норак вылятаді ***ластаўкі***-беражанкі, палахліва цвыркалі, нізка кружыліся і ўздымаліся ўгару (*В. Адамчык*).

4) За выключэннем возера Рыца і азёр Швейцарыі, возера ***Свіцязь*** — самае прыгожае ў Еўропе (*Л. Мірачыцкі*).

5) Мэта газеты «***Мужыцкая праўда***» заключалася ў тым, каб расказаць народу сялянскую праўду (*Г. Кісялёў*).

**7.** Адзначце сказы з прамымі дапаўненнямі:

1) Люблю я Пушкіна за яго прыгожы чароўны верш (*Я. Купала*).

2) Пушкін не баяўся цароў і генералаў (*Я. Купала*).

3) Цвіценне чаромхі звычайна супадае з надыходам апошняй хвалі халадоў (*А. Курскоў*).

4) Насустрач самалёту бегла-слалася злёгку запарушанае снегам поле аэрадрома (*Т. Хадкевіч*).

5) Не заўсёды хапала хлеба да новага ўраджаю (*Б. Сачанка*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх акалічнасці выражаны спалучэннем назоўніка з прыназоўнікам:

1) Безліч разоў грукаталі калясніцы вайны (*У. Караткевіч*).

2) Памяць маёй зямлі там, дзе ёсць старадаўнія гарадзішчы, курганы, пад якімі спяць яе абаронцы... (*У. Караткевіч*).

3) У засушлівыя гады ў лагчыне выціскалася халодная вада (*З. Бяспалы*).

4) Праз перашыек да самага цэнтра лагчыны была пракапана канава (*З. Бяспалы*).

5) Павуціння плыло ў бок маладога асінніка, як бы абпаленага дзівосным агнём (*І. Шамякін*).

### Тэкст да заданняў 9, 10

Маці глядзела то на машыны, што чакалі сынавага дазволу ехаць, то на свайго сына. Цяпер быў відаць яго твар — упартыя, яшчэ юнацкія рысы, прыплюшчаныя ад сонца вочы, нахмураныя цёмныя бровы. Ён памужнеў і падрос за гэты час, што яны не бачыліся (*Паводле І. Мележа*).

**9.** Вызначце, пры дапамозе якіх сродкаў звязаны сказы тэксту:

1) сінонімы;
2) лексічны паўтор;
3) займеннікі;
4) злучнікі;
5) часціцы.

**10.** Выпішыце з тэксту два дапасаваныя азначэнні.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце развітыя двухсастаўныя сказы:

1) Цёплы вечар.
2) Сонца схавалася за хмары.
3) Павявае ветрык.
4) Дождж ідзе, не спыняецца.
5) Чорныя хмары закрылі неба.

**2.** Адзначце сказы, у якіх дзейнік выражаны сінтаксічна непадзельным словазлучэннем:

1) Затое зімою Косцік цалюткі дзень праседжваў за сталом (*С. Александровіч*).

2) Кожны з нас адкрывае Радзіму па-свойму (*С. Панасюк*).

3) Уладзімір Кавалёнак быў адным з лепшых вучняў (*С. Панасюк*).

4) Над полем разносіўся мерны рокат трактара (*У. Дзіско*).

5) Прыехалі мы з жонкай у Беларусь, у адну маленькую вёсачку, дзе ніколі ў жыцці не былі... (*У. Дубоўка*).

**3.** Адзначце сказы з састаўнымі дзеяслоўнымі выказнікамі:

1) Уся зямля, здавалася, была поўная квецені, пахаў (*І. Мележ*).

2) А Дружок працягваў праследаваць шпачыную чараду, якая як быццам дражнілася з ім (*М. Зарэмба*).

3) Ён не мог паверыць у гэта, не мог падумаць (*М. Зарэмба*).

4) Пасля такога здарэння Базыль стаў ціхім і яшчэ больш задуменным (*Я. Колас*).

5) Краса квецені жыла ўспамінам, шкадаваннем, што ўсё мінулася (*І. Мележ*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх выказнікі ўжыты ў няправільнай форме:

1) Антось і Юзік любілі ўспамінаць рыбацкія прыгоды.

2) Толькі двое чалавек падахвоціліся дапамагчы хлопцам.

3) Некалькі хлопцаў з суседніх палатак заглянулі на агеньчык.

4) Няшмат людзей пагадзіліся пераехаць на новае месца.

5) Хутка прамільгнулі пяць тыдняў.

**5.** Адзначце радкі, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам не ставіцца працяжнік:

1) Адна надзвычай мілая рыса ў натуры гэтага чалавека __ яго незвычайная любоў да прыроды, да ўсяго жывога і нежывога характава (*У. Краўчанка*).

2) Кожны можа згадаць такую сваю бабулю. Яны __ вечныя на гэтай зямлі... (*Х. Лялько*).

3) Броўкі __ як сярпочкі, а ніўка нязжатая стаіць (*Прыказка*).

4) Дубы __ былі выносныя, стройныя, бы точаныя, і такія тоўстыя, што тры чалавекі не маглі абняць камель (*Я. Колас*).

5) Ведама, зубр __ рэдкі прадстаўнік жывёльнага свету (*В. Вольскі*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх прыдаткі пішуцца праз дэфіс:

1) У той жа Белавежы пабачыў дуб_волат, якому больш за чатыры вякі (*Я. Пархута*).

2) За парогам манастыра засталася прыгажуня_Прадслава, а замест яе з'явілася асветніца і кніжніца Ефрасіння (*Газета «Слова»*).

3) З кагорты такіх тытанаў быў і вялікі палачанін, выдатны беларускі асветнік_гуманіст XVI стагоддзя, першадрукар Францыск Скарына (*В. Чамярыцкі*).

4) У снежнай фігуры дрэва раптам убачыш грыб_баравік, натапыраную птушку, працавітага бабра ці касалапае медзведзяня (*Л. Кацкевіч*).

5) Хіба ўвосень не зацвітае прыгажуня_яблынька, зведзеная ў зман здрадлівай ласкай бабінага лета? (*І. Навуменка*).

**7.** Адзначце сказы з ускоснымі дапаўненнямі:

1) Хто назапашвае кармы, хто спяшаецца цёплае жыллё ўладкаваць, хто проста жыруе (*Р. Ігнаценка*).
2) Сонца радаснае ўзышло над лесам, жаваранкі ў блакітнай вышыні спяваюць яму хорам над шырокімі палеткамі залатой збажыны (*І. Грамовіч*).
3) Сонца супакоіць цябе (*І. Грамовіч*).
4) У грыбах адчуваецца пах і густых ранішніх туманаў, і багатых начных рос, і цёплых летніх дажджоў... (*Л. Кацкевіч*).
5) Але Лаўрэн не будзе чакаць гэтага (*Э. Самуйлёнак*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх акалічнасці выражаны інфінітывам:

1) Цэлы тыдзень хадзілі лавіць рыбу Антось з Юзікам у тую нёманскую затоку, ля якой сустрэлі буслоў (*А. Камароўскі*).
2) Антось і Юзік любілі ўспамінаць рыбацкія прыгоды (*А. Камароўскі*).
3) Маці, узяўшы капаніцу, пайшла на агарод акопваць бульбу (*Б. Сачанка*).
4) Камендант высунуўся з-за сцяны і праз рупар пачаў патрабаваць здацца (*В. Хомчанка*).
5) Сашу ўгаворвалі не плысці, заставацца тут (*І. Шамякін*).

## Тэкст да заданняў 9, 10

Добры догляд, пастаянная ўвага зрабілі сваю справу — кенарчык хутка паправіўся. Калі Уладзімір Міхайлавіч выпускаў птаха з клеткі, той садзіўся на плячо гаспадара і спрабаваў датыкацца дзюбкай да шчакі. А аднойчы кенарчык заспяваў! Спевы птушкі так расчулілі гаспадара, што ён аж праслязіўся (*Паводле З. Бяспалага*).

**9.** Вызначце спосаб сувязі сказаў у тэксце:

1) паслядоўная;
2) паралельная.

**10.** Выпішыце з тэксту два недапасаваныя азначэнні.

# Аднасастаўныя сказы. Няпоўныя сказы

## Варыянт 1

**1.** Адзначце аднасастаўныя сказы:

1) Вёска Тугінавічы (*К. Цвірка*).
2) Пастаіш у зацішку і пойдзеш супакоены назад (*І. Грамовіч*).
3) І ўсё навокал ажыло, павесялела (*Р. Ігнаценка*).
4) Дні стаяць ціхія, сонечныя, поўныя мяккай задуменнасці і харастве (*Р. Ігнаценка*).
5) Прыйшла залатая восень! (*Р. Ігнаценка*).

**2.** Адзначце пэўна-асабовыя сказы:

1) Пагляджу ў бязмежны блакіт асенняга неба і раптам успомню былое (*Р. Ігнаценка*).
2) «Бабіна лета», — з замілаваннем кажуць у народзе аб гэтай пары́ восені (*Р. Ігнаценка*).
3) Уздыхну і міжволі задумаюся... (*І. Грамовіч*).
4) Не магу пражыць і дня без успаміну пра лес (*Б. Сачанка*).
5) У сяле збіраюцца, раяцца пра нешта (*І. Грамовіч*).

**3.** Адзначце няпэўна-асабовыя сказы:

1) Залатым лесам называлі гэтую мясціну (*З. Бяспалы*).
2) Пахне бензінам, нагрэтым каменем, жалезам і фарбай (*Т. Хадкевіч*).
3) Наш родны беларускі край! (*Я. Сіпакоў*).
4) Вечарамі ў Міканоравай хаце часта меркавалі, як будуць абжывацца (*І. Мележ*).
5) Помню нясмелую красавіцкую зелень рэдкай травы, першы плач кнігаўкі, першую кветку... (*В. Адамчык*).

**4.** Адзначце абагульнена-асабовыя сказы:

1) Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі (*Прыказка*).
2) Шчасця за грошы не купіш (*Прыказка*).
3) Не рабі ліхога і не бойся нікога (*Прыказка*).
4) Падымешся, бывала, на світанку, выбежыш за парог... (*Я. Пархута*).
5) Ваўка ногі кормяць (*Прыказка*).

**5.** Адзначце радкі, у якіх ёсць назыўныя сказы:

1) Жнівеньскія ночы цёмныя і працяглыя (*В. Вольскі*).
2) А з-пад каменя біў празрысты струменьчык (*І. Грамовіч*).
3) — Сапраўдны балет! От, можна сказаць, дзівакі гэтыя птушкі (*В. Вольскі*).
4) Наш родны беларускі край! Ён прыгожы і па-свойму адметны на поўначы і на поўдні, на ўсходзе і на захадзе (*Я. Сіпакоў*).
5) Усе мы зямляне (*Я. Сіпакоў*).

**6.** Адзначце спосабы выражэння выказніка ў безасабовым сказе:

1) інфінітыў;
2) безасабовы дзеяслоў;
3) дзеяслоў 2-й асобы абвеснага і загаднага ладу;
4) прыслоўе са значэннем стану;
5) дзеяслоў 3-й асобы множнага ліку.

**7.** Адзначце безасабовыя сказы:

1) Усё навокал пасвятлела, праяснілася (*В. Вольскі*).
2) Пахне сасной, зямлёй і мокрай ігліцай (*І. Пташнікаў*).
3) Ад фільтраў патыхала гарачынёй... (*А. Савіцкі*).
4) Свет адразу зрабіўся святлейшы (*І. Грамовіч*).
5) Не спалася мне ў той летні адвячорак (*Х. Лялько*).

**8.** Адзначце радкі, у якіх ёсць няпоўныя сказы:

1) Нізка на захадзе — рака. На поўдні — затока, дзе бялее наша «Кубань» (*Я. Брыль*).
2) На цёплай, некранута чыстай бяросце поўзаюць божыя кароўкі. Па бяросце і па моцных, усімі вятрамі абветраных лісточках (*Я. Брыль*).
3) Хадзіў і спыняўся, прагна дыхаў, доўга глядзеў (*Я. Брыль*).
4) Чайкі хвалююцца. Лятаюць, садзяцца на хвалях, уздымаюцца, зноў пікіруюць (*Я. Брыль*).
5) І вось я не магу заснуць (*Я. Брыль*).

## Тэкст да заданняў 9, 10

Кірыла Тураўскі — адзін з самых славутых пісьменнікаў старажытнаславянскай літаратуры. За красамоўства яго празвалі Златавустам.

Да нас дайшлі некаторыя творы Кірылы Тураўскага. Яны напісаны па ўзорах візантыйскай царкоўнай літаратуры. «Словы», «Малітвы» і «Прытчы» Кірылы Тураўскага — сапраўд-

ныя паэтычныя жамчужыны. Яны былі патрэбны людзям тысячу гадоў, як патрэбна нам і імя самога Кірылы Тураўскага. Мы павінны памятаць пра яго, памятаць, што з самай далёкай даўніны нашы продкі стварылі каштоўныя багацці, якія пакінулі нам у спадчыну (*У. Бутрамееў*).

**9.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

---

**10.** Знайдзіце аднасастаўны сказ, запішыце яго від і выпішыце граматычную аснову.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце аднасастаўныя сказы:

1) Дні стаялі пагодлівыя, сухія (*Б. Сачанка*).
2) Дыхалася вольна, на ўсе грудзі (*Б. Сачанка*).
3) Сонца супакоіць цябе (*І. Грамовіч*).
4) Як слаўна адчуваеш сябе красавіцкім вечарам, стоячы на развілцы палявых дарог і любуючыся з узгорка неабдымным прасторам! (*Т. Хадкевіч*).
5) Яго ні разу яшчэ не пакаралі (*З. Бядуля*).

**2.** Адзначце пэўна-асабовы сказ:

1) Ад сухой папараці патыхае сухім дрэвам (*І. Пташнікаў*).
2) Сказанага слова да губы не вернеш (*Прыказка*).
3) Незадоўга перад вечарам сабралася на дождж (*Т. Хадкевіч*).
4) Помню вечар, жоўтае святло месяца, шум вады за вёскаю і трэск алешніку (*В. Адамчык*).
5) У сяле збіраюцца, раяцца пра нешта (*І. Грамовіч*).

**3.** Адзначце няпэўна-асабовыя сказы:

1) Потым пабудавалі ў мястэчку лесапілку, заводзік, прамкамбінат... (*Б. Сачанка*).
2) Па рэчцы ўгадвалі і надвор'е... (*В. Адамчык*).
3) Хто пытае, той не блудзіць (*Прыказка*).
4) Люблю Пушкіна за яго гордасць, за захаванне чалавечай годнасці, нават у акружэнні прыдворнай камарыллі (*Я. Брыль*).
5) У жніво пахне свежай саломаю і даспелым коласам... (*Я. Сіпакоў*).

**4.** Адзначце абагульнена-асабовыя сказы:

1) Выйшлі з лесу, а за ім — лугавіна, за ёю — поле, а ўдалечыні сінее другі лес (*А. Бялевіч*).
2) Стаіш, бывала, над абрывам і не можаш вачэй адвесці ад воднай роўнядзі (*М. Ваданосаў*).
3) На гонары далёка не заедзеш (*І. Шамякін*).
4) Вакол было ціха і цёмна (*В. Быкаў*).
5) Цішэй едзеш — далей будзеш (*Прыказка*).

**5.** Адзначце радкі, у якіх ёсць назыўныя сказы:

1) Адвячорак у Трэптаў-парку. Духмяныя ліпы. Таполі нібы салдаты ў ганаровай варце. Веліч смутку і подзвігу (*Я. Брыль*).
2) Мяне адразу пацягнула з хаты: я надта люблю гэтую часіну (*І. Грамовіч*).
3) Спыніцеся, не ідзіце далей у лес і ўслухайцеся (*А. Кулакоўскі*).
4) Пахмурны ранак. Самотны парк (*Я. Брыль*).
5) Зялёны востраў у няспелым жытнім моры. Бярозы (*Я. Брыль*).

**6.** Адзначце спосабы выражэння выказніка ў безасабовым сказе:

1) прыслоўе са значэннем стану;
2) дзеепрыметнік залежнага стану;
3) дзеяслоў 1-й і 2-й асобы адзіночнага ці множнага ліку абвеснага ладу цяперашняга часу;
4) адмоўнае слова *няма* (*не было*, *не будзе*);
5) дзеяслоў 3-й асобы множнага ліку.

**7.** Адзначце радкі, у якіх ёсць безасабовыя сказы:

1) Задажджыла, як восенню (*А. Жук*).
2) Пабялела. Стала відаць, што лісце на дрэвах у густой расе (*А. Кудравец*).
3) З двара цягнула жывым вясновым марозікам (*А. Кудравец*).
4) Гэта было ў самым пачатку зімы (*А. Кудравец*).
5) Яшчэ доўга помніў я твар таго байца (*І. Навуменка*).

**8.** Адзначце няпоўныя сказы:

1) Каля станцыі вузкакалейкі — паляна, даволі вялікі лужок, далей лес (*Я. Брыль*).
2) І ён заспяваў, няўмела, баязліва, ціха (*Я. Сіпакоў*).
3) У гумне пахла маладым лесавым сенам, канюшынаю (*А. Жук*).
4) На поўдні — мора (*Я. Брыль*).
5) А ўсё ж яшчэ па-ранейшаму прыемна глядзець на плынь ды на зялёнае жыта (*Я. Брыль*).

## Тэкст да заданняў 9, 10

Многа славутых і таленавітых людзей дала свету беларуская зямля! І сярод іх мы павінны згадаць імя нашага слыннага земляка Напалеона Орды — кампазітара, мастака, музыканта, чыё жыццё і дзейнасць на карысць беларускай культуры і мастацтва застануцца прыкладам пачэснага служэння народу і Радзіме.

Напалеон Орда. У яго творчай спадчыне ўвасоблены мастацкі вобраз Беларусі, «сведчанні аб прыгажосці і цывілізацыі краю». У некралогу на смерць Напалеона Орды паэт Адам Плуг пісаў: «Гэта быў пісьменнік, мастак і музыкант, але перш за ўсё сумленны патрыёт, які вельмі любіў свой край» (*Паводле Л. Пракопчыка*).

**9.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

**10.** Выпішыце аднасастаўны сказ, вызначце яго від.

# Сказы з аднароднымі членамі

## Варыянт 1

**1.** Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:

1) адказваюць на адно і тое ж пытанне;
2) удакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў;
3) адносяцца да аднаго і таго ж слова;
4) выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю;
5) можна паставіць пытанне ад аднаго слова да другога.

**2.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі:

1) Белая заслона снегу закрывала ***будынкі*** і ***двары*** (*Я. Колас*).
2) Навокал усё ***гуло***, ***трэслася***, ***выла***, ***скуголіла***... (*Я. Колас*).
3) Ні ***канца*** ні ***краю*** не відаць пустыні (*Я. Брыль*).
4) А журавель ***махаў*** і ***махаў*** аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выгінастай шыяй, але дагнаць чародку не мог (*В. Быкаў*).
5) Навокал ***сцішана***, ***стоена*** радавалася цеплыні і сонцу поле (*Я. Сіпакоў*).

**3.** Адзначце сказы з двума радамі аднародных членаў:

1) З тае восені можна было і спяваць, і размаўляць, і вучыцца на роднай мове (*Я. Пархута*).
2) І неба, і зямля зліліся ў суцэльным віхры снежнага пылу і цемрадзі (*Я. Колас*).
3) У гэтым крыку былі і крыўда, і расчараванне, і надзея, і горкі папрок да нас, дарослых і разумных людзей (*Я. Маўр*).
4) Сустрэліся хваінка з ялінкаю, абняліся (*А. Кулакоўскі*).
5) Нічога не кажа бацька, маўчыць, упарта, сцята маўчыць... (*Б. Сачанка*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца аднароднымі:

1) Яна яшчэ доўга глядзіць на сумны пагорак, гразкую дарогу і бачыць над гэтай мясцінай той цёмны майскі адвячорак... (*В. Быкаў*).
2) Быў цёплы чэрвеньскі дзень (*М. Плотнікаў*).
3) Можа, маці нагадаўся яе басаногі хлопчык Віця, віхрасты, рухавы і настойлівы? (*М. Плотнікаў*).

4) Байцы паўзлі па снежным полі і раптам у вячэрняй цішыні пачулі слабы чалавечы голас (*У. Ліпскі*).

5) А ў душы ўжо шырыліся, грымелі тугой пяшчотныя, дарагія ўспаміны з таго далёкага, што стала ўжо мінулым (*В. Быкаў*).

**5.** Адзначце сказы, у якіх ёсць аднародныя выказнікі:

1) Данік не сцярпеў, наважыўся быў устаць і расказаць, як усё было (*А. Савіцкі*).

2) Зарава пажару калыхалася над ракою, над лесам, запальваючы крывавай чырванню рэдкія хмурынкі ў небе (*М. Лынькоў*).

3) Жыццё неяк памеркла адразу, стала шэрым, панурым (*М. Лынькоў*).

4) Нас вабілі прыгоды, небяспечныя, але цікавыя падарожжы ў незнаёмыя краіны, пошукі скарбаў, сутычкі з ворагамі, пагоні, подзвігі, высакародныя пачуцці, пазнанне свету, што быў далёка ад нас (*Г. Далідовіч*).

5) Навокал непранікальная заслона снегу, дзе ўсё мітусілася, рухалася, хадзіла ходырам, бы ў нейкім тлумным дзікім танцы (*Я. Колас*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць коску:

1) Сын жа кінуўся да дзвярэй, з усяе сілы націснуў на клямку рукамі, выскачыў на двор__ і ўжо там моцна заплакаў (*М. Стральцоў*).

2) Пах напаўняў хату__ расплываўся па двары__ падбадзёрваў__ абуджаў радасць (*Ю. Грыбаў*).

3) Сякера гупала нячаста__ рытмічна (*Ф. Янкоўскі*).

4) Праз гадзіну яны ўжо добра адышліся ад таго балота__ ды брылі па пахілым доўгім касагоры (*В. Быкаў*).

5) Ні Міця__ ні я тады нават не здагадваліся, што цікавае ёсць і паблізу нас (*Г. Далідовіч*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх патрэбна паставіць двукроп'е:

1) Побач з букетам ляжала шмат іншых кветак чырвоныя гваздзікі, ружы, белыя рамонкі (*А. Савіцкі*).

2) На сене валяліся вялікія і маленькія камякі, пер'е, пух усё, што засталося ад нядаўняга гнязда (*Я. Сіпакоў*).

3) Патап Хведаравіч радаваўся сынавай падмозе, вучыў Якуба, як лячыць сосны, дубы, бярозы, яліны (*У. Мяжэвіч*).

4) Падышоў гружаны цягнік жалезныя платформы з гарматамі, некалькі закрытых вагонаў, дзясятак цыстэрнаў (*М. Лынькоў*).

5) На гэтым невялічкім вадаёме вадзілася шмат рыбы серабрыстыя карасікі, уюны, іншая драбяза (*М. Аўсіевіч*).

**8.** Адзначце прыклады, у якіх схема правільна перадае сувязь аднародных членаў:

1) Даўно павыгаралі, павыліналі кветкі, паблякла нават неба, і ўсё гэта, здавалася, было зараз аднаго рыжага колеру (*Я. Сіпакоў*).

**[О, О, О].**

2) Тут жа была і рачулка, бойкая і жвавая (*Я. Колас*).

**[і О, О і О].**

3) Грыбы, ягады, арэхі, шчаўе на лугавінах — усё неслі дамоў (*А. Казлоў*).

**[О, О, О, О — ◎].**

4) Як загадкавы чараўнік, раскладвае ён колеры, рэзкія, свежыя, без паўтонаў (*А. Курскоў*).

**[О, О, О].**

5) Выйдзе гарнастай на паляванне звечара, абыдзе свой паляўнічы ўчастак, паловіць мышэй, а то і ў вёску забрыдзе, а пад раніцу вернецца ў сваё сховішча і будзе чакаць там новага вечара (*А. Курскоў*).

**[О, О, О, а то і О, а О, О].**

## Тэкст да заданняў 9, 10

Высачэзныя магутныя дубы кідаюцца ў вочы здалёк. Яны ўзвышаюцца над усімі і складаюць найбольшую славу зямлі, якая іх узгадавала. Але яны зусім не прыніжаюць высакароднай годнасці выносістых карабельных сосен, кашлатых вастраверхіх ялін, кучаравых клёнаў і цяністых ліп, мускулістых вязаў і светлалістых ясеняў. Добра чуюцца ў гэтай грамадзе і белакорыя бярозы, і трапяткія асіны, і лагодныя таполі, і сціплыя вольхі... А ў цэлым атрымліваецца незвычайная гармонія фарбаў і тонаў, дзівосная сімфонія гукаў і шумаў!.. (*Паводле Н. Гілевіча*).

**9.** Вызначце, які сродак сувязі ўжыты для сувязі першых трох сказаў у тэксце:

1) прыслоўі;
2) займеннікі;
3) сінонімы;
4) паўтор слоў;
5) часціцы.

**10.** Вызначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў тэксце. Адказ запішыце словам.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:

1) вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння;
2) з'яўляюцца раўнапраўнымі па сваім саставе спалучэннямі слоў;
3) адносяцца да аднаго і таго ж слова;
4) удакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў;
5) выконваюць розную сінтаксічную функцыю.

**2.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі:

1) Навокал ***пясок*** ды ***пясок*** (*Я. Брыль*).
2) Гэта мясціна ***чырвонагаловых*** падасінавікаў і ***белых высокіх*** чашчавікоў (*І. Грамовіч*).
3) Гэта, брат, не ***дажджы***, а ***золата*** (*М. Лынькоў*).
4) ***Уздыхалі***, ***плакалі*** жанчыны, ***углядаліся*** ў злавесныя водсветы начных пажараў (*М. Лынькоў*).
5) І думкі твае, сагрэтыя цяплом, узнімуцца і ***паплывуць***, ***паплывуць***... (*І. Грамовіч*).

**3.** Адзначце сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:

1) Усё часцей наведваліся немцы, шукалі зброю, партызан (*М. Лынькоў*).
2) Спыніцеся, не ідзіце далей у лес і ўслухайцеся (*А. Кулакоўскі*).
3) Ногі шасталі па няезджанай дарозе паўз маўклівы і цёмны бярэзнік, разграбаючы ігліцу і апалае лісце, якога тут багата пазбіраў вецер і прыбілі цяжкія асеннія росы (*І. Грамовіч*).
4) Мінуць, прашапочуць лісцем акацый і вербаў гады ў невялікай прыдняпроўскай вёсачцы (*Я. Пархута*).
5) Разлажылі вялікае цяпло, наладзілі з яловых лапак ды сена добрую пасцель для Гені, ухуталі яе цяплей (*М. Лынькоў*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца неаднароднымі:

1) Была золкая зімовая раніца (*Я. Герцовіч*).
2) Трэба было пераадолець чыстае, заснежанае поле перад станцыяй Гаршчэчнае (*У. Ліпскі*).

3) Гэта адбылося ў самым канцы вайны ў аўстрыйскіх Альпах, куды ўжо ўладарна прыйшла апошняя ваенная вясна... (*В. Быкаў*).

4) Бушуе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку (*В. Быкаў*).

5) Сняжок дробненькі, гусценькі сыпаў і сыпаў зверху (*Я. Колас*).

**5.** Адзначце сказы, у якіх ёсць аднародныя выказнікі:

1) Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень (*Я. Колас*).

2) Людзі даўно забыліся пра песні, пра вясёлае слова (*М. Лынькоў*).

3) Лішак гарачыні паглынаюць і рака, і зараснікі аеру, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк, і бярозы, і хвоі, і ўсялякая зеляніна (*Я. Маўр*).

4) Зрабіўшы з дзясятак мудрагелістых паваротаў і перасекшы некалькі невялічкіх палянак, узгоркаў і пералескаў, мы неяк раптоўна выйшлі да палетка і спыніліся каля збажыны (*Я. Пархута*).

5) Сонца адарвалася раптам ад балота, на хвіліну павісла над травою, над купінамі і пачало ўзнімацца вышэй, над лазняком і бярэзнікам (*В. Вольскі*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць коску:

1) Яна не разумела ўсяго, але верыла__ і не адгаворвала, не ўпрошвала яго (*В. Быкаў*).

2) Можа, яна суцяшала сябе тым, што яе сын Віця__ хоць і загінуў, але жыве на свеце інакшым жыццём — яго памятаюць другія (*М. Плотнікаў*).

3) На круглым__ у маршчынах яе твары былі сум і гора (*М. Плотнікаў*).

4) Наляцелі шэрай хмарай ненавісныя__ бязлітасныя__ чужынцы (*М. Лынькоў*).

5) На лісціку трыпутніку сядзіць матылёк, дыхае крыльцамі__ залацістымі, рознакаляровымі (*І. Грамовіч*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх патрэбна паставіць працяжнік:

1) Белавежская пушча і Браслаўскія азёры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач, Бярэзінскі запаведнік і маленькая рэчка Проня ўсё гэта наш родны край, наша спадчына (*Я. Сіпакоў*).

2) І колькі яшчэ было розных кветак сініх, ліловых, ярка-чырвоных! (*М. Лынькоў*).

3) На гэты час і машыны, і спрэчкі, і штодзённая мітусня ўсе асталіся недзе далёка-далёка (*Я. Сіпакоў*).

4) Сюды, да крынічкі, прыходзіць і прылятае ўсё лясное насельніцтва ласі і ваўкі, лісы і зайцы, дзікі і алені (*Д. Слаўковіч*).

5) Якуба Коласа можна было бачыць усюды на вуліцах і плошчах сталіцы, каля зямлянак у далёкіх вёсках (*П. Броўка*).

**8.** Адзначце прыклады, у якіх схема правільна перадае сувязь аднародных членаў сказа:

1) Яшчэ чыталі мы адзін аднаму свае вершы, правілі іх або нават і разам складалі вершаваныя творы для нашай насценнай газеты (*Г. Далідовіч*).

**[О, О або О].**

2) Нямала пра гэта могуць расказаць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, звычаі, абрады, а таксама апісанні родных мясцін пісьменнікамі мінулых стагоддзяў (*Б. Сачанка*).

**[О, О, О].**

3) На вуліцы, у дварах, каля будынкаў, уздоўж платоў — усюды ляжалі горы снегу з самымі вычварнымі паветкамі і карнізамі (*Я. Колас*).

**[О, О, О, О].**

4) Піліп Андрэевіч завярнуў лодку ў затоку, паціху заехаў у траву, рукамі злавіў качанятка, потым адвёз яго ў самы канец затокі, дзе чуўся крык старое качкі, і выпусціў на чыстую ваду (*У. Краўчанка*).

**[О, О, О, О, О].**

5) Кожную раніцу, з першымі промнямі сонца, ідуць на працу ў лес супрацоўнікі запаведніка: егеры, фенолагі, заолагі, батанікі, леснікі (*В. Вольскі*).

**[◎: О, О, О, О, О].**

### Тэкст да заданняў 9, 10

Народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ нідзе і ніколі не забываў сваё роднае Палессе, аблогі яго балот і пушчаў, сакавітую зеляніну і разнатраўе шырокіх прыпяцкіх і прыдняпроўскіх лугоў, багацце рачулак і азярын, раздолле ўрадлівых палёў і духмяных садоў. Самымі дарагімі і незабыўнымі былі яго ўспаміны пра сваю радню, самабытных, непасрэдных і шчырых землякоў-палешукоў, непаўторныя Глінішчы, Юравічы, Тунеўшчыну, Тур'ю (*В. Шур*).

**9.** Вызначце, якія сродак сувязі сказаў ужыты ў тэксце:

1) прыслоўе;
2) займеннік;
3) сінонімы;
4) паўтор слоў;
5) часціца.

**10.** Вызначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў тэксце. Адказ запішыце словам.

___

# Сказы са зваротkamі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі

## Варыянт 1

**1.** Адзначце радкі, у якіх ёсць звароткі:

1) — Пакладзём кветкі, сынок, ім, героям нашым, — сказаў бацька (*А. Савіцкі*).

2) І раптам, як гэта бывае ў сне, і ты, і піраміда прапалі... (*Я. Брыль*).

3) Дзе ён, яе Васілёк, чаму не вярнуўся?.. (*Я. Брыль*).

4) А сыночак мой, а сіраціначка мая, ніхто цябе не пашкадуе, ніхто цябе не абароніць (*М. Стральцоў*).

5) — Я — Пахом Сяргеевіч Лебедзеў. Гэта — мая жонка, Марыя Данілаўна. А гэта — наш сын, Сярожа (*В. Праскураў*).

**2.** Адзначце радкі, у якіх ёсць развітыя звароткі:

1) Старэнькая мая! Даруй мне за ўсе крыўды, за грубасць... (*Я. Брыль*).

2) — Брава, дзед! — пахвалілі яго вайскоўцы (*Я. Колас*).

3) — Памажы мне, Наталка, сабраць на стол (*В. Праскураў*).

4) — Птушанятка маленькае, як цябе там, — Галачка? — трошачкі больш прытуліся да таткі (*Я. Скрыган*).

5) Цішэй вы, хлопцы! — строга супакойвае бацька (*В. Карамазаў*).

**3.** Адзначце сказы, у якіх звароткі выдзелены правільна:

1) — Ох таварыш камандзір, — уздыхнуў дзед Талаш, — новага шмат, ды не цешыць яно! (*Я. Колас*).

2) — Няўжо, ты, дзед, такі дужы? — не паверыў Букрэй (*Я. Колас*).

3) — Да каго ж мне звярнуцца, як не да вас, таварышы чырвонаармейцы? (*Я. Колас*).

4) — Ну што, герой, прыйшоў? — дачытаўшы старонку, папытаўся Цішка Гартны (*Я. Скрыган*).

5) Багата, родная ты, мова... (*П. Броўка*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы, словазлучэнні ці сказы:

1) Відаць, птах адчуў ласку людзей (*Я. Пархута*).

2) І на гасцінцы, і ў мястэчку, на ўсім — так добра знаёмым і якім жа кароткім цяпер — шляху ад роднай хаты добрыя людзі бачылі яе пакутніцкі шлях (*Я. Брыль*).

3) На жаль, у асобных людзей яшчэ абыякавыя адносіны да прыроды, спажывецкія (*Я. Пархута*).

4) І нават калі ўжо ведаў, што гэта няпраўда, усё роўна кожнае прозвішча выклікала свой вобраз (*Я. Скрыган*).

5) На галаве, ссунутая на патыліцу, неяк не па часе (быў толькі пачатак верасня) па-заліхвацку дзіўна сядзела аблезлая шапка-аблавушка (*В. Праскураў*).

**5.** Адзначце радкі, у якіх значэнне пабочных слоў вызначана правільна:

1) Ішлі мы з табой, здаецца, пясчанай пустыняй (*Я. Брыль*) — *меркаванне, меншая ступень упэўненасці.*

2) Рагнеда чакала лета, калі да яе, па звычаях таго часу, павінен быў прыехаць жаніх (*К. Тарасаў*) — *заўвага пра спосаб афармлення думкі.*

3) Як гаворыць легенда, Рагвалод паслаў свайго брата Тура на поўдзень, і той заснаваў на рацэ Прыпяць горад-крэпасць Тураў... (*У. Бутрамееў*) — *крыніца паведамлення.*

4) Мабыць, перш чым уводзіць новае слова, трэба... прыслухацца да жывой гаворкі... (*А. Каўрус*) — *паслядоўнасць выкладання думак.*

5) На шчасце, я ад маці не чуў нічога падобнага (*В. Жуковіч*) — *розныя пачуцці* (*задавальненне*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх пабочныя словы (словазлучэнні) аддзяляюцца ад злучніка коскамі:

1) А__ можа, гэта таму, што глыбока задумаўся (*І. Шамякін*).

2) Далёкімі, а__ галоўнае, амаль недасягальнымі здаваліся мары пра будучыню (*С. Александровіч*).

3) Карціна называлася «Першы мірны дзень», але__ на думку многіх, нічога не мела агульнага з гэтай тэмай (*Я. Скрыган*).

4) Маці ніколі не скардзілася, што гэтак далёка Віця, што Маня, хоць__ здавалася б, не так і далёка, а ўсё адно прыязджае рэдка (*В. Жуковіч*).

5) За дзясятак кіламетраў ад вёскі быў аэрадром, і__ вядома ж, жыхары прывыклі, што над ім кожны дзень кружацца самалёты (*Я. Маўр*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выступаюць у ролі пабочных слоў і выдзяляюцца коскамі:

1) Зіна ***аказваецца*** гэта бачыла, бо ішла ў школу следам за Данікам (*А. Савіцкі*).

2) ***Здавалася*** ёй, што гэта не бронзавы салдат стаіць на пастаменце, а яе сын Віктар (*М. Плотнікаў*).

3) У хлопчыка на галаве была новая шапка, якую ён надзеў ***відаць*** першы раз (*Я. Брыль*).

4) Пахі гэтыя поўнілі сад, вуліцу, уся зямля ***здавалася*** была поўная квецені, пахаў (*І. Мележ*).

5) Здалёк ***відаць*** невялічкая, але вельмі акуратненькая хатка, абшаляваная дошкамі і пафарбаваная ў жоўты колер (*Я. Васілёнак*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставіцца коска:

1) А Верыну вёску__ па яе словах__ я ўяўляў зусім іншаю (*Я. Сіпакоў*).

2) Будыніна, якую Канстанцін Сцяпанавіч жартаўліва назваў палацам і да якой ён з Валодзем падышоў__ нарэшце, была звычайная хатка пуцявога абходчыка (*Я. Васілёнак*).

3) Мне падумалася: якая яна__ напэўна__ клапатлівая і як добра разумее чужую радасць (*І. Мележ*).

4) Цяпер__ здаецца, што гэта не ўспамінаецца, а сніцца... (*А. Жук*).

5) Вобраз Беларусі__ безумоўна__ змяняўся ў залежнасці ад пары года, надвор’я, настрою (*У. Калеснік*).

### Тэкст да заданняў 9, 10

Лес выхаваў характар беларуса. Наш чалавек і лес — родныя, і таму беларус любіць яго.

Любіць паўночныя сасняκі з імхом. Любіць змрочныя яловыя лясы з цэлымі барадамі сівога моху на ствалах. Безумоўна, любіць сонечны россып папараці і зараснікі ляшчыны. І вядома ж, любіць шыракалістыя лясы поўдня... Нават драбналессе з бялюткімі бярозамі і асінамі, нават змрочныя і балотныя чорна-альховыя лясы дарагія яму. Нарэшце, лес корміць, лес грэе і дровамі, і сценамі хат, і проста так. Лес бароніць у выпадку небяспекі, нашэсця, вайны.

Менавіта таму апошнім часам столькі ўвагі надаецца захаванню, абароне і развядзенню лясоў (*Паводле У. Караткевіча*).

**9.** Вызначце тып тэксту. Адказ запішыце.

______________________________

**10.** Выпішыце пабочныя словы з тэксту.

______________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце сказы, у якіх ёсць звароткі:

1) — Гэта мой стары прыяцель, дзед Талаш, у яго я жыў на кватэры, — сказаў Шалёхін да вайскоўцаў (*Я. Колас*).

2) — Што вы, што вы, людцы добрыя, — разгублена прамовіла Вольга Сямёнаўна і пайшла насустрач гасцям (*В. Праскураў*).

3) — Гэта на шчасце, людзі добрыя! — сказаў ён урачыста, як з трыбуны (*В. Праскураў*).

4) Дзе яны, Уладзік і Сцяпан?.. (*Я. Брыль*).

5) Якая слаўная ты, вечна маладая і вечна пявучая раніца! (*Я. Скрыган*).

**2.** Адзначце радкі, у якіх ёсць неразвітыя звароткі:

1) — Праходзьце, калі ласка. Пачувайце сябе, людцы добрыя, як дома. Праходзьце ў хату... (*В. Праскураў*).

2) Часам кажа Кастусь бацьку: «Папрасі, татачка, кніжак у пані Аксені...» (*С. Александровіч*).

3) — Дык вось, дарагая Вольга Сямёнаўна, — нягучна, але вельмі выразна сказаў Сярожаў бацька... (*В. Праскураў*).

4) — Нясу, нясу, Лідачка! — азвалася з кухні маці (*А. Чарнышэвіч*).

5) — Мамачка, — кінулася да яе Наталка, — вам няможна хвалявацца. Не плачце, мамачка... (*В. Праскураў*).

**3.** Адзначце радкі, у якіх звароткі выдзелены правільна:

1) — А, друг стары! Якая бура занесла вас сюды? (*Я. Колас*).

2) — Ну, што герой, прыйшоў? — дачытаўшы старонку, папытаўся Цішка Гартны (*Я. Скрыган*).

3) — Ох блазнота! Ты ўглядаешся на балота, цябе цягне агонь? (*Я. Колас*).

4) — Ну і прывязлівы, ты, сынок (*В. Карамазаў*).

5) — Што ты, Васіль! — адгукнулася маці. — Наша Лідачка вунь якое мілае дзіця... (*А. Чарнышэвіч*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх ёсць устаўныя канструкцыі:

1) І калі прыслалі з інстытута выклік на ўступныя экзамены, я заўважыў фантастычную, як тады здалося мне, рэч: чалавек можа спаць столькі, колькі загадае сабе (*В. Жуковіч*).

2) Дастаткова толькі прайсціся па берагах, каб адразу — ці ад спатканага вясковага рыбалова, ці ад пастушка-падлетка — даведацца, што Балачанка — рэчка незвычайная (*А. Карлюкевіч*).

3) Салавей (так цяпер усе называлі Сымона) павінен быў пану спяваць салаўём, калі таму ўздумаецца (*З. Бядуля*).

4) Убачыўшы вось такія тоўстыя алешыны, гонкія, прыгожыя, зайздросціў жыцькаўцам... (*Я. Сіпакоў*).

5) На ўзлесках (лес ушчыльную падступаў да гарадка) з-пад счарнелага за зіму лісця ўжо прабіваліся дзівоснай прыгажосці званочкі сон-травы (*В. Праскураў*).

**5.** Адзначце радкі, у якіх значэнне пабочных слоў вызначана няправільна:

1) Уласна кажучы, не ўвесь манумент, а толькі фрагмент разбуранай сцяны (*І. Шамякін*) — *заўвага пра спосаб афармлення думкі.*

2) Пры дапамозе прафесара Янка Купала паступіў вучыцца на агульнаадукацыйныя курсы Чарняева, якія, як пісаў паэт, сістэматызавалі яго хаатычныя веды (*Л. Давідоўская*) — *заўвага пра спосаб афармлення думкі.*

3) Вядома, нялёгка давалася яму гэтая слава, як і многім з яго сяброў (*І. Шамякін*) — *большая ступень упэўненасці.*

4) Нашы ластаўкі, відаць, запазніліся звіць сваё гняздо, і таму ластавяняты вывеліся ў іх запознена (*Я. Сіпакоў*) — *меркаванне.*

5) Гэты зубр быў, здаецца, немалады (*І. Шамякін*) — *паслядоўнасць выкладання думак.*

**6.** Адзначце сказы, у якіх пабочныя словы (словазлучэнні) аддзяляюцца ад злучніка коскамі:

1) Работа здалася непатрэбнай і нуднай, ніякага творчага ўзбуджэння не давала, а___ наадварот, здрабняла думкі (*І. Шамякін*).

2) Ад нядаўняга гнязда, а___ можа, і ад саміх ластавак, якія нядаўна вылецелі з гнязда, на сене не засталося ні следу (*Я. Сіпакоў*).

3) Магутныя дубы, і___ праўда, маюць права на асаблівую ўвагу (*Н. Гілевіч*).

4) Лятуць яны, і___ здаецца, самі бягуць на спатканне прыгожыя ўзгоркі, зялёныя лагчынкі (*Я. Колас*).

5) Вольга прыгадала, што___ здаецца, у восьмым класе настаўнік літаратуры нешта расказваў ім пра нейкіх сімвалістаў (*І. Шамякін*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выступаюць у ролі членаў сказа ці сродку сувязі ў сказе і не патрабуюць выдзялення коскамі:

1) ***Відаць*** сілы не хапіла ў птушкі на далёкі палёт або хтосьці параніў (*Я. Пархута*).

2) Заўтра ***можа*** здарыцца так, што перачытае ён свой верш і лісток паляціць у печ (*С. Александровіч*).

3) Люстру ***аднак*** уключылі на ўсе пяць ражкоў, і ў кабінеце стала сляпуча-ярка (*А. Кудравец*).

4) Іван Ігнатавіч таксама ўсміхнуўся, ***аднак*** адразу, як толькі зайшоў, усе заўважылі, што ён нечым нібыта заклапочаны (*А. Кудравец*).

5) ***Зразумела*** Ефрасіння была не простаю манашкаю (*У. Бутрамееў*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў коска не ставіцца:

1) Даволі доўгі час мне__ думалася, што Цішка Гартны і Змітрок Жылуновіч — два чалавекі (*Я. Скрыган*).

2) Здаецца__ ён [першы чалавек] толькі вось цяпер убачыў прыгажосць свету і спрабуе разабрацца ва ўсім... (*Я. Сіпакоў*).

3) Каб праектаваць такі помнік__ выходзіць__ трэба ўявіць сабе, як могуць выглядаць руіны таго, што ты збудаваў за дваццаць гадоў (*І. Шамякін*).

4) Але мне__ здаецца, што ўся прырода на гэты час змоўкла (*Я. Сіпакоў*).

5) Нарэшце__ ў вузкай прарэзанай шчыліне паказалася чыёсьці вока (*В. Іпатава*).

## Тэкст да заданняў 9, 10

Завіруха пачыналася яшчэ звечара.

Ужо на змярканні стаў пашумліваць вецер. Пасыпаў дробненькі, гусценькі сняжок. Бялявыя зімовыя хмары нізка навіслі над зямлёю. Вецер крапчэў. Здавалася, і неба, і зямля зліліся ў суцэльныя віхры снежнага пылу і цемрадзі. На ўсе галасы гула за вокнамі бязладная музыка. Бура налятала парывамі, як дзікі звер, які вырваўся на волю з дзікае клеткі.

Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень. Думалася, не будзе канца яе лютай сіле, яе злоснаму завыванню.

Нарэшце, пад вечар наступнага дня завея аціхла. І толькі цяпер перад вачыма раскрываўся малюнак таго, што натварыла завіруха (*Паводле Я. Коласа*).

**9.** Вызначце тып тэксту. Адказ запішыце.

---

**10.** Выпішыце пабочныя словы з тэксту.

---

# Сказы з адасобленымі членамі

## Варыянт 1

**1.** Адзначце сказы з адасобленымі дапасаванымі азначэннямі:

1) Толькі недзе далёка на ўсходзе абазначылася светласць неба, але ноч, кароткая, летняя, ужо заканчвалася (*А. Жук*).

2) Калі пад'ехалі людзі, то са здзіўленнем убачылі, што Мікітка спакойны, вясёлы, нібы з ім нічога асаблівага не здарылася (*Я. Маўр*).

3) Лапінкамі чырванеў чабор, угрэты і духмяны на сонцы (*М. Лынькоў*).

4) Потым крыніца цякла новаю вузкаватаю канаваю, з роўнымі і стройнымі алешынамі, з вадой, якая пахла жалезнаю рудою (*А. Жук*).

5) Збоку ціха паплыў нізкі бераг, з балотным хмызняком і шырокімі разлівамі вады (*І. Мележ*).

**2.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя азначэнні адасабляюцца:

1) Снег цямнеў, і ***нудны***, ***беспрасветны*** церусіў дождж (*І. Мележ*).

2) Нават ***зацярушаныя снегам*** сосны здаюцца нейкімі іншымі — маленькімі, прысадзістымі (*С. Александровіч*).

3) На другі дзень, калі бацька і маці сядзелі на канапе, да іх падбег Толя ***вясёлы***, ***шчаслівы*** (*Я. Маўр*).

4) Не ведаю, чым кінуўся мне ў вочы томік ***у цвёрдым пярэстым пераплёце*** (*Я. Скрыган*).

5) Нейкі час яны не ведалі, што рабіць, і ***ашаломленыя*** стаялі на мяжы (*В. Быкаў*).

**3.** Адзначце сказы з адасобленымі дапаўненнямі (знакі прыпынку не пастаўлены):

1) На галінках замест лісця віселі кропелькі вады (*І. Грамовіч*).

2) У хаце было асабліва светла (*І. Грамовіч*).

3) Пазней нічога ўжо не было акрамя ўспышак усё таго ж агню (*І. Шамякін*).

4) Першым пасяленцам асабліва моладзі старыя расказвалі пра безліч гусей і качак (*М. Улашчык*).

5) Сёння змоўклі нават сырыя вятры доўгай восені, якія штодня надакучліва шумелі ў галлі бярозы і секлі мне ў твар кроплямі дажджу (*І. Грамовіч*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Бярозка няясна пачувала волю, прастор, сонца__ і, стоячы тут, сярод гэтых дрэў, ні з кім не гаварыла пра свае думкі (*Я. Колас*).

2) Яны [птушкі] то__ гойдаючыся__ пырхаюць з дрэва на дрэва, то вылятаюць у поле (*Я. Скрыган*).

3) Лідачка пакаштавала, скрывілася__ і, адсунуўшы ўбок талерку, пачала разглядаць малюнкі ў новым часопісе для жанчын (*А. Чарнышэвіч*).

4) Нарэшце ў дзверы звоняць__ і, паважна ступаючы хворымі нагамі, маці ідзе адчыняць (*У. Арлоў*).

5) Ужо злазячы долу, аступілася__ і, збаяўшыся, што можа разбіць яйкі, упала (*М. Стральцоў*).

**5.** Адзначце радкі, у якіх выдзеленыя акалічнасці адасабляюцца:

1) Лявон плыў ***не спяшаючыся***, але ўпэўнена (*А. Чарнышэвіч*).

2) Кожны раз ***прачынаючыся*** знаходзіў вачыма стрэлкі гадзінніка на запаветных рысках (*В. Жуковіч*).

3) Я ***не асабліва ўслухоўваючыся ў іх спевы*** і то налічыў больш за дзясятак розных спевакоў (*Я. Сіпакоў*).

4) Я не ведаю, калі ты адпачываеш. Ты нават ясі ***стоячы*** (*І. Шамякін*).

5) Міколкавым сябрам надакучыла стаяць ***склаўшы рукі*** (*А. Чарнышэвіч*).

**6.** Адзначце сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі:

1) Там, у Кіеве, святкаваў Уладзімір свой шлюб з Рагнедаю (*К. Тарасаў*).

2) Мужчыны, ведаючы, што бяроза можа ўпасці, загадзя, вясною, уцягнулі барану на высокую маладую ліпу (*А. Жук*).

3) Яўген Галубовіч у гасцёўні свайго дома ў Кліўлендзе часцяком раскладваў на стале карту роднай Гомельшчыны і ўяўляў, што едзе ў цягніку (*Л. Маркаў*).

4) Першы зборнік Янкі Купалы «Жалейка» ўбачыў свет у знакамітай суполцы «Загляне сонца і ў наша аконца» ў лютым 1908 года ў Пецярбургу (*Л. Давідоўская*).

5) Жаваранак з песняю падымаўся на ўзлеску ў блакіт неба (*В. Карамазаў*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх ёсць параўнанні:

1) Выцякаў ручаёк з крыніц кіламетры за два адсюль, з-пад двух вялікіх, як горы, узгоркаў (*А. Жук*).

2) Рэдкія вываратні нагадваюць дагістарычных жывёлін (*І. Шамякін*).

3) Супакойвала адно: вёсачка была як рукой падаць (*Я. Пархута*).

4) Раптам недзе за плячыма жоўтым полымем здрыганулася неба (*Я. Пархута*).

5) Сена на хаце было накладзена як не да самага вільчыка (*Я. Сіпакоў*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх параўнальны зварот выконвае ролю выказніка:

1) — Глядзі, глядзі ў мяне, — сказала рэчка, — бо твая душа чыстая і празрыстая, як мая вада! (*З. Бядуля*).

2) Як завадныя стракаталі конікі (*Я. Пархута*).

3) Грыбы ж былі маладыя, крэпкія, важкія, шапкі зверху чорныя, а спаднізу белыя, бы кужаль (*Я. Колас*).

4) Варта было саступіць на некалькі крокаў з той пазіцыі, адкуль рысаваўся замак, каб ён распаўся, як дым (*Я. Колас*).

5) Хлопцы, як мурашкі, абляпілі човен і з натужным крэктам пачалі спіхваць яго ў ваду (*А. Чарнышэвіч*).

### Тэкст да заданняў 9, 10

(1) Палкоўнік у адстаўцы Андрэй Сяргеевіч Кавалёў сышоў з дарогі і прысеў на бярозу, паваленую ветрам. (2) Бяроза была старая, з дуплом, вяршыня свежа бялела бяростай, а камель быў чорны. (3) Абапал дарогі раслі такія ж бярозы, старыя, роўныя па росце і таўшчыні з паваленай. (4) Стаяў дзень позняй восені ціхі сонечны крыштальна-празрысты з высокім небам чыстым паветрам. (5) Апалае лісце бяроз бязважка ляжала на густой шчотцы азіміны, усцяж усёй дарогі (*Паводле В. Хомчанкі*).

**9.** Выпішыце нумар сказа, у якім ужыты адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні.

______________________________________________

**10.** Запішыце 4-ы сказ, паставіўшы неабходныя знакі прыпынку.

______________________________________________

______________________________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце сказы з адасобленымі недапасаванымі азначэннямі:

1) Над вадою слаўся туманок, рэдкі, празрысты... (*А. Жук*).

2) З люстэрка на Ліду зірнуў прыгожы круглы тварык з ямачкамі на шчоках, з пагардлівай усмешкай на вуснах (*А. Чарнышэвіч*).

3) За сталом, заваленым кнігамі, добра працавалася (*В. Жуковіч*).

4) Ён шчасліва ўсміхнуўся майму адказу і паспешліва затупаў па вуліцы, у бітых валёнках, у ватных штанах і шапцы з ужо парэпаным чорным мехам (*А. Жук*).

5) У блакітнай сукенцы, з чырвонай стужкай у кучаравых валасах, яна нагадвала прыгожую ляльку (*А. Чарнышэвіч*).

**2.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя прыдаткі адасабляюцца:

1) І ім ***дзецям*** не трэба было далёка хадзіць па ліст, якім высцілалі печы, калі пяклі хлеб (*А. Жук*).

2) ***Партызан*** Сасноўскі праяўляў асаблівы клопат і цікавасць да праектавання помніка (*І. Шамякін*).

3) Ды і ў расійскім асяроддзі нашага земляка зразумелі і падтрымалі ***як настойлівага шукальніка ўласна беларускага сэнсу ў кнізе гісторыі*** (*А. Каўка*).

4) І сведкай усяму гэтаму была толькі яна ***дзяўчынка*** і нібыта ўсё гэта адбылося дзеля яе (*А. Жук*).

5) Ганна ***або Андрэіха*** як яе звалі суседзі па імені нябожчыка мужа, неахвотна і рэдка пераступала гэты звыклы абсяг (*І. Мележ*).

**3.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставіцца коска:

1) Нішто__ нават завіруха__ не спыніла намеру Васіля (*Я. Колас*).

2) У засуху ж__ акрамя травы__ разараныя лужкі пачыналі зарастаць ваўчкамі і драсёнам (*А. Жук*).

3) Асабліва__ высокімі выглядалі яліны, хвоі, бярозы (*В. Жуковіч*).

4) Зрэдку пракідаліся і хвойкі, трапляліся__ нават__ кусты ядлоўцу (*Я. Колас*).

5) Акрамя гэтых своеасаблівых якасцей__ ён вызначаўся багаццем светаадчування, прыгожымі пачуццямі, пявучым голасам (*М. Хведаровіч*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх перад злучнікам (на месцы пропуску) трэба паставіць коску:

1) Прыняўшы кнігі ад вучняў__ і пусціўшы іх на летні адпачынак, Лабановіч выйшаў на двор і абышоў пасаджаныя маладыя дрэвы (*Я. Колас*).

2) Але аднойчы на работу прыбегла Аня__ і, адчыніўшы дзверы ў кантору, дала знак, каб я выйшаў (*Я. Скрыган*).

3) Васіль збіраўся яшчэ раз паспрабаваць шчасця__ ды, нічога не злавіўшы, хлопцы вярнуліся назад (*А. Якімовіч*).

4) У той бок вёў свежы след__ і, не завітаўшы ў хату, Андрэй накіраваўся па ім (*В. Карамазаў*).

5) Аднойчы гарачым летнім днём малы Міколка ўзяў Грышкаву вудачку__ і, сабраўшы дзясяткі два сваіх сяброў, аб'явіў ім, што павядзе іх лавіць рыбу (*А. Чарнышэвіч*).

**5.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя акалічнасці не адасабляюцца:

1) ***Нягледзячы на ўсе неспрыяльныя ўмовы*** жывуць у душы вясковай жанчыны сотні і тысячы песень... (*Н. Гілевіч*).

2) Апавядае казку бабка ***не спяшаючыся***, мяняе голас, а нітка прадзецца і прадзецца (*С. Александровіч*).

3) Ляжа ён на высокую духмяную траву, падложыць рукі пад галаву і ***не адрываючыся*** глядзіць у неба (*З. Бандарына*).

4) Палюбаваўшыся баравікамі, Лабановіч ***не спяшаючыся*** прыступіў да збору (*Я. Колас*).

5) Перабраўшыся гады тры таму назад з вёскі, яна [маці] па-ранейшаму не можа сядзець ***склаўшы рукі*** і даглядае суседскага хлопчыка (*У. Арлоў*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх удакладняльныя члены адасоблены правільна:

1) Справа, за прыбярэжнай касой, віднелася невысокая града з дрэвамі і вёскай наводдаль (*І. Мележ*).

2) Рэканструявалі вакзал, зрабілі тунэль, збудавалі новыя дамы там, за пуцямі, і тут, каля прывакзальнай плошчы (*І. Шамякін*).

3) Тут, пасля вяртання з мінскага астрога, у зацішшы родных мясцін знайшоў прытулак Якуб Колас (*С. Александровіч*).

4) Тут, у алешніку, ён і заснуў, не чуў, як яго знайшла і перанесла ў хату маці (*М. Стральцоў*).

5) На балоце, недалёка ад канавы рабочыя палілі вогнішча (*А. Жук*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставіцца коска:

1) У сонечнай далечыні, на шырокіх і роўных__ як стол__ слуцкіх палетках палавела жыта (*А. Жук*).

2) У горадзе з вялікімі культурнымі і гістарычнымі традыцыямі Янка Купала расце__ як літаратар-інтэлектуал (*Л. Давідоўская*).

3) А там, на самай граніцы, ззяла__ як люстэрка__ пакручастая стужка вады (*Я. Колас*).

4) Калі я ўвайшоў у ягаднік, то ўбачыў: чарніц тут__ што расы (*В. Жуковіч*).

5) — Сэрца маё не дазваляе гэтага бачыць, — кажа дзядзька Язэп гультаю. — Робіць__ як мокрае гарыць... (*А. Якімовіч*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх параўнальны зварот выконвае ролю азначэння:

1) У Жыцькаве на правадах сядзела ўжо некалькі ластаўчыных сем'яў, дзе і моладзь лятала, як дарослыя (*Я. Сіпакоў*).

2) Калі мы складалі сена на хату, хлопцы, як на варце, стаялі ля гнязда, каб не зачапілі яго выпадкова віламі (*Я. Сіпакоў*).

3) Дзеці з вясёлым гоманам, як пчолкі, высыпалі са школы на вуліцу, напаўняючы яе звонкімі, шчаслівымі галасамі (*Я. Колас*).

4) Хударлявы і невысокі, як хлапчук, ён паволі перастаўляў ногі (*Я. Пархута*).

5) А самае цікавае, што гэта былі не бярозавікі, жоўценькія, як яечкі, а чорнагаловыя, найлепшыя баравікі, якія растуць толькі ў сасонніку (*Я. Колас*).

## Тэкст да заданняў 9, 10

(1) Вакол плошчы Перамогі, паабапал шырокага, святочна ўбранага праспекта, у гуллівым натоўпе стаяла багата людзей.

(2) У ціхім шолаху развяваліся сцягі. (3) Асветленыя сонцам, ярка блішчалі і звінелі медалі. (4) Калі паказаліся першыя машыны, ён адразу заўважыў штосьці незвычайнае ў абліччы ветэранаў. (5) Пілоткі старыя выцвілыя на сонцы вымытыя дажджамі сушаныя вятрамі якія зусім не пасавалі да цывільных гарнітураў і святочных сукенак ветэранаў маладзілі людзей. (6) Яны нібы вярнулі ветэранаў у тыя дні, у тыя гады, у тыя акопы, траншэі і бліндажы, што, заслоненыя часам, дыміліся цяпер далёка ад іх (*Паводле Я. Сіпакова*).

**9.** Выпішыце нумар сказа, у якім адасабленне адпавядае наступнай умове: паміж азначэннем і паяснёным словам стаіць выказнік.

______________________________________________

**10.** Запішыце 5-ы сказ, паставіўшы неабходныя знакі прыпынку.

______________________________________________

______________________________________________

# Кантрольная тэставая работа

## Варыянт 1

**1.** Адзначце радкі, у якіх выразы з'яўляюцца словазлучэннямі:

1) блакітны небакрай;
2) самы цікавы;
3) сонца ўзышло;
4) няхай прыязджае;
5) некалькі слоў.

**2.** Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў кіраванні:

1) больш пяці кілаграмаў;
2) дом на тры паверхі;
3) захварэць на грып;
4) чуць сваімі вушамі;
5) сумаваць па маці.

**3.** Адзначце словазлучэнні, у якіх галоўнае слова кіруе залежным:

1) халодны дзень;
2) вучыцца добра;
3) глядзець тэлевізар;
4) хатка бабра;
5) жаданне дапамагчы.

**4.** Адзначце неразвітыя сказы:

1) У хаце цёпла.
2) Заспявалі птушкі.
3) Вечар надышоў хутка.
4) Дзень цёплы.
5) Чалавек ціхі і спакойны.

**5.** Адзначце сказы, у якіх дзейнік выражаны назоўнікам у назоўным склоне:

1) І ўсё навокал ажыло і павесялела (*Р. Ігнаценка*).
2) Нішто жывое не траціць цяпер дарэмна гэтых апошніх залатых дзянькоў (*Р. Ігнаценка*).
3) Шумяць бярозы, груша пад паветкай (*І. Грамовіч*).
4) Бабіна лета настала (*Р. Ігнаценка*).
5) Надарылася і навальніца з бурным, імклівым дажджом, доўгім старэчым кашлем грому і белымі пісягамі маланак (*Б. Сачанка*).

**6.** Адзначце радкі, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік:

1) Найлепшае сведчанне таму ___ праца самога Якуба Коласа (*М. Лужанін*).
2) Талент ___ гэта не толькі праца, а і мужнасць (*М. Лужанін*).
3) На круглым маленькім лісточку ззяе бліскучая кропелька-іскрынка, ды кропелька ___ не вадзяная (*В. Крукоўскі*).
4) Легендарнае возера Свіцязь! Ты ___ беларускае мора, невялічкае, але такое ж чыстае, светлае, прыветлівае (*П. Сабіна*).
5) Сосны ___ нібы воіны на варце цішыні і адвечнага спакою (*М. Хведаровіч*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены галоўныя члены:

1) У паветры было ціха (*Я. Колас*).
2) Настаўнік спыніўся з вучнямі на сухім месцы ў лесе (*Я. Колас*).
3) Некаторыя з пачаткоўцаў ледзь-ледзь бліснулі ў друку і неўзабаве зніклі (*І. Грамовіч*).
4) Мне часта даводзілася бачыць Янку Купалу на розных сходах, мітынгах, пасяджэннях (*А. Бялевіч*).
5) Ноч была халодная і цёмная (*І. Шамякін*).

**8.** Адзначце сказы з недапасаванымі азначэннямі:

1) Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары... (*Я. Колас*).
2) Дальнія хвойнікі былі зацягнуты шызай смугой (*І. Шамякін*).
3) Пракоп не мог не паддацца жаданню прысесці на гладка спілаваным пні (*Я. Колас*).
4) Гукі песні смела ўразаліся ў цішыню ночы і бойка плылі за рэчку (*Я. Колас*).
5) Па вузкім травяністым беразе вузенькая сцежачка вяла да прымкнутага чоўна (*Я. Скрыган*).

**9.** Вызначце від выказніка ў сказе:

*Вяртаючыся дадому, таксама стараліся ісці разам (І. Грамовіч).*

1) Просты дзеяслоўны;
2) састаўны дзеяслоўны;
3) састаўны іменны.

**10.** Адзначце сказы, у якіх выказнік ужыты ў правільнай форме:

1) Розная драбяза, накшталт мухаловак, сітавак, ляціць групкамі.
2) За дзесяць гадоў большасць дрэў паспяваюць вырасці і даваць плады.

3) Мінулі пяць стагоддзяў.
4) Трое байцоў стаяла пры абозе.
5) Васіль з Ганнай гаварылі, не хаваючы сваёй трывогі.

**11.** Адзначце двухсастаўныя сказы:

1) Гэта было добра вядома і без гадзінніка (*І. Мележ*).
2) Але навальніцы ўлетку імклівыя і кароткія (*Т. Хадкевіч*).
3) Дзень быў ясны, блакітны (*І. Мележ*).
4) Легендарнае возера Свіцязь! (*П. Сабіна*).
5) А авёс зжалі нядаўна (*Я. Сіпакоў*).

**12.** Устанавіце адпаведнасць паміж аднасастаўнымі сказамі ў першым слупку і іх відамі ў другім:

| | |
|---|---|
| 1) Пацягнула вільгаццю. | А. Абагульнена-асабовы. |
| 2) Дыхаю і не магу надыхацца. | Б. Назыўны. |
| 3) Ад крадзенага не пасыцееш. | В. Няпэўна-асабовы. |
| 4) Апоўдні падагналі аўтобус. | Г. Пэўна-асабовы. |
| 5) Ноч. | Д. Безасабовы. |

---

**13.** Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены выдзелены (або не выдзелены) коскамі правільна:

1) Бруіцца сярод зыбкіх тарфяных берагоў блізкая рака, ціхая, але вяртлявая (*І. Грамовіч*).

2) Бялявыя, зімовыя хмары нізка навіслі над змярцвелаю зямлёю (*Я. Колас*).

3) Хадзіла ў вёскі, на хутары́ несла моладзі жывое слова праўды (*Я. Пархута*).

4) Юлька падкінула асколак у руках, нібы ўзважвала яго вартасці, і ціха прамовіла... (*Я. Пархута*).

5) Бярыце кветкі ды ідзіце да абеліска (*А. Савіцкі*).

**14.** Адзначце сказы, у якіх правільна вызначана сінтаксічная роля выдзеленых слоў:

1) На Палессе хутка насоўваўся зацяты ў сваёй маўклівасці вечар, засцілаючы цьмянай посцілкай ***лес***, дальнія ***балоты*** і сухое ***поле*** (*Я. Колас*) — *аднародныя дапаўненні*.

2) Крыштальныя ***крыніцы***, быстрацечныя ***рэчкі*** і жвавыя ***ручаі*** жывяць-поўняць тваю неўгамонную сілу (*Т. Хадкевіч*) — *аднародныя дзейнікі*.

3) Кожная пара года па-свойму ***прывабная***, ***прыгожая*** (*М. Лупсякоў*) — *аднародныя азначэнні.*

4) Некуды ***кліча***, ***вабіць*** цябе жыццё, і ***ўздымаюцца*** грудзі ад глыбокага дыхання (*М. Лупсякоў*) — *аднародныя выказнікі.*

5) Вясна — малады, бурлівы ***вір*** жыцця, імклівы, неспакойны ***рух*** у неакрэсленыя прасторы... (*Я. Колас*) — *аднародныя выказнікі.*

**15.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры абагульняльных словах пастаўлены правільна:

1) Мова наша неўміручая, бо яе захоўваюць усе: сялянка, што спявае народную песню; вучоны, які, збіраючы словы, складае слоўнік; дзяды, што апавядаюць пра мінулае роднай зямлі (*У. Караткевіч*).

2) Лес для мяне стаў усім — і домам, і школай, і месцам шматлікіх дзіцячых забаў і гульняў (*Б. Сачанка*).

3) І матчыны словы, і ласка яе, і такі знаёмы дамашні пах — усё гэта вярнула Івану адчуванне радасці жыцця (*А. Кудравец*).

4) У холад і ў спёку, у дождж і пасля дажджу, удзень і ўночы, з ветрам і без ветру, маладзіком і ў поўню, летам і зімой заўсёды прыгожы ён, наш любы край (*Я. Сіпакоў*).

5) І куды ні зірнеш: на купіны верасу, на кусты, на трухлявыя пні — усё было заплецена павуціннем (*І. Грамовіч*).

## Тэкст да заданняў 16—20

(1) Мінуўшы сяло, Сцёпка выйшаў у поле. (2) Бяскрайнія прасторы ляжалі перад ім, пазіралі на яго незлічонымі вачыма, пазіралі маўкліва і ўдумна. (3) І неяк маркотна стала Сцёпку. (4) Усё, што было найдаражэйшае ў яго жыцці: дзяцінства, таварышы, сям'я, Аленка — засталося дзесьці там, пад саламянымі стрэхамі, што пакрыху пачыналі знікаць з вачэй.

(5) Ідзе Сцёпка то чыгункаю, то вузенькаю сцежкаю, мінае чырвоныя домікі будачнікаў, пераезды, купкі дрэў, а перад ім раскрываюцца ўсё новыя і новыя малюнкі незнаёмых краявідаў (*Я. Колас*).

**16.** Адзначце спосаб сувязі сказаў у тэксце:

1) паслядоўная;

2) паралельная.

**17.** Выпішыце з тэксту тры словазлучэнні, якія адпавядаюць схеме «$\overset{\times}{\text{назоўнік}}$ + назоўнік».

**18.** Знайдзіце ў тэксце аднасастаўны сказ. Запішыце яго нумар, від і граматычную аснову.

______________________________________________

**19.** Складзіце схему аднародных членаў сказа з 4-га сказа.

______________________________________________

**20.** Адзначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў 5-м сказе:

1) адзін;
2) два;
3) тры;
4) чатыры.

## Варыянт 2

**1.** Адзначце радкі, у якіх выразы не з'яўляюцца словазлучэннямі:

1) поле і лес;
2) самы добры;
3) хай бы прыйшоў;
4) хтосьці з нас;
5) учора вырашылі.

**2.** Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў кіраванні:

1) паслаць па бацьку;
2) падзякаваць сябра;
3) кватэра на два пакоі;
4) насміхацца над няўмелым;
5) накіравацца ў грыбы.

**3.** Адзначце словазлучэнні, у якіх галоўнае слова кіруе залежным:

1) падараваць радасць;
2) спяваць моцна;
3) спяваць песню;
4) сшытак брата;
5) мара вучыцца.

**4.** Адзначце неразвітыя сказы:

1) Печ халодная.
2) Летам дні доўгія.
3) Ужо заспявалі.
4) Чысты голас.
5) Сумна і непрыветна.

**5.** Адзначце сказы, у якіх дзейнік выражаны назоўнікам у назоўным склоне:

1) Яны стаялі, як ніколі блізкія адна адной, падтрымлівалі адна адну і ціха плакалі (*М. Стральцоў*).

2) Зямля набывае матава-белы колер, а валаконцы ўсё ткуцца і ткуцца (*Р. Ігнаценка*).

3) Там вецер, а тут заўсёды ўтульна (*І. Грамовіч*).

4) Кожны з нас маўкліва праводзіў вачыма жураўліны клін, які пастуопова хаваўся за бярозы (*Я. Сіпакоў*).

5) Заходняя Дзвіна — мая малая радзіма, калыска майго маленства, невычэрпная радасць маіх сталых год! (*Т. Хадкевіч*).

**6.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік:

1) Беларуская народная творчасць __ гэта паэма народа, люстра яго душы, невычэрпная крыніца творчага натхнення і мастацкіх вобразаў (*М. Раманюк*).

2) Лічыцца, што пасля мовы адзенне __ найважнейшая этнічная прымета народа (*М. Раманюк*).

3) Вада ў возеры __ як шкло, аж відаць на дне на дзіва белы пясок (*К. Цвірка*).

4) Увосень ночы __ доўгія (*К. Чорны*).

5) Маё вялікае і даўняе жаданне __ ва ўсім будзённым бачыць урачыстасць (*Я. Сіпакоў*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены галоўныя члены:

1) Нашы дзяды і бацькі, бабулі і матулі ўмелі шанаваць хлеб (*Б. Сачанка*).

2) Язэп Нарцызавіч Драздовіч — постаць незвычайная ў гісторыі беларускага мастацтва (*А. Ліс*).

3) І расказаў дзед Талаш пра свае прыгоды, пра стажок, пра сваё ўніжэнне перад польскімі жаўнерамі... (*Я. Колас*).

4) На той хутар начальнік з байцамі трапіў другі раз (*Ф. Янкоўскі*).

5) У паветры сыра (*Я. Скрыган*).

**8.** Адзначце сказы з недапасаванымі азначэннямі:

1) Пасля пацягнуўся поплаў з празрыстаю сінізною далечы, ад якой замірае сэрца (*Я. Скрыган*).

2) Паляванне на грыбы — прыемнае правядзенне часу, гэта спорт і адпачынак (*Л. Кацкевіч*).

3) Прайшлі цёплыя дажджы, сонца дорыць зямлі невычарпальную ласку (*Т. Хадкевіч*).

4) Жаданне пайсці на рыбалку не пакідала да самага вечара (*А. Камароўскі*).

5) Тонкія серабрыстыя валаконцы асядаюць на зямлю, чапляюцца за хмызы, платы, быльнёг (*Р. Ігнаценка*).

**9.** Вызначце від выказніка ў сказе:

*То там, то тут былі бачны зубры (Я. Пархута).*

1) Просты дзеяслоўны;
2) састаўны дзеяслоўны;
3) састаўны іменны.

**10.** Адзначце сказы, у якіх выказнік ужыты ў няправільнай форме:

1) Усе прысутныя бачылі і адчувалі, што старшыня нечым усхваляваны.
2) Тры высокія дубы ўзвышалася над хатай.
3) Частка студэнтаў адмовілася ад экскурсіі.
4) Мала хто з прысутных падтрымалі дырэктара.
5) Пяцёра малых сядзела на беразе рэчкі.

**11.** Адзначце двухсастаўныя сказы:

1) Папараць жоўтая, буланая, а месцамі чырвоная, як агонь (*І. Пташнікаў*).
2) У расчыненыя дзверы павеяла вільготнай свежасцю (*Т. Хадкевіч*).
3) Ды і з выгляду ён — хлопец нішто сабе (*І. Грамовіч*).
4) Хто з грыбнікоў не ведае своеасаблівага паху маладых, толькі што сабраных дароў прыроды (*Т. Хадкевіч*).
5) Са свайго языка спусціш, на чужым не зловіш (*Прыказка*).

**12.** Устанавіце адпаведнасць паміж аднасастаўнымі сказамі ў першым слупку і іх відамі ў другім:

| | |
|---|---|
| 1) Пахаладала. | А. Абагульнена-асабовы. |
| 2) Не рабі ліхога і не бойся нікога. | Б. Назыўны. |
| 3) Раніца. | В. Няпэўна-асабовы. |
| 4) Хаджу, любуюся наваколлем. | Г. Пэўна-асабовы. |
| 5) Беларусь называюць краем блакітных азёр. | Д. Безасабовы. |

**13.** Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены выдзелены коскамі правільна:

1) Вецер калыхаў высокія жоўтыя сосны, і яны шумелі несціхана вакол заставы, пасля супакойваліся і ціха шапталі пра нешта сваё, таемнае і адвечнае (*М. Плотнікаў*).

2) Раніцаю на ўслоне ляжалі пяць боханаў хлеба пышных, зарумяненых, злёгку асвежаных вадою і даспявалі, укрытыя даматканым ручніком (*Ю. Грыбаў*).

3) Я амаль забыўся пра тую мімалётную, франтавую сустрэчу і ўспомніў пра яе толькі праз васямнаццаць год, калі заняўся літаратурай (*В. Быкаў*).

4) Аголеныя дрэвы шумелі глуха, надрыўна (*Я. Колас*).

5) Неяк нечакана і непрыкметна з'явілася, быццам з-пад зямлі, круглае, чырвонае сонца (*В. Вольскі*).

**14.** Адзначце сказы, у якіх няправільна вызначана сінтаксічная роля выдзеленых слоў:

1) Рака ў гэты час ***спакойная*** і ***велічная***, і ні адна зморшчынка не пярэсціла яе чало (*Т. Хадкевіч*) — *аднародныя выказнікі*.

2) ***Растае*** снег, ***бягуць*** ручайкі, ***спяваюць*** жаўрукі (*М. Лупсякоў*) — *аднародныя выказнікі*.

3) Дзень ***пагоды***, восеньскай ***цеплыні*** і ***бясхмар'я*** панаваў навокал у прыродзе (*І. Пташнікаў*) — *аднародныя азначэнні*.

4) Аголеныя дрэвы шумелі ***глуха***, ***надрыўна***, ***шалёна*** біліся аб сцены аканіцы... (*Я. Колас*) — *аднародныя акалічнасці*.

5) Здавалася, не будзе канца яе [завірухі] лютай ***сіле***, яе злоснаму ***завыванню*** (*Я. Колас*) — *аднародныя дапаўненні*.

**15.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры абагульняльных словах пастаўлены няправільна:

1) Лес заўсёды шумеў: узімку і ўлетку, вясной і ўвосень (*Б. Сачанка*).

2) Паўната адчування шматграннасці жыцця, непасрэдная жывая сувязь з людзьмі, пачуццё адказнасці перад народам — усё гэта складае змест паэтычных кніжак Пімена Панчанкі (*М. Стральцоў*).

3) А ты, сведка нязмернага часу, плывеш і плывеш удаль, убіраючы ў сябе ўсё — добрае і благое, радаснае і скрушнае (*Т. Хадкевіч*).

4) Калі ж у маі сямнаццатага года пагасла апошняя свечка, побач не было нікога: ні бацькоў, ні сваякоў, ні сяброў (*Г. Бураўкін*).

5) Вясна, кажуць, прыгожая ўсюды — у полі, у лесе, у горадзе (*Я. Брыль*).

## Тэкст да заданняў 16—20

(1) Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары, поўныя смутнага хараства. (2) Першыя зоры ўжо замігцелі то тут то там у бяздонным небе, а з-за лесу залатым пажарам узнімаўся кругам бліщчасты месяц. (3) Дробныя белыя хмаркі высцілалі дарожку сваімі лёгкімі празрыстымі тканямі і купалі свае танкарунныя кудры ў святле месяца. (4) Пахла зямлёй, багата акропленай расою. (5) У сяле чуліся гаворка і песні. (6) Вясёлыя маладыя гукі смела ўразаліся ў цішыню ночы і бойка плылі за рэчку, тут яны натыкаліся на высокі бераг і беглі ўздоўж яго па дузе лукі (*Я. Колас*).

**16.** Адзначце спосаб сувязі сказаў у тэксце:
1) паслядоўная;
2) паралельная.

**17.** Выпішыце з тэксту тры словазлучэнні з неаднароднымі дапасаванымі азначэннямі.

___

**18.** Знайдзіце ў тэксце аднасастаўны сказ. Запішыце яго нумар, від і граматычную аснову.

___

**19.** Складзіце схему аднародных членаў сказа з 3-га сказа.

___

**20.** Адзначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў 3-м сказе:
1) адзін;
2) два;
3) тры;
4) чатыры.

# 9 КЛАС

## Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне

### Варыянт 1

**1.** Адзначце сродкі сувязі граматычных частак складанага сказа:

1) інтанацыя;
2) паўтор слоў;
3) злучнікі;
4) сінонімы;
5) злучальныя словы.

**2.** Адзначце складаныя сказы:

1) Аднаго разу ўскапалі Алесь з мамай градку каля хаты, вяргіні пасадзілі (*А. Якімовіч*).
2) Увечары, калі садзілася сонца за лес, ішлі на раку па ваду жанчыны (*Э. Самуйлёнак*).
3) Розныя галасы поўняць паветра, усё спявае і радуецца (*Я. Колас*).
4) Недзе ў глыбіні сэрца закіпалі слёзы, але Ліля Іванаўна не баялася іх (*А. Кудравец*).
5) Рыгор Агеевіч прыйшоў з абеду, сеў на балконе ў крэсла, узяў свежы нумар газеты (*А. Раманаў*).

**3.** Адзначце складаныя сказы, граматычныя часткі якіх звязаны пры дапамозе злучальных злучнікаў:

1) У расчыненыя дзверы цэдзіцца сіняя раніца, і звініць ужо ў парожнім вядры малако (*І. Пташнікаў*).
2) Застаўшыся адзін, я пачаў разглядаць партрэты, якія цьмяна паблісквалі на сценах (*У. Караткевіч*).

3) Яшчэ праз хвіліну нехта з байцоў паварушыўся, у яго пад нагою трэснуў сучок (*А. Кулакоўскі*).

4) Мы якраз і збіраліся спусціцца ў кар'ер, каб абмеркаваць нашы далейшыя паводзіны (*І. Навуменка*).

5) Шырокую паляну абступаў лес, але з аднаго боку была прагаліна (*І. Шамякін*).

**4.** Адзначце складаныя сказы з падпарадкавальнай сувяззю частак:

1) Дупло было не надта высока, каля яго ад ствала адыходзіла вялікая сухая галіна (*Я. Маўр*).

2) Віця разумеў, што гэта не толькі сяброўскае суцяшэнне (*А. Пальчэўскі*).

3) Такой цішыні не было нідзе на свеце, такая цішыня была толькі дома... (*І. Пташнікаў*).

4) Віка прачнулася, калі на дварэ ўжо развіднела (*А. Федарэнка*).

5) Потым Пятрок пайшоў паіць карову, а Мірон застаўся з нявесткай (*А. Кудравец*).

**5.** Адзначце прыказкі, якія па структуры адпавядаюць бяззлучнікавым складаным сказам:

1) Стол не стол, калі не частуюць.
2) Не плюй у мора: вады ў ім не прыбудзе.
3) На тое шчупак, каб карась не драмаў.
4) Авечку стрыгуць, а баран дрыжыць.
5) Баба з возу — каню лягчэй.

## Тэкст да заданняў 6—10

(1) На тым беразе, каля якога стаяла бабровая хатка, пачыналася высокая сухая града. (2) Спачатку яна была вузкая і ішла ўздоўж бабровай ручаіны, а потым пашыралася і гублялася ў глыбіні вострава. (3) На ёй рос прыгожы бор з рэдкімі стройнымі соснамі... (*Я. Маўр*).

**6.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ, вызначце яго тып. Адказ запішыце.

---

**7.** У 2-м сказе знайдзіце словы з прыстаўнымі зычнымі гукамі. Запішыце іх у пачатковай форме.

---

**8.** У 3-м сказе знайдзіце слова, амонімам да якога з'яўляецца назоўнік са значэннем 'хімічны элемент, неметал'. Адказ запішыце.

______________________________________________

**9.** У 1-м сказе знайдзіце прыналежны прыметнік. Запішыце яго ў пачатковай форме.

______________________________________________

**10.** Вызначце тып тэксту. Адказ запішыце.

______________________________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце прыметы, уласцівыя складаным сказам:

1) складаюцца з дзвюх і больш граматычных частак;
2) граматычныя часткі падобныя да простых сказаў;
3) граматычная аснова складаецца з двух галоўных членаў сказа;
4) сродкамі сувязі граматычных частак з'яўляюцца інтанацыя, злучнікі і злучальныя словы;
5) складаюцца толькі з галоўных членаў.

**2.** Адзначце складаныя сказы:

1) Дзверы прыадчыніліся, у іх прасунулася чорная галава сакратаркі Вікі з высачэзнай прычоскай (*А. Раманаў*).
2) Толькі цяпер Рая зразумела, што Мішка настроены на сур'ёзную размову (*В. Гігевіч*).
3) Хлопцы даўно ўжо прамоклі да апошняй ніткі, здубянелі ад холаду, але нічога гэтага не адчувалі (*Я. Маўр*).
4) Я таксама рваўся на вуліцу, але мяне не пусцілі (*І. Шамякін*).
5) Я стаў задумлівы, разгублена адказваў на пытанні сваіх сяброў і свой душэўны стан не змог схаваць ад іх вачэй (*І. Навуменка*).

**3.** Адзначце складаныя сказы, граматычныя часткі якіх звязаны пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў:

1) Стукалі ў садзе вобземлю яблыкі і грушы, спелі арабіны (*К. Чорны*).
2) Узыходзіць сонца, і аж пераліваюцца залатымі бляскамі вадзяныя кропелькі на лісці старой вішні (*І. Навуменка*).

3) Дзікае паляванне памчала далей, а я сеў на зямлю (*У. Караткевіч*).

4) Сучасныя дакладныя хімічныя аналізы метэарытаў паказалі, што ў іх прысутнічаюць усе вядомыя на Зямлі хімічныя элементы (*У. Бардон*).

5) За гаворкаю Алік з Мішам не заўважылі, як аддаліліся ад ручая і трапілі пад таўшчэзны дуб (*А. Пальчэўскі*).

**4.** Адзначце складаныя сказы са злучальнай сувяззю частак:

1) За сталом сядзелі строгія экзаменатары, а на стале былі акуратна раскладзены білеты (*І. Навуменка*).

2) Бацька быў заняты, і ў лясніцтва паслалі мяне (*І. Шамякін*).

3) Сонца ўжо зайшло, але яшчэ цэлую гадзіну трымаўся шэры змрок (*Я. Маўр*).

4) Дружным хорам шчабечуць шпакі, весела пасвістваюць івалгі і дразды (*А. Якімовіч*).

5) Я так захапіўся кнігамі, што не адразу заўважыў у пакоі другога чалавека (*У. Караткевіч*).

**5.** Адзначце прыказкі, якія па структуры адпавядаюць бяззлучнікавым складаным сказам:

1) Доля ўсюды знойдзе: яе і канём не аб'едзеш.
2) Не тады плаваць вучацца, як вада ў рот плыве.
3) Не здарылася б бяды, калі б конь не быў худы.
4) Дай кароўцы бурачка — дасць кароўка малачка.
5) Лес чуе, а поле бачыць.

### Тэкст да заданняў 6—10

(1) Малахіт — адзін з найпрыгажэйшых мінералаў зялёнага колеру. (2) Краса самацвета заключаецца не толькі ў яго афарбоўцы, але і ў разнастайнай тэкстуры: стужкавай, струменістай, прамяністай... (3) Найлепшыя ў свеце гатункі малахіту знойдзены на Урале, але тыя радовішчы зараз практычна выпрацаваны (*Паводле У. Бардона*).

**6.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ, вызначце яго тып. Адказ запішыце.

**7.** Знайдзіце ў 2-м сказе словы, утвораныя шляхам складання асноў. Запішыце іх у пачатковай форме.

---

**8.** У 3-м сказе знайдзіце слова, сінонімам да якога з'яўляецца назоўнік ***сорт***. Запішыце яго ў пачатковай форме.

---

**9.** Знайдзіце ў тэксце прыметнікі, ужытыя ў форме ступені параўнання. Формамі якіх якасных прыметнікаў яны з'яўляюцца? Адказ запішыце ў пачатковай форме.

---

**10.** Адзначце сродак сувязі 1-га і 2-га сказаў тэксту:

1) займеннік;
2) прыслоўе;
3) лексічны паўтор;
4) сінонім;
5) злучнік.

# Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

## Варыянт 1

**1.** Адзначце віды сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучаных сказаў:

1) азначальныя;
2) спалучальныя;
3) уступальныя;
4) супраціўныя;
5) размеркавальныя.

**2.** Адзначце складаназлучаныя сказы:

1) Дзіма нагнуўся, хацеў пагладзіць верабейку, а ён зусім сцяўся, прыціснуўся да зямлі (*А. Якімовіч*).
2) У цёмным парку было ціха, і ў паветры прабіваўся пах прэлага мінулагодняга лісця (*Э. Самуйлёнак*).
3) Жанчына гнулася па-ранейшаму, падбіраючы пракос ды вяжучы снапы, аднак ёй стала трохі лягчэй (*Я. Брыль*).
4) Сарокін устаў, ветліва падзякаваў за пачастунак і кампанію і, звяртаючыся да Рыгора Агеевіча, прапанаваў разам пагуляць, пагаварыць па-мужчынску (*А. Раманаў*).
5) Таня вельмі не хацела, каб тата ехаў у камандзіроўку (*У. Мяжэвіч*).

**3.** Адзначце складаназлучаныя сказы з аднатыпнымі часткамі:

1) Поле вялікае, і на ім у некалькіх месцах сярод збожжа віднеюцца яблыні, грушы і слівы (*В. Шніп*).
2) І дождж ужо не лье, і гром здалёку грыміць, а мы не вылазім з дупла (*В. Шырко*).
3) Будавацца было цяжка, але Антось быў майстар на ўсе рукі (*М. Лужанін*).
4) Вальсаваць не было месца, і мы, прыціснуўшыся адно да аднаго, стоячы, перастаўлялі толькі ногі з месца на месца (*Г. Марчук*).
5) Ужо іграў гармонік, і моладзь гуляла польку, з тупатам уздымаючы пыл (*Я. Брыль*).

**4.** Адзначце складаназлучаныя сказы, часткі якіх звязаны спалучальнымі злучнікамі:

1) То пісне нейкая птушка, то прарэзліва крыкне сава, то хрусне сухая галіна, то пачуецца ледзь чутны шолах (*Я. Маўр*).

2) Грышку непрыемна было слухаць горкія словы, і ён аж закруціўся на канапе (*П. Рунец*).

3) Мама хацела пагладзіць медзведзяня, але яно павярнулася, забурчала і вышчарыла белыя вострыя зубкі (*Я. Бяганская*).

4) Іншы раз у скверыку рыпаў гармонік, а на заасфальтаванай яшчэ да вайны пляцоўцы наладжваліся танцы (*І. Навуменка*).

5) Толькі плавіліся, залаціліся ў промнях сонца вокны ды кучаравіўся над комінамі дым (*Б. Сачанка*).

**5.** Адзначце складаназлучаныя сказы з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі:

1) Ірка паказвала сваю спрытнасць, а мой кожны крок выходзіў нязграбным (*І. Грамовіч*).

2) То свеціць сонца, то пахмурна (*В. Вольскі*).

3) У Загурскага ўвесь час нервова торгалася шчака, але гаварыў ён спакойна, нават з нейкай асуджанасцю ў голасе (*А. Асіпенка*).

4) У небе трапяталі крыльцамі, звінелі жаўранкі, і гэты звон выцягнуў шчымлівую тугу з сэрца (*А. Кудравец*).

5) Сляды гарачыні яшчэ на тварах носім, ды паплылі ўжо дні ў залатую восень (*П. Панчанка*).

**6.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) У гэты час расчыніліся дзверы, і ў воблаку марознай па́ры з'явіўся Васіль (*Э. Самуйлёнак*).

2) Тут раслі яліны, і трапляліся бярозы (*К. Чорны*).

3) Рэзкі свіст — і ля краю балота задымілася глеба (*У. Бардон*).

4) Над вымытымі вадой палямі засінела чыстае неба, і зазіхацела яркае жнівеньскае сонца (*І. Мележ*).

5) Баба ласкава суцяшала ўнука, а дзед пакепліваў з яго (*І. Грамовіч*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) У адказ толькі спявалі птушкі__ ды цвыркалі конікі (*К. Хадасевіч-Лісавая*).

2) Снег прыкарэў на ялінах і соснах__ і вецер яго не абтрэсвае (*Я. Брыль*).

3) Пачатак верасня быў дажджлівым__ і нават старшакласнікі хадзілі ў школу ў верхнім адзенні (*А. Бадак*).

4) У лесе спяваюць дразды, лясныя жаваранкі__ а па балоце важна праходжваецца бусел (*Я. Колас*).

5) У хаце яшчэ стаяла сухаватая, напараная сонцам духата__ і было цемнавата (*В. Адамчык*).

### Тэкст да заданняў 8—10

(1) У бухту прыйшоў першы ветрык, і разам з ім з прасторнага мора дайшлі да берага і першыя дробныя хвалі. (2) Пазней яны ператворацца ў неспакойны прыбой, які ўскаламуціць ваду ля берага, падыме з дна водарасці... (3) Ужо паднялося сонца, у сіняй смузе ***прападае*** ў моры горны мысок (*Паводле А. Жука*).

**8.** Знайдзіце ў тэксце складаназлучаны сказ, вызначце сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж яго часткамі. Адказ запішыце.

______________________________________________________

**9.** З 2-га сказа выпішыце слова, марфемная будова якога адпавядае схеме «корань + суфікс».

______________________________________________________

**10.** Ад асновы выдзеленага ў 3-м сказе дзеяслова ўтварыце дзеепрыслоўе, запішыце яго.

______________________________________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце сродкі сувязі граматычных частак складаназлучанага сказа:

1) спалучальныя злучнікі;
2) супраціўныя злучнікі;
3) падпарадкавальныя злучнікі;
4) размеркавальныя злучнікі;
5) злучальныя словы.

**2.** Адзначце складаназлучаныя сказы:

1) Мы былі пераведзены ўжо ў дзясяты клас, і ад гэтага на душы было і радасна, і трывожна (*І. Навуменка*).
2) Я накіраваўся спачатку ўздоўж лагчыны, а пасля крута звярнуў да Балотных Ялін хмызамі (*У. Караткевіч*).
3) Мінералы з групы кварцу лёгка пазнаць, бо яны сустракаюцца ў выглядзе крышталёў вельмі характэрнай формы (*У. Бардон*).
4) Правадніца разгубілася ад такой псіхалагічнай атакі, а людзі ў чарзе грымнулі смехам (*А. Раманаў*).

5) Спачатку зубры абменьваліся грознымі позіркамі, хадзілі адзін вакол аднаго, схіліўшы магутныя, цяжкія галовы, і толькі сярдзіта фыркалі, набіраючыся злосці (*В. Вольскі*).

**3.** Адзначце складаназлучаныя сказы з разнатыпнымі часткамі:

1) Збіраюся ў камандзіроўку, а на вакзале няма білетаў (*В. Шніп*).
2) Надыходзіў вячэрні змрок, і ад гэтага яшчэ ўтульней было каля агню (*Я. Маўр*).
3) Малыя, як мышы, рынуліся пад ложак, і ў хаце стала на момант ціха (*Л. Дайнека*).
4) Наладжвалася жыццё, але пачала хварэць маці (*А. Жук*).
5) За садам плыло сонца, свецячы проста Алесю ў твар, і літары ў кнізе здаваліся чырвонымі (*У. Караткевіч*).

**4.** Адзначце складаназлучаныя сказы, часткі якіх звязаны супраціўнымі злучнікамі:

1) Плашч расхінуўся, і ўсе ўбачылі за поясам пана два вялікія пісталеты, аздобленыя цьмяным срэбрам (*У. Караткевіч*).
2) У сяле яшчэ доўга спяваліся песні, ды дзесь з двара даносіўся брэх патрывожанага сабакі (*Я. Колас*).
3) Карычневая спіна Міколкі на момант знікла з вачэй, а праз хвіліну хлопчык вынырнуў ужо далёка ад берага (*Я. Бяганская*).
4) На голлі спяць яшчэ пупышкі, але ўжо коміна аловак дымком на мяккай сіні піша вясны ружовы загаловак (*А. Мінкін*).
5) Марознай зорнай ноччу на шашы то прасунуцца ціхія сані, то зноў прамчыцца машына (*Я. Брыль*).

**5.** Адзначце складаназлучаныя сказы са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі:

1) А вось праз хмары раптам выглянула сонца, і святло заззяла знізу, адбіўшыся ад зямлі, засланай першым снегам (*Я. Брыль*).
2) Час ад часу прагудзе аўтамашына або, выкрасаючы дугой сінія іскры, прагрукаціць амаль зусім пусты трамвай (*Я. Брыль*).
3) Не хацелася выходзіць з дому ў такую непагадзь, але ў мяне была патрэба наведаць знаёмага (*В. Вольскі*).
4) Потым паплавок нырнуў на дно, а я, стары рыбак, нават не зварухнуўся (*М. Ваданосаў*).
5) Чытае Таццяна шмат, і пасля кожнай прачытанай кніжкі ў яе нібы крылле адрастае ад захаплення (*А. Васілевіч*).

**6.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Вада ў рацэ цякла ціха, і толькі калі-нікалі чулася рэдкае хлюпанне і ледзь улоўнае булькатанне (*В. Гігевіч*).

2) Толькі недалёка ціха булькала крынічка, і да хрыпаты надрываўся недзе драч... (*М. Ваданосаў*).

3) Хвіліна-другая — і машына ад'язджала ўбок ці выкіроўвала назад на дарогу, імчала ў гараж (*Б. Сачанка*).

4) Зарумянілася на ўсходзе неба і зямля пачала скідаць з сябе белы вэлюм лёгкага, маёвага туману (*В. Ластоўскі*).

5) З пакалення ў пакаленне перадаваліся таямніцы ткацкага майстэрства, і ўрэшце нялёгкая праца ператварылася ў высокае мастацтва (*У. Ягоўдзік*).

**7.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Толькі калышуцца туманы снегу__ і хістаецца гнуткае галлё лазняку (*Э. Самуйлёнак*).

2) Насцечка прачнулася рана__ і ёй ужо не хацелася спаць (*К. Чорны*).

3) Два дні парыла__ і вось на поўдні збіраецца на добры дождж, навальніцу (*Я. Брыль*).

4) У новым будынку трымаўся халадок__ і панавала цішыня (*І. Шамякін*).

5) Мама добра ўмела гаварыць па-польску__ і жанчыны маглі гадзінамі весці размову, расказваць адна другой пра сваё жыццё (*А. Пальчэўскі*).

## Тэкст да заданняў 8—10

(1) Каця танцавала, высока ўзняўшы галаву, моцна прыкусіўшы ніжнюю губу. (2) Маленькія бровы яе былі насуплены, а ў прыжмураных вачах застылі цёмныя агеньчыкі. (3) Я добра ведаў гэтыя агеньчыкі. (4) Яны загараліся ў Каці тады, калі яна збіралася ***зрабіць*** што-небудзь важнае, нечаканае (*А. Кудравец*).

**8.** Знайдзіце ў тэксце складаназлучаны сказ, вызначце сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж яго часткамі. Адказ запішыце.

**9.** З 1-га сказа выпішыце слова, у якім мяккасць зычнага гука на пісьме не перадаецца.

---

**10.** Ад асновы выдзеленага ў 4-м сказе дзеяслова ўтварыце дзеепрыметнік, запішыце яго ў пачатковай форме.

---

# Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

## Варыянт 1

**1.** Адзначце сродкі сувязі граматычных частак складаназалежнага сказа:

1) спалучальныя злучнікі;
2) супраціўныя злучнікі;
3) размеркавальныя злучнікі;
4) падпарадкавальныя злучнікі;
5) злучальныя словы.

**2.** Адзначце складаназалежныя сказы:

1) У самае спякотнае лета лужкі перасыхалі зусім, і гразь камянела, трэскалася (*А. Жук*).
2) Над маладзіком, які чырванееецца рожкамі ўгару, невысока блішчыць Венера (*Я. Брыль*).
3) Нанач браўся туман, сіняваты, густы, як завараны крухмал (*В. Адамчык*).
4) Над Прыпяццю сінее лес, адтуль нясе церпкім густым водарам, сатканым з пахаў хвоі, прэлай зямлі, грыбоў і багуна (*І. Навуменка*).
5) Выйшлі з двара надвячоркам, калі ўздоўж вуліцы наскрозь ружавеў ад сонца ўзняты каровамі пыл (*У. Караткевіч*).

**3.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка знаходзіцца перад галоўнай:

1) Каб нешта знайсці пачытаць, трэба было ехаць у раённы цэнтр (*Б. Сачанка*).
2) Калі я ўпершыню ляцеў на самалёце, пры пасадцы вельмі прасіў лётчыка праляцець скрозь воблакі (*І. Грамовіч*).
3) Гаварыць з Аркадзем было цяжка, нават балюча, хоць ніякай асабістай віны перад ім Багдан не адчуваў (*А. Кулакоўскі*).
4) Як толькі дзядзька адчыніў старыя, скрыпучыя дзверы, у гуменца хлынула маладое, румянае сонца (*Я. Брыль*).
5) Бераг, на якім чарнела сцяна лесу, адыходзіў прэч, аддаляўся ўсё больш (*Э. Самуйлёнак*).

**4.** Адзначце складаназалежныя сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе злучальных слоў:

1) На вуліцы пасвятлела, хоць ужо надыходзіў вечар (*Я. Колас*).

2) Дзяўчына сядзела, звесіўшы з абрыву босыя загарэлыя ногі, і адзін за адным кідала ў ваду каменьчыкі, якіх багата валялася на пясчаным беразе (*М. Ваданосаў*).

3) Лён дацвітае сваім блакітна-дробненькім цветам, што пры дарозе шчодра асыпаўся на пясок (*Я. Брыль*).

4) Некалі я лічыў, што струны гэтай скрыпкі нават самі па сабе не могуць гучаць кепска (*А. Кулакоўскі*).

5) Іван Іванавіч доўга стаяў ля акна, пазіраючы ў цемру, дзе шырока раскінулася велізарнае сузор'е агнёў горада, потым падышоў да стала (*Э. Самуйлёнак*).

**5.** Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі:

1) Столін мог ганарыцца перад Давыд-Гарадком тым, што паняццю горад ён адпавядаў значна больш (*Г. Марчук*).

2) Хоць і не надта шырокай ды глыбокай была тая рака, ды ўсё ж праз яе быў пракладзены такі-сякі мост (*М. Зелянкова*).

3) Ваня адчуў, як непрыемны халадок прабег у грудзях, але не паказаў страху (*А. Якімовіч*).

4) Думка аб тым, што агню здабыць не ўдасца, зусім збянтэжыла хлопцаў (*Я. Маўр*).

5) Ірачцы шкада было летніх цёплых дзён, якія бясследна мінаюць і не вернуцца... (*В. Гігевіч*).

**6.** Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу:

1) Эдзік пастаяў на прыпарушанай снегам платформе, пакуль поезд, замятаючы белы пыл, не пайшоў далей (*А. Кудравец*).

2) Жураўлі вяртаюцца з выраю, калі вясна зусім прагоніць упартую зіму (*У. Ягоўдзік*).

3) Жыта наблізілася да той самай-самай маладой пары́, калі яно ўжо не трава, але яшчэ і не хлеб (*В. Казько*).

4) Калі пачалася вайна, наша зенітная батарэя стаяла недалёка ад Мурманска на абароне ваеннага аэрадрома (*І. Шамякін*).

5) Я знарок выйшаў рана, каб да горада ісці пешкі (*А. Бадак*).

**7.** Адзначце складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем дадзеных частак:

1) Мне прыйшла ў галаву думка, што трэба пайсці ў бібліятэку і даведацца нарэшце, што гэта за дзікае паляванне, пра якое мне было нязручна распытваць гаспадыню (*У. Караткевіч*).

2) Вольцы ўсё здавалася, што час цягнецца вельмі доўга, што марудна збіраюцца людзі (*І. Грамовіч*).

3) Калі я, вярнуўшыся дадому, расказаў Ліне, што ўбачыў і пачуў у Тарасюкоў, яна доўга смяялася (*Б. Сачанка*).

4) Калі заходзіць гутарка пра Мір, звычайна згадваецца ўнікальны замкавы комплекс, які мог бы зрабіць славу любому паселішчу (*Я. Сахута*).

5) Хлапчукі прывіталіся і падышлі бліжэй, каб зірнуць, што малюе настаўнік (*А. Пальчэўскі*).

**8.** Адзначце складаназалежныя сказы з аднародным сузалежным падпарадкаваннем дадзеных частак:

1) Калі яйка разбіць, у ім убачым бялок і жаўток, а таксама абалонку, якой шкарлупіна заслана знутры (*А. Бадак*).

2) У насцярожанай цішыні добра чуваць, як звіняць і падрыгваюць рэйкі, як, задыхаючыся, абдаючы сябе парай, набліжаецца да раз'езда стары, спрацаваны рабочы цягнік (*І. Навуменка*).

3) Косцік пастаяў, пачакаў, пакуль Мікола зноў пачаў касіць, і пайшоў у хату, забыўся і пра тое, чаго выходзіў на двор (*А. Кудравец*).

4) Гэтай раніцай доктар падслухаў усе птушыныя спевы, падгледзеў, як прачынаецца сонны лес, як абуджаюцца травы і воды, як прачынаецца і ўстае сонца (*А. Васілевіч*).

5) Весела пазірае стары лес, што разросся за сялом і цягнецца па краях поля (*Я. Колас*).

**9.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Каля вербаў, што навісалі над вадою была стаянка лодак мястэчковых рыбакоў-аматараў (*А. Пальчэўскі*).

2) Кідаў плесці лапці дзед толькі вясною, калі зямля дыхала цяплом, і людзі пачыналі ўсюды патроху сеяць (*Б. Сачанка*).

3) Цёця Глаша моцна бразнула нажом, якім збіралася рэзаць хлеб, і аж пераступіла з нагі на нагу (*А. Карпюк*).

4) Мы тлумачым прысутным, што бабёр — звер няшкодны і што корміцца ён толькі раслінамі ды карой дрэў, асабліва лазы і асіны (*В. Вольскі*).

5) Трэба толькі ўвесь час падкладваць дровы, бо калі хоць на гадзіну пячурка астывае, то на сценах вагона, асабліва ля дзвярэй і па кутках, адразу выступае белая намаразь (*І. Навуменка*).

**10.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ з сузалежным падпарадкаваннем. Вызначце від сузалежнага падпарадкавання. Адказ запішыце.

Калі мне было гадоў дзесяць, я разбіў фарфоравую вазу, што стаяла на стале. Я чакаў ка́ры, бо ведаў, што гэта каштоўная рэч, якую маці вельмі шанавала. Але маці не кранула мяне нават пальцам. Тую вазу, якую я раскалоў, удалося адрамантаваць. Усю вайну маці хавала ў ёй фотакарткі бацькі. Часам маці беражліва здымала вазу з шафы, каб раскласці на каленях карткі, на якія яна глядзела цэлымі гадзінамі (*Паводле І. Навуменкі*).

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце віды даданых частак, якія адносяцца да акалічнасных:

1) даданая дапаўняльная частка;
2) даданая частка месца;
3) даданая частка мэты;
4) даданая азначальная частка;
5) даданая ўступальная частка.

**2.** Адзначце складаназалежныя сказы:

1) У жніўні сярпы звіняць, камбайны гудуць, снапы покатам кладуцца (*К. Каліна*).
2) Макоўчык подбегам падаўся ў той бок, дзе была лагчына (*І. Мележ*).
3) Хмары не відно было, а грымоты набліжаліся (*І. Грамовіч*).
4) Пры конях, якіх мы паставілі ў зацішку за гумном, застаўся Ермакоў (*Я. Брыль*).
5) Зямля, нібы белай коўдрай, пакрылася пушыстым снегам (*Б. Яфрэмаў*).

**3.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка знаходзіцца ў сярэдзіне галоўнай:

1) Кожнага чалавека цікава паслухаць, калі ён расказвае пра сябе ды не надта выхваляецца, не хлусіць (*А. Кулакоўскі*).
2) Мірон хадзіў па хаце, кратаў пальцамі ўсё, што трапляла пад рукі, і думаў, думаў... (*А. Кудравец*).

3) Марыя Адамаўна завітала ў пакой, прайшлася між ложкаў, упэўнілася, што ўсе спяць, і прысела на Лілін ложак (*А. Пальчэўскі*).

4) Калі Рыгорка яшчэ толькі першы раз прыехаў да бабулі, яму было ўсяго тры гады (*У. Ліпскі*).

5) Кар'ер, да якога назаўтра накіраваліся юныя лыжнікі, знаходзіўся кіламетры за тры-чатыры ад вёскі, за ўзлессем (*Т. Хадкевіч*).

**4.** Адзначце складаназалежныя сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў:

1) Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазвінела песня ляснога жаваранка (*Я. Колас*).

2) Пасля я абследаваў усе пакоі ў другім крыле і пераканаўся, што схавацца там няма дзе (*У. Караткевіч*).

3) І хоць наш клімат вельмі адрозніваецца ад афрыканскага, страусам ён прыйшоўся даспадобы (*А. Бадак*).

4) Уз'ехалі на ўзгорак, з вышыні якога адкрылася вёска (*І. Навуменка*).

5) На вуліцы каля крамы стаялі сябры і чакалі грошай, каб ісці па цукеркі (*А. Пальчэўскі*).

**5.** Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі азначальнымі часткамі:

1) Вадзім і Аляксей Антохін выйшлі з сабора, перабеглі вуліцу, спыталі ў сівога дзядулі з кульбачкай, як трапіць у бліжэйшы ўнівермаг (*Я. Хвалей*).

2) Трое хлапчукоў, якія вынеслі з двара папяровага змея з доўгім ільняным хвастом, застылі ў нерашучасці (*І. Навуменка*).

3) Ходзіць па нашым краі пагалоска пра пана Заблоцкага, што жыў надта даўно, яшчэ за князем Дрыгайлам (*П. Васючэнка*).

4) Хутка ўсе даведаліся, што пажылы камандзір — бацька артысткі (*Э. Самуйлёнак*).

5) Пайшоў Петрык пад тое дрэва, адкуль стук чуўся (*Б. Сачанка*).

**6.** Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі часткамі мэты:

1) У зале было душна, хоць адчынілі ўсе фрамугі (*А. Жук*).

2) Кастусь не заўважыў, калі ў хату ўвайшла Таня (*А. Кудравец*).

3) У свой вольны час Якім Каваль імчаў у родную вёску, каб душой зліцца з прыродай, з краскамі ў полі, з птушыным шчабятаннем (*С. Давідовіч*).

4) Вада пасля таго так хлынула па каналах, што затапіла некаторыя хаты ў вёсцы Валеўка (*М. Зелянкова*).

5) Дзіма знарок не выняў з замка ключа, каб самому адамкнуць і сустрэць маці (*А. Пальчэўскі*).

**7.** Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным падпарадкаваннем дадзеных частак:

1) Калі дождж ашалеў не на жарт, я ўжо стаяў ля акна і таропіўся ў шыбіну, забыўшыся пра ўсё на свеце, нават пра Рытку, якая апошнім часам не выходзіла з маёй галавы ні днём, ні ноччу (*А. Крэйдзіч*).

2) За гаворкай не заўважылі, як распагодзілася, засвяціла сонейка і паплыла па́ра ад зямлі (*А. Пальчэўскі*).

3) Такое пачуццё бывае толькі тады, калі чалавек глыбока верыць у тое, пра што спявае (*У. Караткевіч*).

4) Ноччу, калі Мар'я не спіць, ёй прыемна чуць звонкі, нейкі надрыўна-ўрачысты голас свайго певуна, які першы агалошвае наваколле (*І. Навуменка*).

5) Сёння я прыехаў у горад, каб знайсці свайго аднакласніка, які запрасіў мяне выступіць у школе, дзе ён працаваў настаўнікам (*А. Бадак*).

**8.** Адзначце складаназалежныя сказы са змешаным (паслядоўным і сузалежным) падпарадкаваннем дадзеных частак:

1) Максім глядзеў, як Маня адчыняла веснічкі, як ішла паўз хату, як ступіла на ганак (*А. Кудравец*).

2) Тут Сярожа ўспомніў, куды пайшла мама, і вырашыў, што Андрэйка адразу супакоіцца, калі яму сказаць пра гэта (*У. Паўлаў*).

3) Калі мы будзем абыякавымі да ўсяго кепскага, што ёсць у нас і побач з намі, то чым мы адрозніваемся ад таго чалавека, які жыве ў грамадстве, дзе чалавек чалавеку — воўк? (*У. Дамашэвіч*).

4) Калі надышоў вечар, хлопцы стаялі каля таго самага дрэва, якое дало ім першы прытулак... (*Я. Маўр*).

5) Дырэктар раптам замоўк, бо ўбачыў, што Рахманько не слухае яго, пазірае ў акно і ў думках невядома дзе... (*І. Капыловіч*).

**9.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Я ехаў па дарозе, дзе мне было знаёма кожнае дрэва і кожны куст, і дзе ўсё мне напаміналі аб маім каханні... (*Б. Сачанка*).

2) Алесь і Майка, прыхапіўшы з сабою Яню, пайшлі вакол стаўка, каб паглядзець, адкуль ён бярэ ваду (*У. Караткевіч*).

3) Мармур, які ўтварыўся з найбольш чыстых відаў вапняку набыў беласнежную афарбоўку (*У. Бардон*).

4) Уночы Аліку снілася, што ён згубіў свае лыжы, доўга шукаў іх і што лыжы схаваў ад яго Юрка (*Я. Бяганская*).

5) Маці сказала, што калі я буду паслухмяны, то ў суботу мяне возьмуць у горад (*І. Грамовіч*).

**10.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ з некалькімі дададзенымі часткамі. Вызначце від падпарадкавання. Адказ запішыце.

Я спыніўся ля невялічкай завадзі і пачаў назіраць за маленькімі рыбкамі, якія дружнай чародкай таўкліся на адным месцы. Тут было мелка, і сонечныя промні высвечвалі на дне ракі жоўты дробназярністы пясок, бліскучыя белыя каменьчыкі. Крыху воддаль ляжаў чорны рагаты корч, ля якога я заўважыў тры ладнаватыя чырванапёркі, што лянiва грэліся на сонцы (*М. Зарэмба*).

# Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

## Варыянт 1

**1.** Адзначце сэнсавыя адносіны, якія могуць выражацца паміж аднатыпнымі часткамі бяззлучнікавага складанага сказа:

1) часавыя;
2) прычынныя;
3) супастаўляльныя;
4) умоўныя;
5) супрацьпастаўляльныя.

**2.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы:

1) Можна было падумаць, што зямля варушыцца і моцна ўздыхае пасля доўгага зімовага сну (*П. Броўка*).
2) Сонца садзілася за шматпавярховыя будынкі горада, асвятляла іх (*У. Саламаха*).
3) Марозны ветрык пашчыпваў шчокі і нос, лёгкія паслухмяныя лыжы весела шалясцелі па снезе (*Я. Бяганская*).
4) Цёплае красавіцкае паветра ўварвалася ў пакой, напоўніла яго веснавой свежасцю, закружыла галаву (*А. Васілевіч*).
5) На станцыі пачуўся званок дзяжурнага, пасажыры на пероне замітусіліся, пачалі разбягацца па вагонах (*А. Кулакоўскі*).

**3.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы з аднатыпнымі часткамі:

1) Бусел-тата і бусліха-мама не маюць ніводнай хвілінкі для адпачынку: трэба даглядаць дзяцей (*І. Муравейка*).
2) У Гарновай твар свяціўся радаснай свежасцю, вочы блішчэлі маладым захапленнем (*М. Зарэцкі*).
3) Мільгаюць матылькі, гудзе касматы чмель (*В. Гурскі*).
4) Раптам бачу: паволі падае на зямлю адзінокі жоўты лісток (*Р. Ігнаценка*).
5) Хлопцы паўзлі наперад не дыхаючы, сэрцы іх калаціліся (*Я. Майр*).

**4.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Вечар сыходзіць на вялізны горад__ моцны вецер, ідучы з узмор'я, запаўняе вуліцы і плошчы, кружыць у глухіх дварах, над адталымі гурбамі (*Э. Самуйлёнак*).

2) Вось ужо гром грукоча над самай галавой__ маланка зіхаціць безупынна__ вецер хістае дрэвы (*Я. Маўр*).

3) Вось і збылася мая запаветная мара__ мне далі кватэру! (*М. Варшынін*).

4) Якраз прыпала свята вызвалення__ усюды сцягі, зелень, кветкі, музыка, людзі з ордэнамі, медалямі на грудзях (*А. Кудравец*).

5) Шкло ў акне на верандзе пазвоньвала__ блізка ў буфеце ў такт грымотам адзываліся переразвонам крыштальныя келіхі (*М. Даніленка*).

**5.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць двукроп'е:

1) Тут ужо кіпела жыццё__ звінелі на палянках пчолы, у кустах і на дрэвах спявалі птушкі (*С. Кухараў*).

2) Жнівеньскае неба blішчэла, як свежаразрэзанае волава__ дзьмуў тугі цёплы вецер (*А. Наварыч*).

3) Перавярнуўся воз__ раскідалася дабро (*М. Баскін*).

4) Прачытаў Алесь пісьмо, задумаўся__ сапраўды, рэдка ўсміхаецца мама (*А. Якімовіч*).

5) Палахлівае здзіўленне расло і расло__ такога мноства людзей я яшчэ ніколі не бачыў (*І. Грамовіч*).

**6.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць працяжнік:

1) Зірнуў Мірон і яшчэ болей здзівіўся __ там, высока над зямлёй, скакала жаба (*Я. Маўр*).

2) Спеюць парэчкі __ адцвітаюць белыя півоні (*У. Караткевіч*).

3) Праца кіпіць __ аж зямля дрыжыць (*З. Бядуля*).

4) Гола ў полі __ жыта звезена даўно (*Я. Колас*).

5) Пастух будзе гнаць статак на падвячорак __ выгані карову за вароты (*І. Грамовіч*).

## Тэкст да заданняў 7—10

(1) Кар'ер — вялізная шырокая яма, адкуль пясок бяруць. (2) Там працуе экскаватар, да якога пад'язджаюць па чарзе грузіцца самазвалы. (3) Толькі цяпер чарга не рухаецца: сапсавалася нешта ў экскаватары. (4) Экскаваршчык сагнуўся ля матора, а шафёры стаяць ***паблізу***, перагаворваюцца (*Паводле Д. Слаўковіча*).

**7.** Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавы складаны сказ. Адзначце сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж яго часткамі:

1) часавыя;
2) супастаўляльныя;
3) прычынныя;
4) умоўныя;
5) дапаўняльныя.

**8.** Выпішыце з тэксту няпэўны займеннік.

---

**9.** Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 4-м сказе слова. Адказ запішыце.

---

**10.** Адзначце сродак сувязі 1-га і 2-га сказаў тэксту:

1) займеннік;
2) прыслоўе;
3) лексічны паўтор;
4) сінонім;
5) злучнік.

## Варыянт 2

**1.** Адзначце сэнсавыя адносіны, якія могуць выражацца паміж разнатыпнымі часткамі бяззлучнікавага складанага сказа:

1) дапаўняльныя;
2) прычынныя;
3) часавыя;
4) супастаўляльныя;
5) умоўныя.

**2.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы:

1) Прабіраючы да касцей, дзьмуў халодны вецер, буйныя кроплі дажджу прыбівалі да зямлі пажаўцелае лісце (*А. Якімовіч*).

2) Мой знаёмы пчаляр, які жыве непадалёку ад славутай Белавежскай пушчы, аднойчы летам сустрэўся з жураўлінай сям'ёй (*У. Ягоўдзік*).

3) За акном на мачце цьмяна ззяў ліхтар, сеючы вакол сівенькае святло і бляск на мокрым асфальце, на мокрых спінах прыпаркаваных аўтамашын (*В. Карамазаў*).

4) Непадалёку бабулька несла драўляныя вёдры з вадою, і з вёдраў белымі павольнымі кольцамі выплывала пара (*Л. Дайнека*).

5) Насупраць асінніку Калюгін пастаяў, прыслухаўся: нешта капашылася ў лісці (*А. Жук*).

**3.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы з разнатыпнымі часткамі:

1) Канчаецца палявая дарога, ад даліны, ад поплаву павявае пахам травы, нагрэтых на сонцы лазовых кустоў, аеру (*А. Жук*).

2) Сярод хаты стаяла калыска, у ёй спала дзіцё (*І. Навуменка*).

3) Зачэпіш босай нагой крапіву — валаскі скуру праколюць... (*Д. Слаўковіч*).

4) Малады супрацоўнік гарадской газеты Мікалай Спешынец быў на сёмым небе: рэдактар раніцай падпісаў загад аб прызначэнні яго на пасаду загадчыка аддзела (*А. Раманаў*).

5) Хістаюцца дрэвы, скрыпяць вароты, грымяць дахі (*Э. Самуйлёнак*).

**4.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Непадалёку горбіўся чыгуначны мост цераз Мухавец___ за ўдзірванелым насыпам чуліся дзіцячыя галасы (*У. Ягоўдзік*).

2) Думаў я пра адно___ бацька абяцаў калі-небудзь расказаць пра маці (*Г. Марчук*).

3) Прыедзе ўвосень тата___ ты яго ўласнай бульбай пачастуеш (*Д. Слаўковіч*).

4) Шумеў машынамі Парыж___ з акна кавярні «Георг Пяты» лілася музыка___ з туману выплывала Трыумфальная арка (*Л. Арабей*).

5) Густы туман засцілае вам вочы___ росныя травы і галіны сцябаюць вас па нагах, па твары, мочаць вопратку (*А. Васілевіч*).

**5.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць двукроп'е:

1) І тады Сцяпан пачуў___ з сіняга неба, нарастаючы, плыў перарывісты, пагрозлівы гул (*У. Шыцік*).

2) Крыкне чалавек раніцай___ рэха цэлы дзень гудзе па барах, гаях, пушчах (*У. Ліпскі*).

3) Дзень выдаўся цудоўны___ свяціла сонца, цёпла было на дварэ (*В. Гурскі*).

4) Краўцоўцы пачулі незвычайную навіну___ заўтра ў школе будуць паказваць кіно (*І. Шамякін*).

5) Зазвінеў у высокім небе жаўрук___ заспявалі свае песні берасцянкі... (*М. Даніленка*).

**6.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць працяжнік:

1) Сцяпан зайшоў у двор і здзівіўся ___ на дзвярах вісеў замок (*У. Шыцік*).

2) Апоўдні з пашы прыйдзе карова ___ загані ў хлеў (*І. Грамовіч*).

3) Шаты разложыстых вольхаў і бяроз навісалі над самым шляхам ___ густы белы туман, выпаўзаючы з лясных нізін, засцілаў усё наваколле (*І. Навуменка*).

4) Я з трэскам адчыніў акно ___ халоднае паветра лінула ў пакой (*У. Караткевіч*).

5) Рэдкія пешаходы хуталі галовы ў настаўленыя каўняры ___ вуліцы пранізваў студзеньскі вецер (*А. Васілевіч*).

## Тэкст да заданняў 7—10

(1) Само сабой здарылася так, што, калі скончылася вечарынка, Васіль і Марына адсталі ад усіх і пайшлі па вуліцы побач. (2) Свяціў месяц, маленькія аблачынкі застылі ў небе. (3) Сцішанасць панавала наўкол, наперадзе смяяліся хлопцы і дзяўчаты, але гэта не магло парушыць агульнага ўражання ночы. (4) Вёска спала (*Паводле М. Стральцова*).

**7.** Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавы складаны сказ. Адзначце сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж яго часткамі:

1) часавыя;
2) супастаўляльныя;
3) прычынныя;
4) умоўныя;
5) дапаўняльныя.

**8.** Вызначце разрад ужытых у 3-м сказе прыслоўяў. Адказ запішыце.

______________________________

**9.** Выпішыце з 3-га сказа словы з нулявым канчаткам.

______________________________

**10.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

______________________________

# Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне

## Варыянт 1

**1.** Адзначце віды сувязі, якія спалучаюцца ў складаным сказе з наступнай схемай:

**[ ], (бо...), але [ ].**

1) Злучальная і падпарадкавальная;
2) бяззлучнікавая і злучальная;
3) бяззлучнікавая і падпарадкавальная;
4) бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная;
5) аднародная і неаднародная.

**2.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак:

1) Наперадзе ляжала вёска, справа, ахутанае туманам, віднелася люстэрка азярка, з левага боку, крыху наўзбоч, узвышаўся парослы сасоннікам пагорак (*І. Навуменка*).
2) Голас прагучаў непадалёку ад мяне, але я спачатку не пазнаў, хто гэта сказаў, бо жанчыны той не бачыў (*А. Кулакоўскі*).
3) Праз некалькі гадзін зноў загрымелі артылерыйскія стрэлы, потым пачуўся кулямётны агонь, а праз яго прарваўся і страшны гул танкавых матораў (*А. Жук*).
4) Сняжок пакрыў і тое месца, дзе яшчэ пазаўчора ляжала старое, паламанае крэсла, якое хтосьці нядбалы так і пакінуў на самай сцяжыне (*Я. Брыль*).
5) Побач з палянай раскінулі свае купчастыя шаты магутныя дубы, а за ўзгоркам, у нізіне, узвышаліся змрочныя, калматыя яліны, стройныя беластволыя бярозы і трапяткія асіны (*В. Вольскі*).

**3.** Адзначце складаныя сказы са злучальнай і падпарадкавальнай сувяззю частак:

1) Музычная праграма закончылася, пачалі перадаваць тэлевізійныя навіны, і я прымусіў сябе прыслухацца да голасу сімпатычнай дыктаркі (*М. Зарэмба*).
2) На другую палову дня хіліцца сонца, спадаючы на сосны, і спакайнейшым робіцца яго святло там, дзе шырэй расступаюцца дрэвы, адкрываючы дарогу (*М. Стральцоў*).

3) Я ніколі не чуў, як спяваюць гэтую песню, не ведаў мелодыі, але ад гэтага яна яшчэ больш хвалявала (*І. Навуменка*).

4) Вішні ды слівы ўжо адцвіталі, але яблыні абсыпаліся самай квеценню, ад якой ноч, здавалася, спачывала ў святле пражытага дня (*В. Карамазаў*).

5) Тым часам зусім сцямнелася, вакол у прытуманенай прасторы поля было поўна невыразных плям і ценяў, якія будзілі цьмяную трывогу ў душы (*В. Быкаў*).

**4.** Адзначце складаныя сказы з бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю частак:

1) Яшчэ ляжыць снег, яшчэ мурашкі не выпаўзлі з мурашнікаў, а ўжо выводзіць птушанят крумкач (*У. Караткевіч*).

2) Мінуў бальнічны дзень, у палаце даўно ўсе сцішыліся, нянечка выключыла лямпу, і было тут цёмна, толькі з калідора праз матавае шкло ў дзвярах сачылася жоўтае святло (*Л. Арабей*).

3) Ужо добра развіднела, хаця сонца з-за гор яшчэ не паказалася, і ў горнай даліне панавала прахалодная засень (*В. Быкаў*).

4) Хмара на гарадок найшла неспадзявана: свяціла нізкае сонца, і раптам у вокнах пацямнела (*І. Чыгрынаў*).

5) З нізкіх шэрых хмар, якія вецер гнаў ледзь не над стрэхамі хат, паліліся дробныя, але зацяжныя дажджы, пад нагамі пачало чарнець лісце, яно перамешвалася з чорнай мокрай граззю (*В. Гігевіч*).

**5.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Брат ледзьве паспявае бегчы: кепачка спаўзла ў яго набок, брыль каля самага вуха, а дзядзька цягне, цягне яго за руку (*Л. Арабей*).

2) Спачатку мігціць калоссе абапал вузкай дарогі, а тады пачынаецца грэбля і паша, дзе ўжо нікога няма: ні дзяцей, ні свіней, ні гусей (*Я. Брыль*).

3) Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў, і яны заснулі так моцна, што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз (*Я. Маўр*).

4) Я зразумеў, што за мной назіраюць і мне зрабілася ніякавата (*М. Зарэмба*).

5) У гэтай хлусні і ў гэтай злосці былі свае прычыны: усім не хапала цеплыні, звычайнай увагі, якая так патрэбна чалавеку... (*Л. Дайнека*).

**Тэкст да заданняў 6—10**

(1) Для Васіля Мінск быў чужым месцам, хоць сам ён і не хацеў прызнавацца ў гэтым. (2) Прызнавацца не хацеў, але адчуў гэта адразу, як толькі апынуўся на плошчы: нікому не было ніякай справы да яго... (3) Васіль надта добра разумеў усіх людзей, што вывальваліся з тунэля і ***адразу кідаліся*** да трамваяў і тралейбусаў. (4) Яны баяліся горада, незразумелага тлуму яго і мітусні і стараліся ўцячы ад усяго гэтага, схавацца... (*А. Кудравец*).

**6.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Якія віды сувязі ў ім спалучаюцца? Адказ запішыце.

______________________________

**7.** Выпішыце з 1-га сказа словы, у якіх не супадае колькасць гукаў і літар.

______________________________

**8.** Знайдзіце ў 3-м сказе якаснае прыслоўе, утварыце ад яго форму вышэйшай ступені параўнання. Адказ запішыце.

______________________________

**9.** Вызначце від сінтаксічнай сувязі слоў у выдзеленым у 3-м сказе словазлучэнні. Адказ запішыце.

______________________________

**10.** Знайдзіце ў 4-м сказе аднародныя члены. Якую сінтаксічную функцыю яны выконваюць? Адказ запішыце.

______________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце віды сувязі, якія спалучаюцца ў складаным сказе з наступнай схемай:

**[ ], [ ], (які...).**

1) Злучальная і падпарадкавальная;
2) бяззлучнікавая і злучальная;
3) бяззлучнікавая і падпарадкавальная;

4) бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная;
5) аднародная і неаднародная.

**2.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак:

1) Нядаўна прайшоў першы дождж, палі вызваліліся з-пад снегу, і рака выйшла з берагоў (*В. Вольскі*).
2) Булановіч хацеў нешта сказаць, але ў гэты момант узнялася заслона і пачалася сходка (*М. Зарэцкі*).
3) Сонца ўжо схавалася за горы, ад высокіх скал на бераг упалі доўгія чорныя цені, ад мора пацягнула халадком (*Я. Бяганская*).
4) Рэйдзіха ціха ўсхліпвала, а Ганна стаяла, бы скамянелая, і не ведала, што рабіць (*І. Чыгрынаў*).
5) Калі закончыліся танцы, Валянцін пайшоў услед за Элінай, каб праводзіць дадому (*М. Пазнякоў*).

**3.** Адзначце складаныя сказы з бяззлучнікавай і падпарадкавальнай сувяззю частак:

1) Збіраючы букет з летніх кветак, трэба быць вельмі асцярожным: калі сарваць кветку казяльца, можна апячыся! (*П. Грынчанка*).
2) Будзь толькі добры з лесам, шчырым, і ён пакажа табе ўсе свае таямніцы, шчыра падзеліцца багаццем, што хавае ад благога вока (*В. Хомчанка*).
3) Усе заціхлі, было чуваць, як за акном залапатаў па лісці дождж (*І. Пташнікаў*).
4) Некуды спяшаецца цягавітая мурашка, уверх па сцяблінцы паўзе спакойная божая кароўка, нястомна таўкуць мак дурнаватыя мошкі, якія зусім не думаюць пра тое, што вечарам, з першым павевам холаду, яны ўсе загінуць (*І. Навуменка*).
5) Па кутах кладуцца цені, за акном робіцца ўраз цёмна, і маленькія фігуркі знікаюць (*Э. Самуйлёнак*).

**4.** Адзначце складаныя сказы са злучальнай, падпарадкавальнай і бяззлучнікавай сувяззю частак:

1) Арган быў высока над намі, усе мы глядзелі туды, аднак усім, відаць, здавалася, што музыка жыла не тут, не пад гэтым скляпеннем (*Я. Брыль*).
2) Ногі трошкі зябнулі на падлозе, і дзяўчынка кінулася зноў у ложак, які не паспеў дзякуючы яе хітрасці астыць, і аж засмяялася ад шчасця, што цёпла, што на дварэ снег (*У. Караткевіч*).
3) Далёка над лясным краявідам, захутанае ў агнявы туман, заходзіла чырвонае сонца, на полі стала прахалодней, смага ўбавілася,

а дрымота, з якой Агееў змагаўся ўвесь час пад калючым кустом, зусім знікла (*В. Быкаў*).

4) На выгане пасвяцца гусі, спераду важна дыбае сярдзіты гусак, які сіпіць на кожнага, хто пасмее наблізіцца да чарады (*І. Навуменка*).

5) Уменне ткаць было абавязковым для кожнай сялянкі, і недарэмна асноўную частку пасагу дзяўчыны, што выходзіла замуж, павінны былі складаць тканыя вырабы: адзенне, пасцель, ручнікі, абрусы (*Я. Сахута*).

**5.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Пасажыраў у вагоне было няммога і Лабановіч пераходзіў ад аднаго акна да другога, каб разгледзець гэтую мясцовасць і хоць прыблізна адгадаць, дзе яго новая школа (*Я. Колас*).

2) Я зразумеў: малады афіцэр моцна перажывае з-за нечага, што адбылося на вайсковай службе (*М. Пазнякоў*).

3) Міналі дні, а душэўны неспакой не знікаў, нягледзячы на тое што Янка паправіўся, добра сябе адчуваў і рос здаровенькім (*Г. Марчук*).

4) Андрэйка ніколі не дазваляў, каб ім камандавалі дзяўчынкі: і ён нават крыху раззлаваўся (*Я. Бяганская*).

5) Час ад часу на гарачых папялішчах разрываліся снарады, якімі абстрэльвала горад марская эскадра, і тады велізарныя фантаны іскраў шугалі ў чорнае неба, рассыпаліся вогненнымі феерверкамі і падпальвалі ўсё, што яшчэ не гарэла... (*А. Шашкоў*).

## Тэкст да заданняў 6—10

(1) Хвалі б'юцца аб бераг, рака падмывае скалістыя кручы, сонца разагравае камень, а начная сцюжа рэзка астуджае яго, вада часткова растварае каменістыя схілы, пранікае ў камень. (2) Усе гэтыя працэсы вядуць да разбурэння горных парод, якія ўтрымліваюць кварц. (3) Ён вызваляецца, пераносіцца раўчукамі і рэкамі, ветрам — і ўтвараюцца радовішчы ***кварцавых пяскоў*** (*Паводле У. Бардона*).

**6.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Якія віды сувязі ў ім спалучаюцца? Адказ запішыце.

**7.** Выпішыце з 1-га сказа словы, у якіх першы гук — мяккі зычны.

**8.** Вызначце разрад ужытага ў 2-м сказе прыметніка. Адказ запішыце.

**9.** Вызначце від сінтаксічнай сувязі слоў у выдзеленым у 3-м сказе словазлучэнні. Адказ запішыце.

**10.** Знайдзіце ў 3-м сказе аднародныя члены. Якую сінтаксічную функцыю яны выконваюць? Адказ запішыце.

# Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне

## Варыянт 1

**1.** Адзначце, як можа перадавацца чужая мова:

1) у выглядзе слоў аўтара;
2) у выглядзе простай мовы;
3) у выглядзе ўскоснай мовы;
4) у выглядзе дзеясловаў маўлення і думкі;
5) у выглядзе дзеясловаў, якія абазначаюць эмоцыі, пачуцці.

**2.** Адзначце сказы, у якіх простая мова разрываецца словамі аўтара:

1) — Мы да Насці, — сказаў адзін з маладых людзей. — Яе паклікаць сюды можна? (*Р. Баравікова*).
2) — Гарачы суп, — моршчыцца Міколка (*М. Гіль*).
3) — А гэта думка добрая! — ажывіўся Мірон. — Гэтак і пачнём рабіць (*Я. Маўр*).
4) — Падумаеш, бараду адпусціў, — сказала маладзіца. — Барада нікому розуму не прыбавіла (*А. Раманаў*).
5) Толькі тата дзверы адчыніў, а Ігар яму насустрач: «Татка, татачка, я ўжо з вёскі прыехаў!» (*Д. Слаўковіч*).

**3.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх пастаноўка знакаў прыпынку адпавядае наступнай схеме:

**«П?» — а.**

1) Ну, дачка, ідзі сказала маці, калі да іх наблізілася медсястра (*В. Гігевіч*).
2) Давайце на Чорнае мора паедзем прапанавала Ала (*Б. Сачанка*).
3) Буйныя якія дзічкі сказаў Паўлюк, набіваючы рот (*У. Караткевіч*).
4) Ты куды гэта ўчора ездзіў замест прывітання спытаў старшыня (*А. Кудравец*).
5) Як жа ехаць па вадзе мільганула ў мяне трывожная думка (*І. Грамовіч*).

**4.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:

1) — Чакай, — сказаў Андрэй, — зараз будзе табе ўзнагарода (*У. Караткевіч*).

2) А дзед ужо казаў далей: «Ты не прымай усяго блізка да сэрца» (*У. Караткевіч*).

3) — Ура, — дружна гаркнулі хлопцы (*А. Жук*).

4) — Адставіць, — махнуў рукою Лёнька, павярнуўся да нас, сурова сказаў: — Цяпер наш камандзір — Вася Радкевіч (*А. Шашкоў*).

5) — А каму робяць аперацыю, — устрывожана запытаў я. — Не ведаеце? (*Я. Бяганская*).

**5.** Адзначце знак прыпынку, прапушчаны ў сказе з простай мовай:

— Мы цяпер удвух з Васем даглядаць цябе будзем, — сказаў каню Лёнька — Ты прывыкай да нас, прывыкай... (*В. Казько*).

1) Двукроп'е;
2) коска;
3) кропка;
4) пытальнік;
5) клічнік.

**6.** Замяніце простую мову ўскоснай:

Суседзі маёй маме гаварылі: «Віця твой, відаць, артыстам будзе...» (*В. Шніп*).

Адзначце сродак сувязі (злучнік ці злучальнае слова), выкарыстаны вамі ў дадзенай частцы:

1) што;
2) каб;
3) які;
4) ці;
5) калі.

## Тэкст да заданняў 7—10

(1) Непрыкметна для самога сябе Валодзя ўвайшоў у ролю лётчыка, выставіў перад сабою рукі, загудзеў, быццам матор, і пабег вакол стала.

(2) Касьян адышоў убок, паправіў акуляры і зарагатаў:

— Можна падумаць, што ты ляціш ужо.

(3) — Яшчэ не лячу, але буду лятаць, — спыніўся Валодзя і ўпэўнена сказаў — Можа, нават і ў космас палячу (*Паводле А. Пальчэўскага*).

**7.** Які знак прыпынку прапушчаны ў 3-м сказе? Адказ запішыце.

**8.** Выпішыце з тэксту фразеалагізм, які мае значэнне ‘натуральна, праўдзіва пераўвасобіўся’.

---

**9.** Выпішыце з 2-га сказа словы, якія маюць у сваім складзе прыстаўку.

---

**10.** Выпішыце з 3-га сказа дзеяслоў, ужыты ў форме будучага складанага часу.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце від складанага сказа, які нагадвае сказ з ускоснай мовай:

1) складаназлучаны сказ;
2) складаназалежны сказ;
3) бяззлучнікавы складаны сказ;
4) складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак;
5) ускладнены сказ.

**2.** Адзначце сказы, у якіх простая мова знаходзіцца перад словамі аўтара:

1) — Я разлічваю на сваю памяць, — буркнуў я і адчуў, што чырванею (*А. Бадак*).

2) — Пойдзем дадому, — пацягнула Яніна Антона за рукаў (*Л. Дайнека*).

3) Урэшце мне падказалі: «Ёсць месца ў гасцініцы рачнога порта» (*М. Вяршынін*).

4) — А ў гэтым кутку павінна быць рыба, — сказаў Віктар. — Вада спакойная (*Я. Маўр*).

5) — А ты, Ядвіська, калі ласка, заспявай, — звярнуўся пан падлоўчы да дачкі (*Я. Колас*).

**3.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх пастаноўка знакаў прыпынку адпавядае наступнай схеме:

**А: «П».**

1) Паглядзеў бацька на сына ўважліва і пытае Што рабіў ты ў полі (*П. Сіняўскі*).

2) Анютка едзе ды бурчыць Гэтак і за тыдзень дадому не дабярэшся (*М. Баскін*).

3) Разведчык без каманды высокага начальства закрычаў Баявая трывога (*І. Шамякін*).

4) Дзядзька Марцін сказаў аднойчы Андрэю Сёлета з сенам у нас, браце, скупавата (*Я. Колас*).

5) Сёння базарны дзень успомніў Алёшка (*М. Лынькоў*).

**4.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:

1) Валянціна Андрэеўна засмяялася: «А ты робішся галантным кавалерам» (*І. Шамякін*).

2) — За трыццаць кіламетраў ад Турава, — працягвае селянін, — і цяпер цячэ крынічка (*Г. Ланеўскі*).

3) — Ну, пасажыры, вылазьце! — пажартаваў нехта, — Прыехалі! (*В. Вольскі*).

4) Цалавацца на развітанне будзем? — пажартаваў Павел (*А. Наварыч*).

5) — Таварышы афіцэры, — падаў голас камбрыг і, дачакаўшыся, пакуль не заціхлі за дзвярыма цяжкія крокі генерала, дадаў: — Прыступайце да сваіх абавязкаў... (*А. Шашкоў*).

**5.** Адзначце знак прыпынку, прапушчаны ў сказе з простай мовай:

— Жэнька! Уставай, дачушка! — будзіць маці — Што гэта ты сабе думаеш? (*К. Крапіва*).

1) Двукроп'е;
2) коска;
3) кропка;
4) пытальнік;
5) клічнік.

**6.** Замяніце простую мову ўскоснай:

«Адкуль у цябе патроны?» — спытаў Дзёмін (*А. Кудравец*).

Адзначце сродак сувязі (злучнік ці злучальнае слова), выкарыстаны вамі ў дадзенай частцы:

1) што;
2) ці;
3) як;
4) адкуль;
5) калі.

### Тэкст да заданняў 7—10

(1) — Хадзем з намі гуляць у футбол, — запрасіў я Міцю.

(2) — Я не ўмею, — сказаў ён, крыху збянтэжыўся і ***нечакана*** прызнаўся: Мне нельга бегаць, бо я хварэю.

(3) — Дык ***пабудзь*** у нас за суддзю, — прапанаваў я.

(4) — Дзякую, — зноў адмовіўся Міця. — Я не ўмею судзіць, бо не ведаю правілаў (*Паводле Г. Далідовіча*).

**7.** Які знак прыпынку прапушчаны ў 2-м сказе? Адказ запішыце.

---

**8.** Знайдзіце ў тэксце сінонім да дзеяслова ***разгубіўся***. Запішыце слова ў пачатковай форме.

---

**9.** Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 2-м сказе слова. Адказ запішыце.

---

**10.** Вызначце лад выдзеленага ў 3-м сказе дзеяслова. Адказ запішыце.

---

# Кантрольная тэставая работа

## Варыянт 1

**1.** Адзначце від складанага сказа, у якім граматычныя часткі звязаны без злучнікаў і злучальных слоў:

1) складаназалежны;
2) складаназлучаны;
3) бяззлучнікавы;
4) няпоўны;
5) аднасастаўны.

**2.** Адзначце злучнікі, якія могуць з'яўляцца сродкамі сувязі частак складаназлучанага сказа:

1) аднак;
2) бо;
3) ды;
4) ці то — ці то;
5) калі — то.

**3.** Адзначце пытанні, на якія адказваюць дадзеныя акалічнасныя часткі меры і ступені:

1) які?
2) як многа?
3) як доўга?
4) у якой ступені?
5) якім чынам?

**4.** Адзначце складаназлучаныя сказы са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі:

1) На пагорку стаіць і яшчэ дрэмле вятрак, але, здаецца, ён ужо сіліцца ўзмахнуць паднятымі крыламі (*Я. Скрыган*).
2) Стаяў калісь тут бор стары, і жыў лясун у тым бары (*М. Багдановіч*).
3) То ціха, то рэзкі вецер (*В. Вольскі*).
4) Максім прысеў каля сабакі, а ён паглядзеў на хлопчыка сумнымі вачыма, выцягнуў шыю і лізнуў у твар (*А. Якімовіч*).
5) Хата нейкі час расчынена, і холад лянівым белым мядзведзем коціцца па падлозе (*А. Кудравец*).

**5.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) На кухні засвісцеў чайнік і мы перапынілі нашу размову (*А. Бадак*).

2) Вясной тут прытарна пахла чаромхавым цветам, і аж заходзіліся салаўі (*А. Кудравец*).

3) У канцы чэрвеня прайшлі шчодрыя летнія дажджы, а потым зноў наладзілася надвор'е (*Я. Колас*).

4) Я не мог напісаць аб усім і ўсіх, і хай яны мне прабачаць (*У. Караткевіч*).

5) Вада сцякла ў нізкія месцы і стаяла там, і ў ёй адлюстравалася хмарыстае неба (*К. Чорны*).

**6.** Адзначце прыказкі, якія па структуры адпавядаюць складаназалежным сказам:

1) Куды вецер вее, туды голле гнецца.

2) Надышоў пост — падагне і сабака хвост, бо ўжо косткі не абгрызе.

3) Прыйшла талака — лі па кубку малака.

4) Не вялікая бяда, што без рыбы серада.

5) Раскажаш пра вераб'я, а перакажуць пра жураўля.

**7.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка знаходзіцца ў сярэдзіне галоўнай:

1) Таму, хто даў такія назвы пасёлкам, варта было і прэмію прысудзіць (*Ф. Янкоўскі*).

2) Аднойчы я заплыла далёка-далёка, у зацішны куток возера, дзе ярка цвілі белыя лілеі (*М. Зарэмба*).

3) Таго, што было, не вернеш, не пераробіш (*Б. Сачанка*).

4) Вучні, якія былі ўжо ў школе, здзіўлена пaглядалі то на Міхаську, то на яго маці (*А. Якімовіч*).

5) Калі ўважліва прыгледзецца, на абодвух баках птушынай дзюбы можна ўбачыць ноздры (*А. Бадак*).

**8.** Адзначце складаназалежныя сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў:

1) Вера заўважала, што маці яе з гадамі рабілася ўсё больш набожнай (*Г. Марчук*).

2) На агародзе, дзе быў адведзены ўчастак пад новы дом, ляжалі кучы цэглы і пяску (*Д. Слаўковіч*).

3) Як толькі цягнік спыніўся, усе пасажыры рушылі на перон (*Я. Хвалей*).

4) Непадалёк ад Нарачы хаваецца ў густых лясах купка азёр, якія называюць Блакітнымі (*Н. Кісялёва*).

5) Асабліва прыгожа было, калі з двара свяціла ў хатку сонца (*Я. Брыль*).

**9.** Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі параўнальнымі часткамі:

1) Цьмяная смуга засцілае нізіну, нібы нейкі вялізны цень паўзе па адхонах (*Т. Хадкевіч*).

2) Сцяпан любіў глядзець на поле ўлетку, калі яно стаіць у калоссі (*А. Жук*).

3) Росы бываюць раніцаю такія халодныя, што аж дубеюць босыя ногі пастушкоў (*М. Лынькоў*).

4) Потым зноў і зноў пачуўся гучны трэск, як быццам нехта прадзіраўся праз зараснік (*Р. Баравікова*).

5) Перад грэбляй з вады вытыркаліся тры стажкі, нібы копы сена (*Я. Маўр*).

**10.** Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем дадзеных частак:

1) Я раскажу табе, як прыходзіць сюды вясна, як слаба і хвалююча пахнуць тады на дрэвах пупышкі, як чарнее сад на вечаровай ружовасці неба (*М. Стральцоў*).

2) Калі доўга назіраць за адным і тым жа ўчасткам неба, асабліва ў сярэдзіне жніўня, лістапада або снежня, можна ўбачыць, як метэоры з'яўляюцца на небе адзін за адным, веерам вылятаючы з аднаго месца (*У. Бардон*).

3) Валера ўстае, каб зачыніць дзверы, а заадно і паглядзець, што там у лазні (*А. Кудравец*).

4) Даніла яшчэ трошкі пастаяў, правёў позіркам Тамаша, які хутка знік у густым алешніку, і рушыў да чародак маладых бяроз, што бялелі наперадзе (*Р. Баравікова*).

5) Праўда, ёсць адна аўтаручка, якая захоўваецца ў мяне ўжо дваццаць гадоў і якой я цяпер пішу гэтыя радкі (*А. Бадак*).

**11.** Пабудуйце гарызантальную схему 3-га сказа з задання 10.

**12.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) І вось тут баба Прося ўпершыню задаволена ўсміхнулася, калі ўбачыла__ як у яе ўнучкі спрытна ходзяць рукі, месячы цеста (*Г. Марчук*).

2) Каб хлопчык трохі падцягнуўся__ настаўніца параіла часцей пісаць дыктанты дома (*В. Ткачоў*).

3) А вы чулі, што__ калі хто наглядзіцца ў азёрную ваду і памыецца ёю, дык прыгажэйшым становіцца? (*Г. Ланеўскі*).

4) Ад бярозы, што пад ветрам раз-пораз прыпадала да акна__ адарваўся і прыліп жоўты лісток... (*Г. Багданава*).

5) Калі сціхаюць самалёты, чуваць, як клепяць у вёсцы косы, бразгаюць у некага ля студні вёдры__ і кудахчуць на ўсё горла куры (*І. Пташнікаў*).

**13.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Якія ў вас дзверы нізкія — чуць шыю не звярнуў (*А. Кудравец*).

2) Я чысціў рыбу, Руслан абіраў бульбу, Валодзька збіраў галлё для кастра, дапамагаў ва ўсім (*М. Пазнякоў*).

3) Расплюшчыла Натка вочы, глядзіць — сонейка ў пакоі (*І. Сіняўскі*).

4) Радасна віталі новы дзень птушкі — звінелі ў вышыні жаваранкі, мітусіліся каля шпакоўніц у садах і над стрэхамі шпакі... (*І. Шамякін*).

5) Уздыхнуў Алёшка: давядзецца стрыгчыся (*Д. Слаўковіч*).

**14.** Адзначце складаныя сказы з бяззлучнікавай і падпарадкавальнай сувяззю частак:

1) Я нават узрадаваўся: ёсць магчымасць прайсці па знаёмых мясцінах, пабыць сам-насам з прыродай, якая памятае цябе яшчэ малечай (*М. Пазнякоў*).

2) Ляжыць гэты белы камень тут з незапамятных часоў, і старыя кажуць, што ад яго і назва вёскі пайшла — Белая (*А. Васілевіч*).

3) Падвал, у якім размяшчаўся штаб брыгады, быў надзвычай прасторны, з нізкай, літай з бетону столлю, якую надзейна, строга па адной лініі падпіралі масіўныя квадратныя калоны... (*А. Шашкоў*).

4) У калідоры стаяў мігатлівы паўзмрок: закаханыя парачкі, якія занялі падаконнікі і зацішныя куточкі на лесвіцы, загадзя паклапаціліся аб эканоміі электрычнага святла (*М. Зарэмба*).

5) Дзень выдаўся пагодлівы, сонечнае святло праз вокны з вітражамі напаўняла залу плямамі ўсіх колераў вясёлкі, а пад столлю ў святле, адбітым ад чырвонай мэблі і залацістага паркету, вітражным шклом у чырвона-залацістай гаме казачна гарэлі плафоны (*В. Карамазаў*).

**15.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Перад тым як сесці за стол, Міканор запрасіў і Васіля, але той адмовіўся (*І. Мележ*).

2) Мерна ўздрыгваў вагон, прыглушана гудзелі колы ды ў такт вагону хісталіся палахлівыя цені ад лаў, ад паліц, ад здранцвелых людзей, што спалі, храплі (*М. Лынькоў*).

3) Стомлена апусціліся моцныя спрацаваныя рукі, а пальцы, што цэлы дзень трымалі рукаяткі сахі яшчэ ніяк не могуць разагнуцца (*Я. Сахута*).

4) У гаспадарчых будынках глыбока ўздыхалі і варочаліся валы і час ад часу ржаў конь, якога нашы салдаты пакінулі ў час наступлення: ён тады быў паранены і вельмі слабы (*В. Казько*).

5) Памятаю, што, хоць і стаяў яшчэ люты, той дзень выдаўся на дзіва цёплы, адліжны, дзе-нідзе нават капала са стрэх (*Б. Сачанка*).

**16.** Пабудуйце вертыкальную схему 4-га сказа з задання 15.

---

### Тэкст да заданняў 17—20

(1) Усталявалася пагодная восень. (2) Раніцы былі халодныя і бліскучыя ад дробнага інею, што ўсцілаў зямлю, стрэхі і платы. (3) Але быў ён кволы і нетрывалы і знікаў адразу, калі ўзнімалася сонца. (4) Цёпла прыгравала сонейка, над полем плыло павуцінне. (5) Ланцужкі жураўлёў відней ліся ў небе, і адтуль чулася сумнае курлыканне (*Паводле А. Чарнышэвіча*).

**17.** Вызначце від 4-га сказа. Адказ запішыце.

---

**18.** Знайдзіце ў тэксце складаназлучаны сказ, вызначце сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж яго часткамі. Адказ запішыце.

---

**19.** Вызначце від дадзенай часткі ў 3-м сказе. Адказ запішыце.

---

**20.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце від складанага сказа, у якім граматычныя часткі звязаны пры дапамозе злучальных злучнікаў:

1) складаназалежны;
2) складаназлучаны;
3) бяззлучнікавы;
4) ускладнены;
5) двухсастаўны.

**2.** Адзначце злучнікі, якія могуць з'яўляцца сродкамі сувязі частак складаназалежнага сказа:

1) затое;
2) каб;
3) быццам;
4) як — так;
5) не то — не то.

**3.** Адзначце пытанні, на якія адказваюць дадзеныя акалічнасныя часткі спосабу дзеяння:

1) як?
2) якая?
3) пры якой умове?
4) з якой мэтай?
5) якім чынам?

**4.** Адзначце прыказкі, якія па структуры адпавядаюць складаназлучаным сказам:

1) Фурман добры, але коні не вязуць.
2) Гультай за работу — мазоль за руку.
3) Скажы кумцы па сакрэту, а кумка ўсяму свету.
4) Зямля — талерка: што пакладзеш, тое і возьмеш.
5) Калі бацька рыбак, то і дзеткі ў ваду глядзяць.

**5.** Адзначце складаназлучаныя сказы з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі:

1) Я паціху ішоў міма, а хлопчык, нібы той сланечнік, паварочваў следам за мной свой круглы тварык (*Я. Маўр*).

2) Ад лютай летняй спёкі гарыць сухі пясок, і пачарнеў далёкі нахмураны лясок (*П. Глебка*).

3) Ці жаўрук звінеў у небе, ці свістаў на ліпе шпак (*Ц. Гартны*).

4) Над хвалямі змагалася з ветрам адзінокая чайка, але вось і яна знікла кудысьці (*В. Вольскі*).

5) Саша пачырванела, і сэрца яе ўраз напоўнілася пяшчотай да гэтай добрай жанчыны (*І. Шамякін*).

**6.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Усе хваляць салаўя за голас, а самога артыста бачыў далёка не кожны (*А. Бадак*).

2) Беларускія вадаёмы з чыстай празрыстай вадой, багатыя рыбай, спадабаліся норкам, і цяпер іх можна сустрэць у многіх раёнах рэспублікі (*Б. Яфрэмаў*).

3) На прыпынках амаль ніхто не выходзіў, і ніхто не заходзіў (*Б. Пятровіч*).

4) Каля самага берага, праўда, было гразка але праз метры два дно цвярдзела і, здавалася, пахруствала пад нагамі (*В. Коўтун*).

5) Возьмеш у рукі такі каменьчык — і пальцы фарбуюцца ў рыжы колер (*І. Грамовіч*).

**7.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка знаходзіцца пасля галоўнай:

1) Лес, што акружаў леснічоўку, набыў таямніча-злавесны выгляд (*І. Шамякін*).

2) Настаўніца жыве ў адным толькі пакойчыку, акуратна і чысценька прыбраным, як умее прыбраць дзявочая рука (*Я. Колас*).

3) І хоць дзень быў шэры, сумны, на душы ў Дубровы трохі пасвятлела (*І. Капыловіч*).

4) Калі Аўдзею споўнілася шэсцьдзясят гадоў, яго ўрачыста праводзілі на пенсію (*М. Вяршынін*).

5) Канфлікт выбухнуў, калі мы селі есці (*А. Карпюк*).

**8.** Адзначце складаназалежныя сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе злучальных слоў:

1) Даніла лічыў сваю жонку адзінай разумніцай на ўсю ваколіцу, бо яна яго добра разумела (*З. Бядуля*).

2) Не пералічыць усёй разнастайнасці горных парод, з якіх складзена наша планета Зямля (*У. Бардон*).

3) У пятым класе мае аднакласнікі даведаліся, што я пішу вершы (*В. Шніп*).

4) Вера загадзя збочыла да бярозак, што дружным гуртам падступіліся да дарогі, спынілася... (*М. Зарэмба*).

5) Не памятаю я такога дня, каб дзед вяртаўся з Гарыні без рыбы (*Г. Марчук*).

**9.** Адзначце складаназалежныя сказы з дададзенымі акалічнаснымі ўступальнымі часткамі:

1) Снег быў пругкі і хрусцеў задушаным стогнам пад кожным крокам, хоць Салавей стараўся ступаць асцярожна і нячутна (*З. Бядуля*).

2) Ах, як хацелася пабачыць поезд, пра які расказвалі столькі цудаў! (*І. Шамякін*).

3) Для таго каб прывабіць птушак, трэба стварыць спрыяльныя ўмовы для іх жыцця (*Б. Яфрэмаў*).

4) Дарогі пачыналі прасыхаць, хоць у паветры вісеў мяккі, павясноваму сыры туман (*А. Мрый*).

5) Іра і свіней пасвіла, і двор падмятала, і мыла падлогу, і Юрку карміла, калі яны толькі ўдваіх былі дома (*Я. Брыль*).

**10.** Адзначце складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем дададзеных частак:

1) У Маскве была кнігарня «Дружба», дзе прадаваліся кнігі, што выходзілі ў выдавецтвах усяго свету (*В. Шніп*).

2) Нешта прыемна-балючае цягнула нас на тыя мясціны, дзе стаяла баржа Сцяпана, дзе мы вудзілі рыбу і бестурботна плюхаліся да вечара ў цёплай вадзе (*Г. Марчук*).

3) Калі Раман сказаў бацьку, што хоча ажаніцца з Надзяй, той доўга маўчаў (*А. Чарнышэвіч*).

4) Высах і ручаёк у Шапчынскім бары, ля якога я так любіў сядзець, калі мне было невыносна сумна... (*Б. Сачанка*).

5) Калі Віктар выбраўся на купчастую балоцістую палянку, дык убачыў, што Мірон схіліўся над журавінамі (*Я. Маўр*).

**11.** Пабудуйце гарызантальную схему 5-га сказа з задання 10.

---

**12.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Каб не быць заўважанымі нямецкімі часавымі__ Міколка з рабочымі прабіраўся каля вагонаў, хаваючыся ў іх доўгім цені (*М. Лынькоў*).
2) Вераніка ўскочыла, прабіла талон, села на пустое месца і__ калі аўтобус крануўся, пачала разглядаць у акно дамы (*Я. Хвалей*).
3) Асабліва падабаўся нам выкладчык замежнай літаратуры, які насіў вусы і клінападобную бародку__ і які любіў усё супастаўляць, параўноўваць... (*Б. Сачанка*).
4) Я вельмі ганарыўся незвычайным суседам__ хоць і адчуваў, што яму не надта падабаецца тое, што ў вёсцы паявіўся яшчэ адзін сякі-такі музыка (*А. Кулакоўскі*).
5) Мая мама кажа, што__ калі пачынаюць сніцца сваякі-нябожчыкі, гэта яны хочуць, каб пра іх згадалі такім чынам (*Р. Баравікова*).

**13.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Дождж ідзе праменісты і дробны, пахнуць мятай мокрыя лугі (*П. Панчанка*).
2) У будынку тэатра панавала паўцемра — рэдка-рэдка дзе бясконцыя калідоры асвятляліся свечкамі ў жырандолях (*У. Караткевіч*).
3) Скрозь было чыста, дагледжана і цемнавата: вокны знадворку напалову затулялі галіны старых зазелянелых дрэваў (*В. Быкаў*).
4) Праз гадзіну вецер сціх — гром змоўк, маланкі перасталі разрываць цёмнае неба (*В. Вольскі*).
5) Аўтобус страсяне — абарвуцца думкі (*В. Адамчык*).

**14.** Адзначце складаныя сказы з бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю частак:

1) Цёмныя ночы тояць нейкі ўрачысты спакой, і неба ніжэй нахіляецца да зямлі, каб падслухаць яе адвечную скаргу (*Я. Колас*).
2) Над лугам пырхалі лёгкія матылькі, гулі пчолы, выцалоўваючы званочкі кветак, а ў сонечным пераліве заліваліся радасцю жаваранкі (*А. Камароўскі*).

3) Ціха было, непрывычна, не шумела галькаю хваля, і недзе далёка, за санаторыем, абзываўся горад сігналамі машын, гулам матораў (*А. Жук*).

4) Маці спачатку засмяялася ад нечаканасці, а потым на твары яе з'явіўся неспакой, сінявата-шэрыя, стомленыя вочы трывожна ўставіліся на дзяўчынку (*А. Кулакоўскі*).

5) Рэзка і пранізліва празвінеў званок, вучні ўздрыгнулі ад нечаканасці, але не кінуліся з класа, наадварот, уражаныя пачутым, сцішыліся (*А. Наварыч*).

**15.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Нечакана з цёмнага неба пайшоў дождж, наляцеў густы вільготны вецер і Вера надумала вярнуцца, але самалюбства прызнанай у вёсцы рыбачкі клікала наперад (*В. Коўтун*).

2) Можа, з гадзіну цягнулася навальніца і ішоў такі праліўны дождж, што, здавалася, мог заліць любы пажар (*Я. Маўр*).

3) У гэты момант дзяўчынка падкінула ўгору тое, што трымала ў руках і ў паветры паплылі тры зялёныя шары (*В. Хомчанка*).

4) На дварэ гуляе мяцеліца, а ў мяне ў пакоі восенню пахне: на стале, у тонкай крыштальнай вазачцы, лісце (*Р. Ігнаценка*).

5) Мірон уважліва паглядзеў на свайго таварыша і толькі цяпер заўважыў, як той змяніўся за гэты час: не толькі шчокі, але і нос, і рот, і нават вочы здаваліся не тымі (*Я. Маўр*).

**16.** Пабудуйце вертыкальную схему 5-га сказа з задання 15.

---

## Тэкст да заданняў 17—20

(1) Вёска Збляны, якая знаходзіцца ў Зэльвенскім раёне Гродзенскай вобласці, з'яўляецца радзімай Антона Раманавіча Жэбрака. (2) Сялянскі хлопец прагнуў вучыцца. (3) Пасля заканчэння школы ён паступіў у знакамітую Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева. (4) Пройдуць гады, і выхадзец з вёскі Антон Раманавіч Жэбрак стане акадэмікам, прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі. (5) Ён уздымецца на такую вышыню ў навуцы, што з ім будуць лічыцца ўсе генетыкі свету (*Паводле У. Ліпскага*).

**17.** Вызначце від 5-га сказа. Адказ запішыце.

**18.** Знайдзіце ў тэксце складаназлучаны сказ, вызначце сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж яго часткамі. Адказ запішыце.

**19.** Вызначце від даданай часткі ў 1-м сказе. Адказ запішыце.

**20.** Вызначце тып тэксту. Адказ запішыце.

# 10 КЛАС

## Маўленне

### Варыянт 1

**1.** Адзначце віды маўленчай дзейнасці:

1) слуханне;
2) чытанне;
3) выступленне;
4) пісьмо;
5) гаварэнне.

**2.** Адзначце віды сувязі сказаў у тэксце:

1) сузалежная;
2) паслядоўная;
3) злучальная;
4) падпарадкавальная;
5) паралельная.

**3.** Адзначце структурныя кампаненты, характэрныя для тэксту-апісання:

1) тэзіс;
2) пачатак дзеянняў, падзей;
3) агульнае ўражанне аб прадмеце;
4) прыметы прадмета;
5) ацэнка прадмета.

**4.** Адзначце вызначальныя рысы навуковага стылю маўлення:

1) лагічнасць выкладу;
2) дакладнасць і аб'ектыўнасць;
3) эмацыянальнасць;
4) высокая ступень стандартызацыі;
5) абагульненасць і абстрагаванасць.

**5.** Адзначце моўныя сродкі, уласцівыя гутарковаму стылю маўлення:

1) выклічнікі;
2) сказы з дзеепрыметнікавымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі;
3) няпоўныя сказы;
4) эмацыянальна-экспрэсіўная лексіка;
5) абстрактная лексіка.

### Тэкст да заданняў 6—10

(1) Беларуска-ўкраінскія культурныя сувязі маюць даўнія і трывалыя традыцыі. (2) Падмурак іх — не толькі ў этнічнай блізкасці беларусаў і ўкраінцаў, але і ў працяглым жыцці нашых продкаў у адных і тых жа дзяржаўных утварэннях: Кіеўскай Русі, Вялікім Княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, ***СССР***. (3) Агульнасць гістарычнага лёсу і цяпер прадвызначае асаблівую духоўную роднасць беларускага і ўкраінскага народаў (*Паводле В. Рагойшы*).

**6.** Выкарыстоўваючы словы з тэксту, падбярыце загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту. Запішыце яго.

___

**7.** Выпішыце з тэксту слова, якое з'яўляецца сродкам сувязі 1-га і 2-га сказаў.

___

**8.** Вызначце стыль і тып тэксту. Адказ запішыце.

___

**9.** Знайдзіце ў тэксце няпоўны сказ. Які член сказа ў ім апушчаны? Адказ запішыце.

___

**10.** Вызначце род выдзеленага ў 2-м сказе складанаскарочанага слова. Адказ запішыце.

______________________________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце від маўлення, які ўяўляе сабой паслядоўнасць узаемазвязаных рэплік:

1) вуснае маўленне;
2) пісьмовае маўленне;
3) дыялагічнае маўленне;
4) маналагічнае маўленне;
5) гаварэнне.

**2.** Адзначце прыметы тэксту:

1) сэнсавая цэласнасць;
2) пісьменнасць;
3) тэматычнае адзінства;
4) звязнасць;
5) завершанасць.

**3.** Адзначце структурныя кампаненты, характэрныя для тэксту-разважання:

1) агульнае ўражанне аб прадмеце;
2) тэзіс;
3) развіццё дзеянняў, падзей;
4) доказы;
5) вывады.

**4.** Адзначце жанры публіцыстычнага стылю маўлення:

1) інтэрв'ю;
2) заява;
3) навуковы артыкул;
4) рэпартаж;
5) аратарскае выступленне.

**5.** Адзначце моўныя сродкі, уласцівыя афіцыйнаму стылю маўлення:

1) навуковыя тэрміны;
2) канцылярскія штампы;
3) параўнанні;
4) эмацыянальна-экспрэсіўная лексіка;
5) складанаскарочаныя словы.

## Тэкст да заданняў 6—10

Толькі ў самым канцы сакавіка з'явіліся першыя прыкметы вясны. Пасвятлела неба, у павевах ветру адчуваліся мяккасць і цеплыня... Снег, які не паспеў яшчэ знікнуць, хлюпаў пад нагамі і раставаў. У небе прарэзліва крычалі вароны, па-свойму вітаючы прыход вясны (*У. Гніламёдаў*).

**6.** Выкарыстоўваючы словы з тэксту, падбярыце загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту. Запішыце яго.

---

**7.** Вызначце від сувязі сказаў у тэксце. Адказ запішыце.

---

**8.** Вызначце стыль і тып тэксту. Адказ запішыце.

---

**9.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ. Вызначце від даданай часткі. Адказ запішыце.

---

**10.** Знайдзіце ў тэксце прыслоўе, утворанае ад займенніка. Вызначце спосаб словаўтварэння. Адказ запішыце.

---

# Слова ў тэксце

## Варыянт 1

**1.** Адзначце словы, якія пачынаюцца з мяккага зычнага гука:

1) цёмны;
2) чацвер;
3) ясень;
4) звязаць;
5) схіл.

**2.** Адзначце пары словазлучэнняў, у якіх ужыты амонімы:

1) ланцуг якара — электрычны ланцуг;
2) царкоўны пост — стаць на пост;
3) уважлівыя слухачы — слухачы ваеннай акадэміі;
4) вясёлая кампанія — пасяўная кампанія;
5) парушэнне дысцыпліны — хіміка-біялагічныя дысцыпліны.

**3.** Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:

1) хлебазавод;
2) хлебарэзка;
3) першачарговы;
4) першынство;
5) высокаразвіты.

**4.** Адзначце назоўнікі жаночага роду:

1) дзіця;
2) гусь;
3) подпіс;
4) ВНУ;
5) Нарач.

**5.** Адзначце састаўныя колькасныя лічэбнікі:

1) трыста восемдзесят пяты;
2) шэсцьдзясят;
3) сорак дзевяць;
4) чатыры цэлыя і сем дзясятых;
5) дваццаць.

**6.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ужываецца ***ні***:

1) Даўным-даўно, калі не было на свеце ___ тваёй бабы, ___ яе дзеда, ___ дзедавага дзеда, жылі на гэтай гары людзі (*В. Хомчанка*).

2) ___ адзін раз уступаў ці ўрываўся Міканор у гаворкі, якія ўсё ж часцей высвятлялі не праблемы свету, а, калі можна сказаць, праблемы Куранёў (*І. Мележ*).

3) Здаецца, ___ разу не было таго ў нашым сяле, што дзеецца цяпер у гэтай хаце... (*М. Гарэцкі*).

4) Мы самі ___ на кога не нападалі, ___ з кім не пачыналі войнаў (*Я. Сіпакоў*).

5) ___ шукай ты шчасця, долі на чужым, далёкім полі... (*Я. Купала*).

**Тэкст да заданняў 7—10**

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной ***стаяць***,
У небе зоркі, ад марозу
Пахаладзеўшыя, дрыжаць (*М. Багдановіч*).

**7.** Знайдзіце ў тэксце якасны прыметнік. Утварыце ад яго простую форму найвышэйшай ступені параўнання. Адказ запішыце ў пачатковай форме.

___

**8.** Ад выдзеленага дзеяслова ўтварыце і запішыце форму загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку.

___

**9.** Знайдзіце ў тэксце дзеепрыметнік, замяніце ў ім суфікс так, каб дзеепрыметнік адпавядаў сучаснай марфалагічнай норме. Адказ запішыце ў пачатковай форме.

___

**10.** Выпішыце з тэксту прыназоўнік, які выражае прычынныя адносіны паміж назоўнікам у родным склоне і дзеясловам.

___

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словы, пры вымаўленні якіх адбываецца асіміляцыя шыпячых зычных гукаў да свісцячых:

1) зжаўцець;
2) хвалюешся;
3) парыжскі;
4) матчын;
5) у лыжцы.

**2.** Адзначце фразеалагізмы, якія маюць значэнне ‘гаварыць абы-што, выдумляць’:

1) часаць языком;
2) востры на язык;
3) плесці кашалі з лапцямі;
4) абуць у лапці;
5) араць дарогі.

**3.** Адзначце словы з невытворнымі асновамі:

1) пустыня;
2) калектыў;
3) гаворка;
4) серада;
5) звычай.

**4.** Адзначце неадушаўлёныя назоўнікі:

1) мікроб;
2) дамавік;
3) пешка;
4) студэнцтва;
5) лялька.

**5.** Адзначце словазлучэнні з лічэбнікамі мужчынскага роду:

1) сёмы паверх;
2) дванаццаць фламастараў;
3) два кілаграмы;
4) паўтара года;
5) шасцёра афіцэраў.

**6.** Адзначце адмоўныя займеннікі:

1) нешта;
2) нічый;

3) чый-небудзь;
4) не;
5) ніколькі.

### Тэкст да заданняў 7—10

Замаўкаюць птушыныя звонкія спевы,
Калі восень прыходзіць у край наш лясны,
І, як свечкі, вакол ярка ***ўспыхваюць*** дрэвы
На праводзінах лета, на памінках вясны (*А. Куляшоў*).

**7.** Знайдзіце ў тэксце дзеяслоў 2-га спражэння. Утварыце ад яго форму загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку. Адказ запішыце.

___

**8.** Ад выдзеленага дзеяслова ўтварыце і запішыце дзеепрыслоўе.

___

**9.** Знайдзіце ў тэксце прыслоўе, утворанае ад якаснага прыметніка. Утварыце ад яго простую форму вышэйшай ступені параўнання. Адказ запішыце.

___

**10.** Выпішыце з тэксту падпарадкавальны часавы злучнік.

___

# Словазлучэнне і сказ у тэксце

## Варыянт 1

**1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі — кіраванне:

1) захапляцца краявідамі;
2) сёмы параграф;
3) спяваць утрох;
4) працаваць без адпачынку;
5) шчыра дзякаваць.

**2.** Адзначце сказы з аднароднымі азначэннямі (знакі прыпынку не пастаўлены):

1) Вавёрка адшукала буйны закруглены жолуд (*Д. Слаўковіч*).
2) За возерам выйшлі да парку замглёнага сцішэлага (*А. Жук*).
3) Маруда прынізіў струмень вады і паласнуў ім па рыжай ужо здранцвелай пад лёгкім марозам гліне (*В. Казько*).
4) Каштанавыя іскрыстыя пад сонцам валасы хлопца ляжалі буйнымі хвалямі (*У. Караткевіч*).
5) Дым быў горкі кіслы (*М. Лынькоў*).

**3.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:

1) ***Малаком запіўшы вячэру*** мы дзякуем за баравічкі Сярожку, дзякуем Еўдакіі Рыгораўне і падымаемся з-за стала (*В. Карамазаў*).
2) Падлоўчы хадзіў ***перавальваючыся***, і здавалася, што яму вельмі было цяжка падымаць ногі (*Я. Колас*).
3) Вакол свечкі ***сашчапіўшы рукі на грудзях і прыціснуўшы локці да бакоў*** расхаджваў нейкі кудлаты чалавек і нешта мармытаў (*А. Наварыч*).
4) Сядзець ***склаўшы рукі*** было сумна (*У. Разумневіч*).
5) Пачуўся званок, і Серж горда ўвайшоў у клас ***з усмешкай паглядаючы на ўсіх*** (*К. Чорны*).

**4.** Адзначце сказы з устаўнымі канструкцыямі:

1) Там, у Парыжы і Ліёне, паспяхова прайшлі мастацкія выстаўкі «Беларускі нацыянальны касцюм», арганізаваныя вядомым фальклярыстам, прафесарам Міхасём Раманюком (*Я. Сіпакоў*).
2) Старая алешына з колам на вяршку (мусіць, зацягнуў Марцін для буслоў, але на ім крычалі, аж давячыся, вароны) берагла гэты грудок ад паводкі (*В. Адамчык*).

3) Гаспадара не чуваць (застаўся на ганку?), і ўсё бліжэй, бліжэй да пуні гаспадыніны крокі... (*М. Стральцоў*).

4) Немец зноў, відаць, не зразумеў сэнсу слова... (*В. Быкаў*).

5) Лес стаяў заінелы, пусты і халодны, як парожняя пуня (*І. Пташнікаў*).

**5.** Адзначце складаназлучаныя сказы:

1) У грудзях Васілька стала прыемна і цёпла, быццам улілася туды жывая вада (*В. Хомчанка*).

2) У кабінет з чародкай вучняў увайшла Вольга, зірнула на Насцю, потым на дошку і села за свой стол праз адзін рад ад Насці (*Р. Баравікова*).

3) А вечарамі храбусцелі льдзінкі ў лужынах і востра пахла зямлёй, мазутам і каменным вугалем (*М. Лынькоў*).

4) Слых у леапарда тонкі, а сон лёгкі і чуйны (*В. Вольскі*).

5) Прырэчная імшарына разам з ракой крута паварочвала ўбок, наперадзе між кустоўя засінеўся хвойны грудок, і Хведар Роўба запаволіў хаду, гатовы зусім спыніцца (*В. Быкаў*).

**6.** Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі дапаўняльнымі часткамі:

1) Валянцін Васільевіч папрасіў, каб нам прынеслі па кубку гарбаты (*А. Бароўскі*).

2) Зачыніў Алесь дзверцы ў печцы, каб галавешка на падлогу не вывалілася, за стол сеў і пачаў задачы рашаць (*А. Якімовіч*).

3) Хоць матрац быў спружынны і змякчаў падзенне, усе стараліся скокнуць як мага далей, на падушкі (*М. Янчанка*).

4) Мірон адчуў, што тут яго ўжо даўным-даўно перасталі чакаць (*А. Кудравец*).

5) Стаяў Андрэй у лесе, глядзеў на пралескі, што, нібы кавалачкі неба, сінелі тут і там, любаваўся імі (*Б. Сачанка*).

## Тэкст да заданняў 7—10

(1) Раптам па-за кустамі ціхенька хруснула. (2) Уздрыгануліся хлопцы, азірнуліся __ у кустах стаіць казуля, зграбная, прыгожая. (3) Задраўшы галаву з невялікімі рагамі, на якіх было па два атожылкі, яна скубла маладыя парасткі, і на шыі яе відаць была белая пляма. (4) Кожны момант яна азіралася, уздрыгвала і была гатова знікнуць (*Я. Маўр*).

**7.** Знайдзіце ў тэксце аднасастаўны сказ. Вызначце яго від. Адказ запішыце.

---

**8.** Які знак прыпынку прапушчаны ў 2-м сказе? Адказ запішыце.

---

**9.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Адзначце віды сувязі, якія ў ім спалучаюцца:

1) злучальная і падпарадкавальная;
2) бяззлучнікавая і злучальная;
3) бяззлучнікавая і падпарадкавальная;
4) бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная;
5) паслядоўная і сузалежная.

**10.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх парушаны граматычныя нормы:

1) хворы на ангіну;
2) дзякаваць сяброў;
3) даглядаць за куранятамі;
4) жартаваць над аднакласнікам;
5) ажаніцца са Святланай.

**2.** Адзначце сказы з састаўнымі іменнымі выказнікамі:

1) Дзядзька Пятрусь быў жартаўнік (*Я. Брыль*).
2) А лес зрабіўся сівым і паважным (*З. Бядуля*).
3) А пушча не сунімалася, стагнала, гула, бушавала, плакала злосным плачам, выла гневам і нянавісцю (*Я. Колас*).
4) Крэсла вялікае, прасторнае (*Д. Слаўковіч*).
5) Ляснік і дзяўчынка пачалі збіраць падарункі старога дуба і акуратна ссыпаць іх у дупло (*Д. Слаўковіч*).

**3.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:

1) Радавы Блін стаяў ***анямелы*** (*А. Шашкоў*).
2) ***Апанаваны пэўнаю мэтай*** я пабрыў па дарозе на ўсход (*В. Быкаў*).

3) Лёгкі і цёплы ветрык пагойдвае галінкі ***ўпрыгожаныя ярка-зялёнымі лістамі*** (*Б. Яфрэмаў*).

4) ***Стомленыя днём і работай*** адпачывалі лётчыкі (*М. Лынькоў*).

5) Пад яблынямі ў садзе стаялі ***збітыя з дошак*** сталы і лавы... (*А. Жук*).

**4.** Адзначце сказы з пабочнымі канструкцыямі (знакі прыпынку не пастаўлены):

1) Іду ўзбярэжжам Свіцязі і здаецца наступаю на сляды самога Адама Міцкевіча (*У. Ліпскі*).

2) Густы сасновы лес здаецца бясконцым (*Я. Сахута*).

3) Юнак зусім разгубіўся нават адступіў нібы хацеў схавацца за спіны іншых (*І. Шамякін*).

4) Вецер гэта як сцвярджаюць даведнікі ўсяго толькі рух паветра над зямной паверхняй (*Я. Сіпакоў*).

5) На шчасце ветрык падзьмуў у другі бок (*Я. Маўр*).

**5.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:

1) Дзе ты ***зорка мая прамяністая*** за якія ты хмары скацілася? (*А. Русак*).

2) ***Вы*** пражылі жыццё, многа чаго бачылі, ведаеце (*Б. Сачанка*).

3) Моцна кахаў я цябе ***дарагая*** але расстацца нам час (*М. Багдановіч*).

4) ***Ты*** таксама каля мамы ціха-ціхенька ляжы (*Г. Бураўкін*).

5) Зазвані моцна ***звон*** загудзі, каб пачулі цябе на ўвесь край... (*М. Чарот*).

**6.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Чую: гавораць двое (*Ф. Янкоўскі*).

2) Святлелі дахі дамоў: празрыста-зялёнымі рабіліся вяршыні бяроз у блізкім парку (*М. Лынькоў*).

3) Спадзяваўся парадавацца прыемным паэтычным набыткам, свежым, яркім сучасным вершам — не атрымалася (*М. Пазнякоў*).

4) Коні з храпам задзіралі галовы, у чыстым паветры далёка разносіліся выкрыкі хлопцаў, стралялі з-пад капытоў камякі снегу (*А. Кажадуб*).

5) У грудзях зашчымела ад нядобрага прадчування — з Васілём нешта здарылася! (*І. Мележ*).

**Тэкст да заданняў 7—10**

Ліда ўзяла з паліцы падручнік і села каля стала. Паспрабавала чытаць, але гоман хлапчукоў, што даносіўся з кабінета Андрэя Іванавіча, развейваў увагу. Тады ўстала, шчыльней прычыніла дзверы, села зноў і затуліла далонямі вушы. Дзяўчынка так паглыбілася ў кніжку, што не чула, як бабуля ўпусціла Віцю, які падкраўся і закрыў ёй вочы рукамі (*Паводле А. Пальчэўскага*).

**7.** Знайдзіце ў тэксце просты няпоўны сказ. Які член сказа ў ім апушчаны? Адказ запішыце.

---

**8.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі. Вызначце від падпарадкавання. Адказ запішыце.

---

**9.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Адзначце віды сувязі, якія ў ім спалучаюцца:

1) злучальная і падпарадкавальная;
2) бяззлучнікавая і злучальная;
3) бяззлучнікавая і падпарадкавальная;
4) бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная;
5) паслядоўная і сузалежная.

**10.** Вызначце тып тэксту. Адказ запішыце.

---

# Кантрольная тэставая работа

## Варыянт 1

**1.** Адзначце словы, пры вымаўленні якіх адбываецца асіміляцыя свісцячых зычных гукаў да шыпячых:

1) на вяровачцы;
2) счапіцца;
3) зжыцца;
4) падчас;
5) разносчык.

**2.** Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:

1) ***выбух*** смеху;
2) ***струмень*** вады;
3) ***ноты*** незадавальнення;
4) ***малюнкі*** вучняў;
5) ***крыніца*** даходаў.

**3.** Адзначце фразеалагізмы, якія маюць значэнне 'лісліва дагаджаць каму-небудзь':

1) рассыпацца дробным макам;
2) распускаць хвост;
3) слацца лістам;
4) ламаць шапку;
5) адпускаць лейцы.

**4.** Адзначце словы, у якіх выдзеленыя суфіксы з'яўляюцца формаўтваральнымі:

1) майстэр***ств***а;
2) майстрава***л***і;
3) змайстрава***ўшы***;
4) смял***ей***;
5) смел***асць***.

**5.** Адзначце рэчыўныя назоўнікі:

1) анальгін;
2) хвароба;
3) сталь;

4) мука́;
5) калоссе.

**6.** Адзначце простыя лічэбнікі:

1) чатырыста;
2) пяцёра;
3) васьмідзясяты;
4) шаснаццаць;
5) дваццаць адзін.

**7.** Адзначце прыклады, у якіх займеннікі ўжыты правільна:

1) дзякаваць табе;
2) маяго сябра;
3) не дапамог нікому;
4) упэўнены ў сябе;
5) купілі саміх дарагіх цукерак.

**8.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў:

1) Шніцаль смачней за адбіўную.
2) У пакоі было халадней, чым на вуліцы.
3) Цяжэй за ўсё было здаць залік па хіміі.
4) За горадам аўтобус паехаў больш хутчэй.
5) Наша спартыўная каманда мацнейшая вашай.

**9.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы — злучнікі:

1) Я адчуў, ***як*** у мяне загарэліся шчокі (*В. Адамчык*).

2) ***Ні*** дзеці, ***ні*** бабуля, відаць, не бачылі нас (*Ф. Янкоўскі*).

3) У душы ***нават*** успыхнула ўрачыстае прадчуванне перамогі (*А. Жук*).

4) Між глыбокіх снягоў, ***дзе*** лес глуха шуміць, ціхі дом леснікоў адзінока стаіць (*Я. Колас*).

5) У дзвярах быў механічны званок, ***аднак*** Алесь чамусьці не адважыўся крутануць яго... (*І. Шамякін*).

**10.** Адзначце прыклады, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:

1) пасля вячэры;
2) паедзем паслязаўтра;
3) будзе рамантаваць;
4) рамантаваць веласіпед;
5) самы яркі.

**11.** Адзначце аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы:

1) У лузе было пуста і бязлюдна (*Я. Колас*).

2) Нехта аддаў раўніну ў лапы ночы і дажджу (*У. Караткевіч*).

3) Маладымі ліпкамі сёлета высадзілі ўвесь наш квартал (*С. Міхальчук*).

4) Ігралі павольнае танга (*А. Жук*).

5) Слухаць дзеду горка бабіну гаворку (*А. Якімовіч*).

**12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) У пакоі стаяў вялікі самаробны стол__ засланы белым палатняным абрусам (*Б. Сачанка*).

2) Дзед дастаў з кішэні__ загорнуты ў паперу__ акраец хлеба (*Д. Слаўковіч*).

3) Загорнутая ў газетную паперу__ на лаўцы каля сцяны ляжала маленькая кніжачка (*Я. Колас*).

4) На паплавах узвышаліся__ крыху парыжэлыя ад дажджу і ветру__ стагі... (*І. Гурскі*).

5) Мы будзем часта і падоўгу купацца, будзем__ знясіленыя__ ляжаць на беразе... (*М. Стральцоў*).

**13.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:

1) ***Словам*** не такі ўжо я малады, як быў некалі (*Б. Сачанка*).

2) Агееў паляжаў трохі, у думках злым ***словам*** памінаючы гэтую дзяўчыну... (*В. Быкаў*).

3) Вёскі цягнуцца ***амаль*** неразрыўным ланцугом, дружна чапляючыся адна за адну... (*Я. Брыль*).

4) Жанчынам ***мабыць*** стала шкада юнака (*І. Шамякін*).

5) — Прыбірай ***Паўлінка*** ўжо са стала! (*Я. Купала*).

**14.** Адзначце складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) Ледзь селі за стол — вароты рыпнулі (*В. Карамазаў*).

2) У гэты спакойны і не па-асенняму ціхі вечар я доўга думаў над тым, што чакае мяне ў павеце і вырашыў ні ў якім разе не затрымлівацца там (*У. Караткевіч*).

3) Вясёлы настрой пакінуў Ядвісю і яна засталася маўкліваю, замкнёнаю (*Я. Колас*).

4) Ззаду плескатала рака і шасталі лазнякі, прымаючы першы плыт (*М. Лупсякоў*).

5) Дзядзька Ігнат казаў праўду: ноччу быў дождж (*М. Стральцоў*).

**15.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак:

1) У самы глухі куток пад ложкам, куды нават венік служанкі Насты рэдка калі зазіраў, складаў Міхалка розныя прыпасы на дарогу, бо ён задумаў уцякаць адгэтуль (*Я. Колас*).

2) Плылі ў вясновую сінь за акно мяккія акорды, уздыхала мора, і, можа заслухаўшыся гэтай музыкай вясны і надзей, не падавалі свайго голасу гарматы... (*І. Навуменка*).

3) Я адчуваў нейкую няёмкасць: маўчаць нязручна, гаварыць няма аб чым (*Э. Луканскі*).

4) Фіранкі звісалі ў гародчык, лёгкі ветрык час ад часу развейваў іх, і тады можна было ўбачыць твар нечым заклапочанага гісторыка, схіленага над кнігамі (*А. Наварыч*).

5) У той момант, калі ўсе згодна замоўклі, мачыха дала знак Ганне, і тая дастала са скрыні ручнік, падала сватам, Глушаку старому і Яўхіму (*І. Мележ*).

## Тэкст да заданняў 16—20

(1) Пристань шырокая, доўгая, роўная, прасторная. (2) У два рады пастаўлены тут лаўкі на роўнай адлегласці адна ад другой, каб было дзе пасядзець у добрае надвор'е людзям, калі прытомяцца шпацыруючы. (3) Прыстань моцна сціскае левы бераг глыбокай і спакойнай Піны. (4) Яе халодныя струмені ціха ўсхліпваюць, б'ючыся аб гладкі каменны бераг, злёгку пакалыхваюць параходы і параходзікі... (*Паводле Я. Коласа*).

**16.** Знайдзіце ў 4-м сказе дзеепрыслоўе, вызначце яго трыванне. Адказ запішыце.

---

**17.** Адзначце, чым ускладнены 4-ы сказ:

1) аднароднымі членамі;
2) пабочным словам;
3) адасобленым азначэннем;
4) адасобленай акалічнасцю;
5) параўнальным зваротам.

**18.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ з некалькімі дадзенымі часткамі. Вызначце від падпарадкавання. Адказ запішыце.

---

**19.** Выпішыце з тэксту слова, якое з’яўляецца сродкам сувязі 1-га і 2-га сказаў.

---

**20.** Вызначце стыль і тып тэксту. Адказ запішыце.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словы, вымаўленне якіх не адпавядае напісанню:

1) раскідзісты;
2) збожжа;
3) масліна;
4) барацьба;
5) стараешся.

**2.** Адзначце пары словазлучэнняў, у якіх ужыты амонімы:

1) байкі К. Крапівы — джэмпер з байкі;
2) лясістыя мясціны — лясныя звяры;
3) праязны дакумент — гістарычны дакумент;
4) купіць акцыі — акцыі пратэсту;
5) прадуктовы склад — націскны склад.

**3.** Адзначце фразеалагізмы, якія маюць значэнне ‘моцна правучыць каго-небудзь’:

1) набіваць руку;
2) усыпаць перцу;
3) пусціць чырвонага пеўня;
4) накруціць хвост;
5) ганяць сабак.

**4.** Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:

1) стогн;
2) падкоп;
3) падсвечнік;
4) маладосць;
5) моладзь.

**5.** Адзначце назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку:

1) боты;
2) насілкі;
3) крупы;
4) бярвенне;
5) Дзяды.

**6.** Адзначце прыметнікі, якія не ўтвараюць ступеней параўнання:

1) халасты;
2) вараны́;
3) вузкі;
4) персікавы;
5) дрэнны.

**7.** Адзначце сказы з дзеясловамі абвеснага ладу:

1) Пазней за ўсіх выбег з хаты Васілёк (*А. Камароўскі*).

2) Цалуй за мяне нашу маленькую Віку... (*А. Жук*).

3) Настаўніца яшчэ больш ажыўляецца, і ў вачах яе іскрачкі паблісквають (*Я. Колас*).

4) Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы ў ціхую сінюю ноч... (*М. Багдановіч*).

5) На берагах гэтых рэк адбудуцца потым вялікія гістарычныя падзеі (*В. Вольскі*).

**8.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы — прыназоўнікі:

1) Кіра сціснула ***каля*** грудзей худыя кулачкі і заплакала першая, за ёю мокра зашморгалі насамі ўсе дзяўчаткі (*В. Адамчык*).

2) Пятро ад такіх думак ажно ўсхапіўся і абышоў ***вакол*** лаўкі (*І. Шамякін*).

3) ***Вакол*** яснела (*В. Карамазаў*).

4) ***Пасля*** вайны выгляд вёсак перамяніўся (*І. Шамякін*).

5) ***Пасля*** мая сумка з кніжкамі ды сшыткамі ціха шуснула ўніз, на дарогу! (*Я. Брыль*).

**9.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ужываецца ***не***:

1) Гром грымеў амаль безупынна, не змаўкаючы __ на хвіліну (*В. Вольскі*).

2) Унізе, у цясніне, __ то рачулка, __ то ручаёк бурліць... (*Д. Слаўковіч*).

3) Назаўтра, падняўшыся ўранні з пасцелі, Андрэй, як __ дзіўна, не адчуў ні стомленасці, ні разбітасці (*Б. Сачанка*).

4) Куды ___ прыязджалі, тэмаю пачатку размовы было надвор'е, нясцерпная, неміласэрная гарачыня (*Ф. Янкоўскі*).

5) Чаго толькі Сцяпанка там ___ убачыў! (*З. Бядуля*).

**10.** Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі — прымыканне:

1) чытаў уголас;
2) сучаснае абсталяванне;
3) спаць седзячы;
4) зрабілі па-свойму;
5) булка з карыцай.

**11.** Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы:

1) У суседнім пакоі танцавалі (*А. Жук*).
2) Навокал было глуха, маўкліва, панура (*Я. Колас*).
3) Ад страху і нечаканасці ў мяне закалацілася сэрца (*В. Адамчык*).
4) Пахла свежым, падталым снегам, мокрай бяростай (*А. Кудравец*).
5) Нікому з хлопцаў не хацелася лішніх клопатаў (*А. Наварыч*).

**12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Здавалася, што хадок правальваецца ў пясок___ то адной, то другой нагою... (*Я. Каршукоў*).

2) Лес___ і рэчку, і клёкат busловы, чалавечую ўсмешку ўраз можна знішчыць адным толькі словам, што бяздумна вырвецца ў нас (*В. Вітка*).

3) З аржанішча нёсся прыемны___ жытні пах (*М. Гарэцкі*).

4) На дзвярах, на аканіцах, на высокім ганку___ усюды майстэрская разьба, пафарбаваная ў розныя колеры (*В. Вольскі*).

5) На момант усталявалася мёртвая___ неверагодная ў разгар бою цішыня, якую парушаў толькі цяжкі тупат шматлікіх ног (*А. Шашкоў*).

**13.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:

1) Фядорына хата з падслепаватымі акенцамі і ўвагнутай ***як сядло*** саламянай страхой туліцца наводшыбе Малога Сяла, пры самым лесе (*В. Гардзей*).

2) Зямны паклон табе ***радзіма*** тваім палям, тваім лясам, тваім заводам з белым дымам, тваім гасцінцам і шляхам! (*П. Глебка*).

3) А мне і ўвогуле ***здаецца***, што ўсе сады свету створаны толькі для дзяцей (*Я. Сіпакоў*).

4) Шчабяталі ластаўкі, ціўкалі ***здаецца*** пад самымі вокнамі вераб'і (*Б. Сачанка*).

5) Маёр ***нават*** бачыў зялёныя частыя ўспышкі са ствала і намагаўся як мага дакладней запомніць тое месца, дзе яны цяпер відаць (*М. Лупсякоў*).

**14.** Адзначце складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:

1) На кухні зазвінеў мабільнік, і маці хутка выйшла з пакоя (*Р. Баравікова*).
2) Ззаду беглі байцы, і не сціхалі аўтаматы (*М. Лупсякоў*).
3) Прыйдзе час — зноў збудуем мы хаты ўтульныя... (*П. Панчанка*).
4) Я зразумеў: не варта адразу хваліць адзін аднаго (*Д. Слаўковіч*).
5) Там, дзе зайшло сонца ўжо расцягнулася, як доўгае пяро, сіняе воблака (*А. Кудравец*).

**15.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак:

1) Ракеты патухлі, а кулямёт не сціхаў, і Забіла адразу здагадаўся, што пад грукат стрэлаў самы зручны момант выбрацца з вады (*М. Лупсякоў*).
2) Вагон быў пуставаты, дарога далёкая, пажылы праваднік гаваркі (*Я. Брыль*).
3) Час блізіўся пад абед, было душна, і Пятрок падумаў пра тое, што цяжка будзе жонцы ў аўтобусе, калі надумае сёння ехаць (*А. Кудравец*).
4) Мы ахвотна згрызлі сакавітыя белабокія антонаўкі, зжавалі акрайчык хлеба, а тым часам лес пачынаў ажываць, поўніцца першымі галасамі аленяў (*В. Карамазаў*).
5) Маўклівая вайна ў Глушаковай хаце, якая пачалася з таго вечара, калі Яўхім аб'явіў, што хоча жаніцца з Ганнаю, ішла без перамір'я некалькі тыдняў (*І. Мележ*).

## Тэкст да заданняў 16—20

(1) Гарады, як і людзі, маюць свае знешнія асаблівасці, уласны гістарычны лёс. (2) Мазыр шырока раскінуў свае прамысловыя і жылыя мікраёны на берагах ракі Прыпяці. (3) Яго непаўторную чароўнасць прызнаюць не толькі мазыране, але і шматлікія госці з іншых рэгіёнаў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. (4) Адпавядае прыроднай прыгажосці і гісто-

рыя гэтай зямлі. (5) Сведкамі эпох, якія адшумелі над краем, з’яўляюцца шматлікія помнікі гісторыі і культуры, памятныя мясціны, звязаныя з працоўнымі і ратнымі подзвігамі нашых продкаў (*Паводле А. Бабра*).

**16.** Знайдзіце ў 5-м сказе дзеепрыметнік. Вызначце яго стан. Адказ запішыце.

---

**17.** Адзначце, чым ускладнены 1-ы сказ:

1) аднароднымі членамі;
2) пабочным словам;
3) адасобленым азначэннем;
4) адасобленай акалічнасцю;
5) параўнальным зваротам.

**18.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ. Вызначце від даданай часткі. Адказ запішыце.

---

**19.** Выпішыце з тэксту слова, якое з’яўляецца сродкам сувязі 2-га і 3-га сказаў.

---

**20.** Вызначце стыль і тып тэксту. Адказ запішыце.

---

# 11 КЛАС

## Арфаэпічныя нормы. Акцэнталагічныя нормы

### Варыянт 1

**1.** Адзначце словы, у якіх літара ***я*** абазначае два гукі:
1) песня;
2) уяўны;
3) яма;
4) паядынак;
5) вясна.

**2.** Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаны гук [ц]:
1) страхоцце;
2) на кладачцы;
3) парцьера;
4) насіцца;
5) на вокладцы.

**3.** Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар ***дж*** перадае адзін гук:
1) абуджэнне;
2) дажджы;
3) аджылі;
4) паджылкі;
5) нараджэнне.

**4.** Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх выдзеленая літара ***і*** перадае гук [ы]:

1) там ***і*** тут;
2) Даша ***і*** Саша;
3) бук ***і*** вяз;
4) сонца ***і*** дождж;
5) дзед ***і*** ўнук.

**5.** Адзначце словы, у якіх вымаўляюцца падоўжаныя гукі:

1) казка;
2) нясвіжскі;
3) зжаць;
4) сшыць;
5) братцы.

**6.** Адзначце словы, у якіх прыведзена нарматыўнае вымаўленне гукаў:

1) [с']нежны;
2) лі[дж]ба;
3) ра[с]ческа;
4) [с']кінуць;
5) у суты[цц]ы.

**7.** Адзначце словы, у якіх ёсць гук [й]:

1) Юрка;
2) зіма;
3) зімняя;
4) майка;
5) льючы.

**8.** Адзначце словы, якія ў беларускай і рускай мовах адрозніваюцца месцам пастаноўкі націску:

1) старэнькі;
2) несла;
3) маладосць;
4) таварышы;
5) магазін.

## Тэкст да заданняў 9, 10

Зіма раздае ўсім аматарам [1)]прыгажосці свае аўтографы. Міжволі ***залюбуешся*** неапісальным [2)]хараством лесу, іеро-

гліфамі [3])звярыных слядоў, штрыхамі застылых кустоў. У снежнай фігуры дрэва раптам убачыш [4])грыб, натапыраную [5])птушку, працавітага бабра ці касалапае медзведзяня (*Л. Кацкевіч*).

**9.** Адзначце фанетычную з’яву, характэрную для выдзеленага ў тэксце слова:

1) аглушэнне парнага звонкага зычнага гука;
2) прыпадабненне свісцячага гука да шыпячага;
3) прыпадабненне шыпячага гука да свісцячага;
4) спалучэнне двух зычных гукаў вымаўляецца як адзін падоўжаны шыпячы гук;
5) азванчэнне парнага глухога зычнага гука.

**10.** Запішыце нумары слоў з тэксту, у якіх напісанне не супадае з вымаўленнем.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словы, у якіх літара ***е*** абазначае два гукі:

1) несці;
2) разнатраўе;
3) парцьера;
4) ельнік;
5) снежны.

**2.** Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаны гук [ш]:

1) мышшу;
2) замуж;
3) сшытак;
4) прынёсшы;
5) расчасаць.

**3.** Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар ***дз*** перадае два гукі:

1) падземны;
2) суддзя;
3) падзарадны;
4) дзве;
5) дзверы.

**4.** Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх выдзеленая літара ***і*** перадае гук [й]:

1) Віцебск ***і*** Гомель;
2) снег ***і*** вецер;
3) зямля ***і*** неба;
4) ноч ***і*** дзень;
5) іголка ***і*** нітка.

**5.** Адзначце словы, у якіх вымаўляюцца падоўжаныя гукі:

1) агародчык;
2) расчараваць;
3) езджу;
4) без журбы;
5) нітачцы.

**6.** Адзначце словы, у якіх прыведзена нарматыўнае вымаўленне гукаў:

1) ка[с’]ба;
2) бя[шш]кодна;
3) перакі[т]ваць;
4) [з’]гінуць;
5) на клада[цц]ы.

**7.** Адзначце словы, у якіх ёсць гук [й]:

1) сойка;
2) сіні;
3) сіняя;
4) лье;
5) яма.

**8.** Адзначце словы, якія ў беларускай і рускай мовах адрозніваюцца месцам пастаноўкі націску:

1) гліняны;
2) брала;
3) праспала;
4) дакумент;
5) аргумент.

## Тэкст да заданняў 9, 10

Сёння ўжо зіма. Гэта ж [1)]ніколі так не [2)]***адчуваеш*** перамену, як у гэты дзень. Як [3)]вясну лета змяняе, не заўважыш. Як лета [4)]восень — таксама. А вось як настае зіма — адразу відно з самага світання. Выпаў [5)]снег! (*І. Грамовіч*).

**9.** Адзначце фанетычную з'яву, характэрную для выдзеленага ў тэксце слова:

1) аглушэнне парнага звонкага зычнага гука;
2) прыпадабненне свісцячага гука да шыпячага;
3) прыпадабненне шыпячага гука да свісцячага;
4) спалучэнне двух зычных гукаў вымаўляецца як адзін падоўжаны шыпячы гук;
5) спалучэнне двух зычных гукаў вымаўляецца як адзін падоўжаны свісцячы гук.

**10.** Запішыце нумары слоў з тэксту, у якіх напісанне не супадае з вымаўленнем.

# Арфаграфічныя нормы

## Варыянт 1

**1.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***о***:

1) піянін_;
2) ж_ўты;
3) ж_луд;
4) ч_рнавалосы;
5) р_знастайны.

**2.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***я***:

1) кал_ндар;
2) с_местр;
3) жыцц_радасны;
4) пам_ць;
5) зерн_сушылка.

**3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная (устаўная) літара ***в*** або ***г***:

1) _облака;
2) _акно;
3) _оперны;
4) На_умчык;
5) _этыя.

**4.** Адзначце прыклады, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ў***:

1) фра_;
2) на _краінскай мове;
3) ва _шачах;
4) жанчына-_рач;
5) у «Выбранае» _вайшлі.

**5.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ь***:

1) міл_ярд;
2) сляз_мі;
3) восен_скі;
4) кон_скі;
5) сем_.

**6.** Адзначце словы, напісаныя правільна:

1) дзюна;
2) церапеўт;
3) аллея;
4) міласэрдны;
5) звышімклівы.

**7.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы пішуцца з вялікай літары:

1) Дзяржаўны ***(С,с)цяг*** Рэспублікі Беларусь;
2) ***(В,в)асеў*** партфель;
3) ***(К,к)упалаўскі*** стыль;
4) ***(Г,г)ордзіеў*** вузел;
5) ***(К,к)ароль*** Іарданіі.

**8.** Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:

1) сямі_гадовы;
2) супер_вокладка;
3) прыдумаў_такі;
4) Давыд_Гарадок;
5) выразна_прачытаны.

### Тэкст да заданняў 9, 10

Кожнаму з нас лёс наканаваў свой [1)]зямны куток, даў бясцэнны дар жыцця і [2)]***ма_чыну*** ласку, родную мову і [3)]сваё [4)]***а_чуванне*** годнасці. А вось неба над намі — адно на ўсіх, неабдымнае і [5)]загадкавае, глыбокае і неспазнанае, адкуль зоркі ўсім, хто б ты ні быў, свецяць аднолькава (*Г. Бураўкін*).

**9.** Адзначце літары, якія пішуцца на месцы пропускаў у выдзеленых словах:

1) дзве літары ***т***;
2) дзве літары ***д***;
3) літары ***т*** і ***д***;
4) літары ***д*** і ***т***;
5) дзве літары ***ч***.

**10.** Запішыце нумары слоў з тэксту, напісанне якіх заснавана на марфалагічным прынцыпе.

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара ***а***:

1) ж_луды;
2) кр_вавы;
3) ш_сцьсот;
4) р_знастайнасць;
5) ябл_чны.

**2.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***е***:

1) п_рон;
2) сув_зны;
3) жыцц_сцвярджальны;
4) м_дзведзяня;
5) зерн_сховішча.

**3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная (устаўная) літара ***в*** або ***г***:

1) _озера;
2) _эты;
3) _унук;
4) Тадэ_уш;
5) _азёрны.

**4.** Адзначце прыклады, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ў***:

1) рады_с;
2) Сарока _ладзіслаў;
3) сонца _зыходзіла;
4) мастакі-_мельцы;
5) гучнае «_ра».

**5.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ь***:

1) медал_ён;
2) вішан_ка;
3) Любан_скі;
4) глян_це;
5) стэп_.

**6.** Адзначце словы, напісаныя правільна:

1) тэатр;
2) дзепутат;
3) падыйсці;

4) позні;
5) группа.

**7.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы пішуцца з вялікай літары:

1) ***(Л,л)ацінская*** Амерыка;
2) ***(С,с)луцкія*** паясы;
3) ***(М,м)ележаўскія*** персанажы;
4) ***(Н,н)ацыянальная*** бібліятэка Беларусі;
5) ***(П,п)аўлавы*** сшыткі.

**8.** Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:

1) горка_салёны;
2) контр_удар;
3) анты_ваенны;
4) зноў_такі;
5) шыта_крыта.

## Тэкст да заданняў 9, 10

Кожнаму пакаленню застаецца ў [1]***спа_чыну*** тое, што стварылі талент, працалюбства і настойлівасць яго бацькоў і [2]продкаў, што выяўляе нацыянальнае [3]***аблі_ча*** народа. Стагоддзямі, нягледзячы на [4]цяжкія гістарычныя ўмовы, на ліхалецці войнаў, стваралі беларусы народнае [5]мастацтва, у якое ўкладвалі тонкі густ і высокае майстэрства (*М. Раманюк*).

**9.** Адзначце, якія літары пішуцца на месцы пропускаў у выдзеленых словах:

1) дзве літары ***т***;
2) дзве літары ***д***;
3) дзве літары ***ч***;
4) літары ***д*** і ***ч***;
5) літары ***д*** і ***т***;

**10.** Запішыце нумары слоў з тэксту, напісанне якіх заснавана на марфалагічным прынцыпе.

# Марфалагічныя нормы

## Варыянт 1

**1.** Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у*** (***-ю***):

1) бярэзнік_;
2) хлеб_;
3) страх_;
4) комін_;
5) воск_.

**2.** Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі:

1) хваляванне сціхла;
2) прыгожая надпіс;
3) выратаваў санінструктар Ірына Новікава;
4) ваенны аташэ;
5) сонечнае Баку.

**3.** Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыналежныя прыметнікі з суфіксам ***-ін-*** (***-ын-***):

1) дзядуля;
2) Наташа;
3) Вася;
4) вавёрка;
5) матуля.

**4.** Адзначце прыклады, у якіх дапушчаны памылкі ў напісанні, скланенні ці ўжыванні лічэбнікаў:

1) трынадцаць;
2) пяцёра;
3) дзве трэціх;
4) шэсць сёмых;
5) мілліярд.

**5.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні займеннікаў:

1) Меў яшчэ ён такі звычай — гаманіць з самім сабой.
2) Паэма многа ўвабрала ў сабе з пражытага паэтам у гады вайны.
3) Пейзаж нясе на сабе след перажыванняў герояў.
4) У мае маці было трое дзяцей.
5) Самога ветлівага хлопца вырашылі адправіць да старшыні.

**6.** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу абвеснага ладу ўжываюцца з канчаткамі ***-іце***, ***-ыце***:

1) кос_це;
2) б'_це;
3) чыта_це;
4) бач_це;
5) мера_це.

**7.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў ці прыслоўяў:

1) Мой брат старэй за мяне на два гады.
2) Той бераг ракі ніжэйшы за гэты.
3) Сонца летам свеціць ярчэй.
4) Прыгажэй за Гальку не было нікога ў вёсцы.
5) Полацк — адзін з самых найстаражытнейшых гарадоў на Беларусі.

## Тэкст да заданняў 8—10

(1) З кожным паваротам чыгункі, з кожнай новаю вярстою Сцёпка ўсё глыбей і яскравей адчувае ўладу гэтых прастораў, сярод якіх сям-там раскідваюцца цёмна-зялёныя палоскі лесу. (2) І гэтыя вёсачкі, і людзі, і дрэвы ля дарогі спачатку, здавалася, пазіралі на яго неяк неспагадліва і ***нават*** варожа. (3) І чым далей адыходзіў Сцёпка ад роднага сяла, тым больш мілым і дарагім станавілася яно яму. (4) Але разам з гэтым яно непрыкметна выцякала са Сцёпкавай душы новымі думкамі, новымі разважаннямі, вобразамі дарогі і тым невядомым далёкім, што яго чакала ў будучым (*Паводле Я. Коласа*).

**8.** Вызначце спосаб сувязі сказаў у тэксце. Адказ запішыце.

______________________________

**9.** Выпішыце з тэксту словы, якія маюць простую форму вышэйшай ступені параўнання.

______________________________

**10.** Вызначце, да якой часціны мовы належыць выдзеленае ў 2-м сказе слова. Адказ запішыце.

______________________________

## Варыянт 2

**1.** Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у*** (***-ю***):

1) суфікс_;
2) (гай)_;
3) (конь)_;
4) Нёман_;
5) метал_.

**2.** Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі:

1) друкаванае слова;
2) багатае буржуа;
3) прыйшла дэпутат Алена Патапава;
4) плеценае пано;
5) згубленая рукапіс.

**3.** Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыналежныя прыметнікі з суфіксам ***-ін-*** (***-ын-***):

1) сусед;
2) ластаўка;
3) Толя;
4) бабуля;
5) Тоня.

**4.** Адзначце прыклады, у якіх дапушчаны памылкі ў напісанні, скланенні ці ўжыванні лічэбнікаў:

1) адзінаццацю;
2) дзвюма;
3) трымя;
4) шасцёра;
5) тры пятых.

**5.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні займеннікаў:

1) Сядзіць важна, сама сабе гаспадыня.
2) Пісьменнік нібы прапануе чытачам зрабіць для сабе нейкія высновы.
3) Па рыцарскіх законах ты не маеш права абараняць мяне, пакуль цябе не зробяць рыцарам.
4) У тае бабулі мы папрасіліся заначаваць.
5) Каля самога высокага дуба і было вырашана спыніцца.

**6.** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу абвеснага ладу ўжываюцца з канчаткамі ***-іце***, ***-ыце***:

1) дрыж_це;
2) ідз_це;
3) ста_це;
4) хоч_це;
5) дума_це.

**7.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў ці прыслоўяў:

1) Мая сястра маладзей за мяне на два гады.
2) Зімой дні карацейшыя.
3) Волатава булава паляцела далей за булаву цмока.
4) Няма нідзе краю мілей за родны.
5) Суседні дом здаваўся больш вышэйшым за наш.

### Тэкст да заданняў 8—10

(1) А навальніца насоўвалася павольна. (2) Чорная сцяна хмар рабілася ўсё больш і больш шчыльнай. (3) За нядоўгі час усё навокал змянілася. (4) Сонца патускнела і ўсё глыбей уплывала ў хмару. (5) Цемра насоўвалася на зямлю. (6) Далёкі глухі гром раз-пораз чуўся мацней, бліжэй і магутней. (7) І раптам бліснула маланка, нібы ***нейкая*** велічэзная агністая птушка разняла свае крылы і асвяціла ўсю хмару (*Паводле Я. Коласа*).

**8.** Вызначце спосаб сувязі сказаў у тэксце. Адказ запішыце.

________________________________________

**9.** Выпішыце з тэксту словы, якія маюць простую форму вышэйшай ступені параўнання.

________________________________________

**10.** Вызначце, да якой часціны мовы належыць выдзеленае ў 7-м сказе слова. Адказ запішыце.

________________________________________

# Сінтаксічныя нормы. Пунктуацыйныя нормы

## Варыянт 1

**1.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў:

1) Па лясной сцежцы, засланай залатым дыванам лісця, ішлі тры чалавекі.
2) На густа абсыпаных дрэвах снегам не варушылася ні адна галінка.
3) Прыклаўшы вуха да дзвярэй, Волька прыслухалася.
4) Выйшаўшы на двор, на Рамана дыхнула набліжэннем вясны.
5) Выбягаючы з хаты на двор, Лёнька падцягнуўся на галіне старой грушы.

**2.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ў сувязі дзейніка і выказніка:

1) Усе прысутныя выказаліся супраць прапановы аб'яднаць дзве гаспадаркі.
2) Усяго пяць чалавек прыйшлі на дадатковыя заняткі па матэматыцы.
3) Большасць нашых людзей не хацела, каб асушалі балота за вёскай.
4) Безліч прапаноў паступіла ад жыхароў новага мікрараёна.
5) Праходзіць год за годам, а нічога не мяняецца ў абліччы старога горада.

**3.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна:

1) Хвілін колькі я не мог знайсці сабе месца, потым усё ж не вытрымаў, падсеў да стала, узяў з-пад абруса хлеб і адшчыпнуў крошачку, потым яшчэ адну і яшчэ... (*Б. Сачанка*).
2) Я гляджу цяпер на гэты роў, і ў шуме вады чую далёкую старажытнасць (*Я. Скрыган*).
3) Рыгор ішоў наперадзе, адхіляў галлё і трымаў у руках, пакуль пройдзе Зося, потым выпускаў яго, а сам зноў забягаў наперад (*Ц. Гартны*).
4) Усюды: на дарозе, у абочынах, на парыжэлай траве ляжала лісце, якое час ад часу ўзлятала ўгору і кружылася ў пыльнай завірусе (*І. Шамякін*).

5) Ляснічы нетаропка, па-гаспадарску агледзеў агароджу каля крынічкі, паправіў кладку да яе, каб падарожны змог падысці да яе ў кожную пару года (*Д. Слаўковіч*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выдзяляюцца з двух бакоў коскамі:

1) У непрыкметнай лясной вёсачцы ***каля вялікай ракі*** жыве не старая яшчэ жанчына (*В. Быкаў*).
2) У сакавіку ***здараецца*** ноччу ідзе дождж (*М. Стральцоў*).
3) Убачыўшы, што сабака нешта пачуў, чалавек насцярожыўся і ***трымаючы стрэльбу напагатове*** пачаў паціху набліжацца (*І. Грамовіч*).
4) У лесе было сыра і ***нават*** зябка (*І. Чыгрынаў*).
5) О ***журавы*** ляціце сваёй дарогай, вясёлай і шумнай, як крыгаход! (*М. Стральцоў*).

**5.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Цякуць рэкі ў мора__ і вырастаюць да неба дрэвы (*М. Стральцоў*).
2) Увосень у Бярозаўцы мялела рака__ і рана жаўцелі бярозы (*І. Пташнікаў*).
3) Колькі хараства__ і колькі мудрага задумення ў асеннім лесе! (*Я. Сіпакоў*).
4) Сонца павярнула на захад__ у небе застылі ружовыя хмары__ і на пасеку з балотца падзьмуў халадок (*І. Пташнікаў*).
5) Лабановіч не мог адвесці вачэй ад купчастых хмар-грамадзін__ і ўвесь аддаўся чарам зямлі і неба (*Я. Колас*).

**6.** Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) У твар шыбала прыемным вільготным халадком, а на ўзгорках сустрэчны паток паветра быў сухі і цёплы, што проста не верылася ў пачатак восені (*І. Шамякін*).
2) Дзе-кольвечы ў канавах і ярах яшчэ ляжыць апошні снег, але паводка ўжо адбушавала, пакінуўшы ў нізінах часовыя азёры, у якіх нібы ў вялізных люстэрках адбівалася ружова-блакітнае неба (*Т. Хадкевіч*).
3) Стаяла якраз тая пара восені, калі пачырванелы асіннік у лесе ўжо трывожна шапоча пра заканчэнне лета, а над асірацелымі лугамі згасае духмянасць пасохлых траў і кветак (*У. Краўчанка*).

4) І дзіўная рэч: сам Фурсевіч так захапіўся чытаннем, што на яго твары заззяла радасная ўсмешка а сам ён нібыта папрыгажэў (*С. Александровіч*).

5) Было ціха і вакол панавалі такая яснасць і спакой, якія бываюць у полі толькі ўвосень (*У. Краўчанка*).

**7.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) «Эй вы, слухайце!» — крыкнуў Янка Тукала, звяртаючыся да сяброў і стараючыся перакрычаць іх. — Давайце заспяваем песню!» (*Я. Колас*).

2) «Агонь! Агонь!» — крыкнуў Віктар, ачухаўшыся, і кінуўся да вогнішча (*Я. Маўр*).

3) «Ці не сын ты таго Пятра, што бунтаваў мне народ? — успомніў пан, чырванеючы ад злосці, і залямантаваў: Узяць яго!» (*З легенды*).

4) «Заходзьце ў хату, — смеючыся, сказала гаспадыня. — А каня я сама распрагу» (*І. Шамякін*).

5) Вяз памаўчаў, а потым, махнуўшы галінаю, сказаў: «Гэта не агонь» (*Я. Колас*).

## Тэкст да заданняў 8—10

(1) Толькі дабегчы да лесу Іван не паспеў. (2) Ён лез па траве ўгору, мінаючы вялікія і малыя абломкі скал з рассыпанай навокал жарствою, і ўжо амаль дасягнуў хваёвага ўзлеску, як ззаду, вынырнуўшы з-за пагорка, гучна і раз’юшана забрахалі сабакі. (3) Іван кінуўся ўбок, да маладой ялінкі, і, прыгнуўшыся, выглянуў між хваін __ цераз бугор, мільгаючы ў траве, па ягоных слядах імчалася нямецкая аўчарка. (4) Тады ён, зразумеўшы, што да гушчару ўжо не паспець, шырэй расставіў ногі і мацней сцяў у кулаку пісталет. (5) Стоячы за ялінай, Іван прыгнуўся, позіркам адмераў якую паўсотню крокаў да каменнага абломка ў траве і скіраваў туды пісталет. (6) Аўчарка магутнымі скачкамі набліжалася, прыцяўшы да галавы вушы. (7) Іван, амаль не цэлячыся, але фізічна адчуваючы напрамак яе страшнага бегу, стрэліў. (8) Сабака віскнуў, з шалёнага маху скочыў, перакуліўся цераз галаву і за якіх крокаў дваццаць ад яго забіўся, затузаўся ў траве ўсім целам (*Паводле В. Быкава*).

**8.** Вызначце тып маўлення. Адказ запішыце.

**9.** Вызначце, які знак прыпынку трэба паставіць у 3-м сказе на месцы пропуску. Адказ запішыце.

---

**10.** Запішыце нумары сказаў з аднароднымі выказнікамі.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў:

1) Над лесасекай, зарослай густымі кустамі арэшніку, плыло павуцінне.
2) Яны ішлі праз лес глухой, замеценай дарогай снегам, на якой не было відаць ні следу, ні каляіны.
3) Заслухаўшыся песняй жаваранка, ляснік не адразу пачуў гул машыны.
4) Едучы па мястэчку, гаворка на возе не перапынялася.
5) Паліваючы кветкі, дзяўчаты пайшлі дадому.

**2.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ў сувязі дзейніка і выказніка:

1) Гэтыя людзі не хацелі мірыцца з несправядлівасцю.
2) Толькі шэсць хлопцаў падала заявы на допуск да экзамену.
3) Большасць рэчаў былі завезены назаўтра.
4) Група моладзі чакала аўтобуса на прыпынку.
5) Мінула тыдняў сем.

**3.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна:

1) І матчыны словы і ласка яе і такі знаёмы дамашні пах зноў вярнулі Івану адчуванне радасці жыцця (*А. Кудравец*).
2) Саша доўга стаяў на ўзлессі, прытуліўшыся плячом да сасны і нервова круціў у руках лазіну (*І. Шамякін*).
3) Прырода ўмее гаварыць і ствараць і настрой, і лагоду, толькі трэба ўмець яе слухаць (*Я. Скрыган*).
4) Вясна, кажуць, прыгожая ўсюды: у полі, у лесе, у горадзе (*Я. Брыль*).
5) Па звычцы мець заўсёды пры сабе ўсё: гайкі, шурупы і іншыя дробныя дэталі Сяргей і лісток дубовы машынальна паклаў у кішэню (*І. Шамякін*).

**4.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выдзяляюцца з двух бакоў коскамі:

1) Недалёка ад дубоў ***на скошаным лузе*** пасвіліся статкі (*Я. Колас*).

2) Але сонца ўжо не магло як след нагрэць зямлю і паветра, і ***нават*** у гэты ясны дзень адчувалася восень (*І. Мележ*).

3) У паветры было ціха, толькі звон красак зліваўся ў адну доўгую песню, і ***здавалася*** прырода была закалыхана гэтым звонам (*Я. Колас*).

4) Ліпа была такая старая, што ледзьве трымалася, і ***крыху схіліўшыся да будынка*** толькі чакала буры... (*М. Паслядовіч*).

5) ***Здавалася*** Васілю, што пасядзіць трохі, адпачне, а там можна зноў устаць, зноў ісці (*І. Мележ*).

**5.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Кіламетры праз тры пачаўся лес__ і тут адразу стала спакойна і ціха (*Я. Скрыган*).

2) Як у люстэрка, глядзішся ты ў прыроду, чалавек__ і бярэш ад яе і душэўнасць, і ласку, і мудрасць (*Я. Скрыган*).

3) Я гляджу цяпер на гэты роў__ і ў шуме вады чую далёкую старажытнасць (*Я. Скрыган*).

4) Замаразкі ўсё мацнелі і мацнелі__ і ўжо раніцамі зямля адзывалася пад нагамі лёгкім звонам__ і кожны крок быў чуваць за некалькі кіламетраў па ўсім наваколлі (*М. Лынькоў*).

5) Мне ж хацелася падыхаць свежым паветрам__ і я выйшаў наверх (*І. Шамякін*).

**6.** Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) Яшчэ сон звівае павекі, іх цяжка разарваць і галава яшчэ не зусім прачнулася, а ўжо радасць, што зноў дома, як быццам і не з’язджаў адсюль ніколі, радасць звароту ў самога сябе (*А. Кудравец*).

2) Спачатку начаваў алень у катлаване, дзе стаяла наша гармата, але першыя стрэлы моцна напалохалі няшчасную жывёліну, і ён стаў баязліва абыходзіць гарматы і пазбягаць сваіх старых сяброў (*І. Шамякін*).

3) А потым на двары, пастукаўшы ў шыбу, напружана чакаеш, калі пачуецца лёгкі шоргат і жывое варушэнне на печы, і з плячэй быццам гара зваліцца (*А. Кудравец*).

4) Жыццё многіх людскіх пакаленняў прайшло перад дубамі, і праходзіць, нібы тыя хвалі Нёмана, што пакручастай змейкай абвівае высокі роўны груд, а яны ўсё стаяць, спакойныя і важныя, і жывуць сваім асобным жыццём (*Я. Колас*).

5) Пасярод паляны стаялі два стажкі сена і адзін з іх быў так абскубаны знізу, што нагадваў грыб, і нельга было не здзівіцца, як ён не паваліцца ад першага подыху ветру (*І. Шамякін*).

**7.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) «Няўжо ўсё? Няўжо не будзе Пеці? — шапталі яе вусны. — Трэба плысці!» (*І. Шамякін*).

2) «Бач ты, усё з'елі», — абрадаваўся ляснік (*В. Вольскі*).

3) «Трэба пашукаць у рэчцы», — сказаў сусед, бо ўзяць чужую рэч у нас ніхто не мог (*В. Крукоўскі*).

4) І супраць дзедавай волі з яго грудзей вырваўся голас — «Хто ідзе?» (*Я. Колас*).

5) «Дабравольцаў няма, — змрочна заключыў Галадай і дадаў: — Тады пацягнем» (*В. Быкаў*).

## Тэкст да заданняў 8—10

(1) Белая ад снегу зямля зіхаціць у ранішнім сонцы. (2) На тэрмометры, прымацаваным да рамы акна, слупок упаў да трыццаці.

(3) На пустэчы за гумном стаяць кусты лопуху, на якія апусцілася чародка жвавых сінічак. (4) Мароз даймае іх моцна, і нездарма лясныя птушкі перабіраюцца бліжэй да чалавечага жылля. (5) Здаецца, зусім нядаўна ў хмызняках і садах весела стракаталі, спявалі свае песні пярнатыя наведвальнікі, бо летам і ўвосень ім была раскоша __ насення, насякомых, іх лічынак хапала на ўсіх. (6) А цяпер, калі ўся зямля пакрыта снегавой коўдрай, птушкам туга.

(7) Вялізнае сонца апускаецца, павольна коціцца за лес. (8) Ружовы захад палымнее шырока і зырка, але вось ён згасае і цямнее, робіцца нібыта барвовым. (9) А неўзабаве, быццам чараўнік раскінуў агністыя самацветы, на пацямнелым небе ўспыхнулі зоркі (*Паводле Л. Кацкевіча*).

**8.** Вызначце тып маўлення. Адказ запішыце.

______________________________________________

**9.** Вызначце, які знак прыпынку трэба паставіць у 5-м сказе на месцы пропуску. Адказ запішыце.

______________________________________________

**10.** Запішыце нумары сказаў з двума і больш радамі аднародных членаў.

______________________________________________

# Кантрольная тэставая работа

## Варыянт 1

**1.** Адзначце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае:

1) лясны;
2) яблычнае;
3) прыязджаць;
4) ельнік;
5) князь.

**2.** Адзначце радкі, дзе ўсе выдзеленыя галосныя з'яўляюцца націскнымі:

1) мал***ы***, дубл***і***раваць;
2) за***і***нец, ф***а***ртух;
3) прыгав***о***р, тавар***ы***скі;
4) адз***і***наццаць, атл***е***т;
5) інструм***е***нт, вал***ё***нкі.

**3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***о***:

1) дэп_;
2) в_рабей;
3) Эфі_пія;
4) ф_талабараторыя;
5) шыр_каверхі.

**4.** Адзначце радкі, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ў***:

1) паўночна-_сходні;
2) а_дыторыя;
3) Кавалёва _ладзіслава;
4) кансультацыйна-_рачэбны;
5) Улан-_дэ.

**5.** Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне заднеязычнага са свісцячым гукам:

1) сустрэцца з (сяброўка);
2) зваліцца з (кладка);
3) бегчы па (дарожка);
4) радавацца (адзнака);
5) ісці па (бераг).

**6.** Адзначце радкі, у якіх марфемная будова слоў вызначана правільна:

1) зацемна (прыстаўка + корань + суфікс + канчатак);
2) зірнуўшы (корань + суфікс + суфікс);
3) здалёку (прыстаўка + корань + суфікс);
4) перададзены (прыстаўка + корань + суфікс + канчатак);
5) задарожны (прыстаўка + корань + суфікс + канчатак).

**7.** Адзначце радкі, у якіх прыслоўі пішуцца разам:

1) саскочыць (на) хаду;
2) пазіраць (з) верху;
3) (з) верху елкі;
4) ісці (ў) абдымку;
5) пачаць (па) асобку.

**8.** Адзначце словазлучэнні, у якіх ёсць памылкі ва ўтварэнні, напісанні ці ўжыванні дзеепрыметнікаў:

1) размоклыя чаравікі;
2) дагледжаная вопратка;
3) згаладаўшыяся дзеці;
4) плачучы голас;
5) абветранныя твары.

**9.** Адзначце прыклады, у якіх ***не*** (***ня***) пішацца са словамі разам:

1) (не) верагодны палёт;
2) (не) высушанае своечасова жыта;
3) (не) каторыя работнікі;
4) (не) упэўненасць у сабе;
5) (не) адхіляючыся ад тэмы.

**10.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ужываецца часціца ***ні***:

1) Я іду па прысадах маладых акацый, задуменных у асенняй журбе, і шкадую, што гэта ___ чэрвень (*С. Кухараў*).

2) І колькі ___ жывём, мы чуем яе спеў над самай роднай часцінкай зямлі... (*М. Ракітны*).

3) Дзе б ты ___ быў, вабяць да сябе крыніцы твайго маленства (*Я. Сіпакоў*).

4) Даспявала збажына, і ласкавы гул коласа не змаўкаў ___ на хвіліну (*Б. Сачанка*).

5) Дык гэта было ___ што іншае, як мой спінінг! (*В. Крукоўскі*).

**11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік:

1) Восень ___ гэта ростані на вечных дарогах старога і новага жыцця (*І. Навуменка*).

2) Вясна ў гэтым годзе ___ дружная і цёплая (*М. Лынькоў*).

3) Але навальніцы ўлетку ___ імклівыя і кароткія (*Т. Хадкевіч*).

4) Але кароткія вы ___ залатыя дзянькі бабінага лета (*Р. Ігнаценка*).

5) Хлеб ___ часцінка нашага жыцця (*Б. Сачанка*).

**12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставіцца коска:

1) Можна доўга і зачаравана глядзець у чысціню крыніц, у якіх адбіваюцца галінкі ракіт___ і сінь неба___ і белыя воблачкі (*Я. Сіпакоў*).

2) Ні дрэўцаў___ ні кустоў___ ніводнай рачулкі, акрамя некалькіх равоў, не сустрэнеш на гэтай дарозе (*І. Шамякін*).

3) Высокае___ сіняе неба над галавой (*І. Навуменка*).

4) На пероне былі яшчэ большая мітусня___ шум і неспакой, і яна разгубілася (*І. Мележ*).

5) Адтупвалі людзі па дарогах наканаваныя лёсам кіламетры___ і гады___ і зноў ішлі ў зямлю (*Б. Сачанка*).

**13.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Лес___ ты сніўся мне па начах (*Б. Сачанка*).

2) Птушачкі і самі___ зразумела___ знайшлі б тую нялёгкую дарогу ў вырай, але з журавамі надзейней (*Я. Сіпакоў*).

3) З крутой завіліны каля сяла Высокага___ відаць___ паўднёвая частка Пінска (*Я. Колас*).

4) Жніво для Івана___ як свята (*І. Шамякін*).

5) — Эх___ ты, ластаўка! — усміхнуўся прараб (*В. Гарбук*).

**14.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя выразы выдзяляюцца коскамі:

1) ***Прыгожая***, ***зграбная*** яна ўпэўнена насілася па лёдзе, на зайздрасць мне і ўсім (*М. Лупсякоў*).

2) Але ***нягледзячы на сваю хапатлівасць*** птушачкі не адставалі ад журавоў (*Я. Сіпакоў*).

3) Лес тут быў ***пераважна бярозавы*** (*В. Вольскі*).

4) Спачатку сонечныя зайчыкі лягуць на спакойныя хвалі ракі, і ***ветліва ўсміхнуўшыся*** сонца поўнай жменяй кіне свае промні ў шыбіны вясковых хат (*І. Навуменка*).

5) Месцаў на ўсіх не хапіла, таму давялося ехаць ***стоячы*** (*І. Навуменка*).

**15.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць двукроп'е:

1) І шмат што перашкаджае спакойнай плыні думак___ лес шуміць, шамаціць пад нагамі лісце... (*І. Шамякін*).

2) Крані нагой сухую галінку___ пырсне кропелька на жоўта-чырвоны бруснічнік (*І. Пташнікаў*).

3) Тады хуткім рухам ускіне Лаўрэн сваю стрэльбу___ і сустрэне чалавека яго паляўнічае шчасце (*Э. Самуйлёнак*).

4) Васіль адчувае___ да густога лесу не дойдзе (*І. Навуменка*).

5) Пералесак скончыўся___ вакол раскінуўся бязмежны прастор (*Т. Хадкевіч*).

**16.** Адзначце, колькі знакаў прыпынку трэба паставіць у прыведзеным сказе:

А дзед Талаш з яшчэ большым захапленнем расказваў далей пра падзеі апошніх дзён пра сваё бадзянне па лясах пра сваё спатканне з пакрыўджанымі людзьмі пра розныя эпізоды з іх жыцця і нарэшце запыніўся і гэта было цэнтральным месцам яго апавядання на здзеках польскіх акупантаў над людзьмі якія спачувалі савецкай уладзе на арышце яго сына Панаса (*Я. Колас*).

1) 8 косак;
2) 10 косак;
3) 9 косак і 1 працяжнік;
4) 7 косак і 2 працяжнікі;
5) 8 косак і 1 працяжнік.

**17.** Адзначце прыклады, у якіх схема адпавядае сказу з простай мовай:

1) Вось так яны і жывуць сказаў Дзямід, усміхнуўшыся (*В. Вольскі*).
**«П, — а, — п».**

2) Ты што ж ето? Кінуў гасцей — і ні слыху ні дыху! Звяць пайшоў называецца мачыха перавяла дыханне і напала на Ганну (І,і) ты добрая! Такіх сватоў чакаць застаўляеш! (*І. Мележ*).
**«П! — а. — П!»**

3) Ах, нягоднікі крыкнуў Арсен (Ш,ш)то ж гэта робіцца (*Я. Пархута*).
**«П! — а. — П?»**

4) Саша памаўчаў, хацеў раззлавацца (П,п)адумаеш, задавака якая (*І. Мележ*).
**А: «П!»**

5) Вас да сябе не клічуць спытаўся я (*Я. Брыль*).
**«П, — а».**

**Тэкст да заданняў 18—20**

(1) Імя Ефрасінні Полацкай ***займае*** асаблівае, пачэснае месца ў нашай старажытнай гісторыі. (2) Яе імя стала сімвалам імкнення душы да ведаў, да веры, таму яно і перажыло стагоддзі.

(3) Ефрасіння — унучка легендарнага князя Усяслава Чарадзея, дачка князя Георгія Усяславіча.

(4) У канцы свайго жыцця Ефрасіння Полацкая зрабіла паломніцтва ў Іерусалім, дзе яна і памерла. (5) Пахавалі Ефрасінню ў Пячэрскай Лаўры, у Кіеве. (6) На той час гэта было самае святое месца на славянскіх землях.

(7) Праваслаўная царква далучыла першую асветніцу беларускай зямлі да святых. (8) Яе дзейнасць пакінула след не толькі ў гісторыі, але і ў душы беларускага народа, які з даўніх часоў пракладваў на ўсходнеславянскіх землях шляхі асветніцтва і адукацыі (*У. Бутрамееў*).

**18.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

---

**19.** Ад выдзеленага ў 1-м сказе дзеяслова ўтварыце і запішыце дзеепрыслоўе.

---

**20.** Знайдзіце ў тэксце аднасастаўны сказ. Запішыце яго граматычную аснову.

---

## Варыянт 2

**1.** Адзначце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае:

1) вясёлка;
2) яловы;
3) уявілі;
4) сямёра;
5) салаўя.

**2.** Адзначце радкі, дзе ўсе выдзеленыя галосныя з'яўляюцца націскнымі:

1) велізáрны, занéсці;
2) заслóнены, магазíн;
3) вярбá, пасрэ́дна;
4) чаты́рнаццаць, фенóмен;
5) некатóрыя, аднесцí.

**3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***е***:

1) маян_з;
2) эф_кт;
3) ац_нка;
4) жыцц_здольны;
5) л_саахоўны.

**4.** Адзначце радкі, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ў***:

1) на _скрайку лесу;
2) прачыта_;
3) аквары_м;
4) газету «Звязда» _знагародзілі;
5) Казько _ладзімір.

**5.** Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне заднеязычнага са свісцячым гукам:

1) звісаць са (страха);
2) скакаць на (нага);
3) на правай (рука);
4) гасцяваць у (цётка);
5) сядзець на (лаўка).

**6.** Адзначце радкі, у якіх марфемная будова слоў вызначана правільна:

1) дабяла (прыстаўка + корань + канчатак);
2) глянуўшы (корань + суфікс + суфікс);
3) зблізку (прыстаўка + корань + суфікс);
4) аддадзены (прыстаўка + корань + суфікс + канчатак);
5) прырэчны (прыстаўка + корань + суфікс + канчатак).

**7.** Адзначце радкі, у якіх прыслоўі пішуцца разам:

1) мая сястра (за) мужам;
2) танцаваць (у) прысядкі;

3) будзе (да) рэчы;
4) (з) верху сцяны;
5) (у) чатырох дамах.

**8.** Адзначце словазлучэнні, у якіх ёсць памылкі ва ўтварэнні, напісанні ці ўжыванні дзеепрыметнікаў:

1) асветленнае неба;
2) падаючыя зоркі;
3) разбушаваўшаяся стыхія;
4) апранутая камізэлька;
5) загарэлы на сонцы твар.

**9.** Адзначце прыклады, у якіх ***не*** (***ня***) пішацца са словамі разам:

1) (не) сустракацца позіркам;
2) (не) абходны дакумент;
3) (не) учора, а сёння;
4) (не) шта загучала;
5) (не) навідзець хлусню.

**10.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ужываецца часціца ***ні***:

1) Бог ведае, чаго толькі __ намалюе, куды __ заводзіць палкае ўяўленне юнацтва! (*А. Васілевіч*).
2) Дзе б мы __ былі, сілай неадольнай цягне нас да таго куточка зямлі (*В. Лукша*).
3) Праз колькі часу лес расступіўся, і зноў адкрыўся прастор, але то былі __ палеткі (*Т. Хадкевіч*).
4) Вакол, куды __ кінеш вокам, — збажына (*І. Навуменка*).
5) Ідучы берагам Свіцязі, мы __ маглі __ парадавацца, што жорсткая рука цывілізацыі яшчэ амаль не кранула гэтага казачнага кутка Беларусі (*К. Цвірка*).

**11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік:

1) Вясна __ малады, бурлівы вір жыцця, імклівы, неспакойны рух у неакрэсленыя прасторы (*Я. Колас*).
2) Маё вялікае і даўняе жаданне __ ва ўсім будзённым бачыць урачыстасць... (*Я. Сіпакоў*).
3) Вада ў вёдрах __ чыстая, празрыстая (*Я. Сіпакоў*).
4) Дзвіна __ як шырокае люстраное палатно, спакойная і велічная, і ні адна зморшчынка не пярэсціла яе чало (*Т. Хадкевіч*).
5) Можа, гэта __ не думкі, а няпэўныя, няясныя летуценні (*І. Навуменка*).

**12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставіцца коска:

1) Калі па дарогах не ходзяць, яны зарастаюць___ перастаюць быць дарогамі___ робяцца зноў полем___ лесам___ лугам___ балотам (*Б. Сачанка*).

2) Амаль у кожнай хаце знойдзеш што-небудзь з начыння___ вудачкі, спінінгі, блешні, лескі, паплаўкі... (*К. Кірэенка*).

3) І голас твой___ узнімецца___ і паплыве... (*І. Грамовіч*).

4) Цяпер і ў вёсцы___ і ў горадзе столькі развялося рыбакоў... (*К. Кірэенка*).

5) Лёгкая___ прыемная хваля падхоплівае цябе (*І. Навуменка*).

**13.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

1) Ах___ ты___ дарожачка дахаты! (*Г. Марчук*).

2) На беразе дзяўчынкі ўбачылі пер'е на чыстым___ белым снезе (*Я. Пархута*).

3) Ледзь не кожным учынкам Ганна___ здавалася___ паказвала, што ў яе на ўсё свае сталыя меркаванні, свой цвёрды погляд (*І. Мележ*).

4) Маланкі адна за адной бязлітасна паласавалі неба, дождж ліў___ як з вядра (*І. Шамякін*).

5) Мальва не такая прыгожая___ як вяргіні... (*Г. Марчук*).

**14.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя выразы выдзяляюцца коскамі:

1) ***Супакоеная***, ***радасная*** яна думала пра сябе, пра Лявона, пра дзяцей (*А. Кудравец*).

2) Маладая раслінка стаяла пры лесе ***за вёскай*** (*Я. Колас*).

3) Немцы некалькі дзён пільнавалі яго ў засадзе і ***не дачакаўшыся*** спалілі хату (*Б. Сачанка*).

4) Перабраўшыся тры гады таму назад з вёскі, маці па-ранейшаму не можа сядзець ***склаўшы рукі*** і даглядае суседскага хлопчыка (*У. Арлоў*).

5) Хата, дзе жыла Алеся, стаяла на пагорку ***ля самага Дняпра*** (*Я. Пархута*).

**15.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць працяжнік:

1) Муж адчыніць акно ___ і ў хату ўварвуцца звонкія галасы суседскіх унукаў (*Я. Пархута*).

2) Цяжка ў гэтую пару птушкам ___ корму ўсё менш, добра, што хоць маразы аціхлі (*І. Навуменка*).

3) Яны ведаюць ___ лён — гэта багацце калгаса (*С. Кухараў*).

4) Паспрабавалі падставіць лесвіцу __ стрэлы зноў адагналі ворагаў (*В. Хомчанка*).

5) Яго [Уладзіміра Іванавіча] угаворвалі не плысці __ застацца тут (*І. Шамякін*).

**16.** Адзначце, колькі знакаў прыпынку трэба паставіць у прыведзеным сказе:

А калі дзед дайшоў да стычкі з жаўнерамі вочы яго загарэліся агнём змагання ён раптам напружыўся згарнуў кулакі як дзяцюк саскочыў з лавы і наглядна рухамі рук паказаў як ён шарганула палякаў як паляцелі яны ад яго як ён вырваўся і кінуўся ў лес (*Я. Колас*).

1) 8 косак;
2) 9 косак;
3) 10 косак;
4) 8 косак і двукроп'е;
5) 9 косак і працяжнік.

**17.** Адзначце прыклады, у якіх схема адпавядае сказу з простай мовай:

1) Як жа мяне здзівіла вестка, якую праз некалькі дзён паведаміў мне Ларчанка Вашы апавяданні Чорны прачытаў (*І. Мележ*).
**А: «П».**

2) Ты, відаць, вельмі любіш пушчу пытаюся я (*В. Карамазаў*).
**«П», — а.**

3) Пачакайце, ёсць адна просьба да вас настаўнік паказаў рукой у поле, дзе бралі свой пачатак ручаі, і дадаў (Н,н)е забывайце, калі ласка, пра крыніцы, а то заплывуць, заб'юцца, перасохнуць (*І. Шамякін*).
**«П, — а: — П».**

4) На Вароніна балота ісці нельга папярэджваў нас, бывала, дзед (Д,д)ождж хутка сыпане (*З. Бяспалы*).
**«П, — а. — П».**

5) Хворым дрэвам, як і хворым людзям, трэба дапамагаць гаварыў бацька сыну (*У. Мяжэвіч*).
**«П, — а».**

## Тэкст да заданняў 18—20

(1) Ад продкаў дасталася нам створаная іх працавітымі рукамі, выведзеная на шлях цывілізацыі наша родная Беларусь. (2) Мы абавязаны шанаваць усё тое, што звязана з іх жыццём, каб шанавалі і нас будучыя пакаленні. (3) Яны наўрад ці

даруюць нам, калі мы не вернем людзям не па іх віне страчаную тапанімічную спадчыну, у якой яскрава адлюстравана ўсё нялёгкае жыццё беларускага народа.

(4) У сусветнай практыцы зусім справядліва лічаць найбольш дарагой назву таго населенага пункта, якая з'яўляецца больш старой паводле часу ўзнікнення. (5) Каштоўнасць тапоніма ў тым, што ён стагоддзямі ***захоўвае*** сваё першапачатковае аблічча (*Паводле Л. Лыча*).

**18.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.

---

**19.** Ад выдзеленага ў 5-м сказе дзеяслова ўтварыце і запішыце дзеепрыслоўе.

---

**20.** Знайдзіце ў тэксце аднасастаўны сказ (частку складанага сказа). Запішыце яго граматычную аснову.

---

# Адказы

## 8 клас

### Словазлучэнне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 2, 4 | 1, 3, 4 |
| 2 | 1, 4 | 3, 4 |
| 3 | 2, 4 | 2, 3 |
| 4 | 2, 4 | 4, 5 |
| 5 | 2, 3 | 2, 3 |
| 6 | 1, 4, 5 | 1, 4, 5 |
| 7 | 1, 2, 5 | 1, 2, 4 |
| 8 | 2, 3, 5 | 1, 3 |
| 9 | апісанне | разважанне |
| 10 | 3, 4, 6 | 1, 5, 6 |

### Двухсастаўныя сказы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 5 | 2, 5 |
| 2 | 1, 2 | 2, 3, 5 |
| 3 | 1, 4 | 2, 3 |
| 4 | 1, 2, 5 | 2, 4, 5 |
| 5 | 1, 3, 4, 5 | 2, 3, 4 |
| 6 | 1, 4, 5 | 1, 3 |
| 7 | 1, 2, 5 | 2, 4 |
| 8 | 3, 4, 5 | 1, 3 |
| 9 | 3 | 1 |
| 10 | свайго (сына),<br>юнацкія (рысы) | (плячо) гаспадара,<br>(спевы) птушкі |

## Аднасастаўныя сказы. Няпоўныя сказы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 2 | 2, 4, 5 |
| 2 | 1, 3, 4 | 4 |
| 3 | 1, 4 | 1, 2 |
| 4 | 2, 3, 4 | 2, 3, 5 |
| 5 | 3, 4 | 1, 4, 5 |
| 6 | 1, 2, 4 | 1, 2, 4 |
| 7 | 2, 3, 5 | 1, 2, 3 |
| 8 | 1, 2, 3, 4 | 1, 4 |
| 9 | публіцыстычны | публіцыстычны |
| 10 | няпэўна-асабовы, празвалі | Напалеон Орда, назыўны |

## Сказы з аднароднымі членамі

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 4 | 1, 2, 3 |
| 2 | 1, 2, 5 | 3, 4 |
| 3 | 2, 3, 5 | 1, 3, 4, 5 |
| 4 | 3, 5 | 1, 3, 4 |
| 5 | 1, 3, 5 | 4, 5 |
| 6 | 2, 3, 5 | 3, 5 |
| 7 | 1, 4, 5 | 1, 3 |
| 8 | 3, 4 | 1, 5 |
| 9 | 2 | 2 |
| 10 | шэсць | дзевяць |

## Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 4 | 2, 3, 5 |
| 2 | 1, 4 | 2, 4, 5 |
| 3 | 3, 4 | 1, 5 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 4 | 1, 3 | 2, 3, 5 |
| 5 | 1, 3, 5 | 2, 5 |
| 6 | 3, 4, 5 | 1, 4, 5 |
| 7 | 1, 3, 4 | 2, 4 |
| 8 | 3, 5 | 1, 4, 5 |
| 9 | разважанне | апісанне |
| 10 | безумоўна, вядома, нарэшце | здавалася, думалася, нарэшце |

## Сказы з адасобленымі членамі

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3 | 4, 5 |
| 2 | 1, 3, 5 | 1, 4, 5 |
| 3 | 1, 3, 4 | 1, 2, 5 |
| 4 | 2, 4 | 3, 4 |
| 5 | 2, 3 | 2, 5 |
| 6 | 1, 2 | 1, 2, 4 |
| 7 | 1, 2, 4 | 1, 3 |
| 8 | 1, 3 | 4, 5 |
| 9 | 4 | 3 |
| 10 | Стаяў дзень позняй восені, ціхі, сонечны, крыштальна-празрысты, з высокім небам, чыстым паветрам. | Пілоткі, старыя, выцвілыя на сонцы, вымытыя дажджамі, сушаныя вятрамі, якія зусім не пасавалі да цывільных гарнітураў і святочных сукенак ветэранаў, маладзілі людзей. |

## Кантрольная тэставая работа

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 5 | 1, 2, 3 |
| 2 | 1, 4 | 2, 4 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 3 | 3, 4 | 1, 3, 4 |
| 4 | 2, 4, 5 | 1, 5 |
| 5 | 3, 5 | 2, 3 |
| 6 | 1, 2 | 1, 2, 5 |
| 7 | 3, 5 | 2, 5 |
| 8 | 3, 4 | 1, 2, 4 |
| 9 | 2 | 3 |
| 10 | 1, 4, 5 | 2, 4 |
| 11 | 1, 2, 3 | 1, 3, 4 |
| 12 | 1Д, 2Г, 3А, 4В, 5Б | 1Д, 2А, 3Б, 4Г, 5В |
| 13 | 1, 4, 5 | 1, 4 |
| 14 | 2, 5 | 2, 4 |
| 15 | 1, 3, 5 | 3, 5 |
| 16 | 1 | 2 |
| 17 | домікі будачнікаў,<br>купкі дрэў,<br>малюнкі краявідаў | веснавая цёплая ноч,<br>дробныя белыя хмаркі,<br>вясёлыя маладыя гукі |
| 18 | 3, безасабовы,<br>стала маркотна | 4, безасабовы,<br>пахла |
| 19 | [◎: О, О, О, О — ...] | [О і О] |
| 20 | 3 | 1 |

# 9 клас

## Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 5 | 1, 2, 4 |
| 2 | 2, 3, 4 | 1, 2, 4 |
| 3 | 1, 5 | 4, 5 |
| 4 | 2, 4 | 1, 2, 3 |
| 5 | 2, 5 | 1, 4 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 6 | складаназалежны | складаназлучаны |
| 7 | вузкі, востраў | самацвет, разнастайны |
| 8 | бор | гатунак |
| 9 | бабровы | прыгожы, добры |
| 10 | апісанне | 4 |

## Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 4, 5 | 1, 2, 4 |
| 2 | 1, 2, 3 | 1, 4 |
| 3 | 1, 2, 5 | 2, 3 |
| 4 | 2, 5 | 3, 4 |
| 5 | 1, 3, 5 | 1, 5 |
| 6 | 1, 3, 5 | 1, 3, 5 |
| 7 | 2, 3, 4 | 2, 3, 5 |
| 8 | спалучальныя | супраціўныя |
| 9 | пазней | узняўшы |
| 10 | прападаючы | зроблены |

## Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 4, 5 | 2, 3, 5 |
| 2 | 2, 5 | 2, 4 |
| 3 | 1, 2, 4 | 2, 3, 5 |
| 4 | 2, 3, 5 | 2, 3, 5 |
| 5 | 1, 3, 4 | 2, 3, 5 |
| 6 | 1, 2, 4 | 3, 5 |
| 7 | 1, 3, 5 | 1, 2, 4 |
| 8 | 2, 4 | 2, 3 |
| 9 | 3, 4, 5 | 2, 4, 5 |
| 10 | неаднароднае | паслядоўнае |

## Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 5 | 1, 2, 5 |
| 2 | 3, 5 | 1, 5 |
| 3 | 2, 3, 5 | 3, 4 |
| 4 | 1, 2, 5 | 1, 4, 5 |
| 5 | 1, 4, 5 | 1, 3, 4 |
| 6 | 3, 5 | 2, 4 |
| 7 | 3 | 1 |
| 8 | нешта | прыслоўі месца |
| 9 | прыставачна-суфіксальны | сцішанасць |
| 10 | 2 | мастацкі |

## Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1 | 3 |
| 2 | 2, 3 | 1, 4 |
| 3 | 2, 3, 4 | 1, 3, 4 |
| 4 | 1, 2, 4 | 1, 3 |
| 5 | 2, 3, 5 | 2, 3, 5 |
| 6 | падпарадкавальная і бяззлучнікавая | бяззлучнікавая і злучальная |
| 7 | хоць, ён, прызнавацца | бераг, сцюжа, яго |
| 8 | лепш | адносны |
| 9 | прымыканне | дапасаванне |
| 10 | дапаўненні, выказнікі | выказнікі, дапаўненні |

## Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 3 | 2 |
| 2 | 1, 3, 4 | 1, 2, 5 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 3 | 4, 5 | 2, 4 |
| 4 | 1, 2, 4 | 1, 2, 5 |
| 5 | 3 | 3 |
| 6 | 1 | 4 |
| 7 | двукроп’е | працяжнік |
| 8 | увайшоў у ролю | збянтэжыцца |
| 9 | адышоў, убок, паправіў, зарагатаў, падумаць | суфіксальны |
| 10 | буду лятаць | загадны |

## Кантрольная тэставая работа

| Заданне | Варыянт 1 |
|---|---|
| 1 | 3 |
| 2 | 1, 3, 4 |
| 3 | 2, 4 |
| 4 | 2, 5 |
| 5 | 3, 4, 5 |
| 6 | 1, 4 |
| 7 | 1, 3, 4 |
| 8 | 1, 3, 5 |
| 9 | 1, 4 |
| 10 | 2, 4 |
| 11 | [ ], (каб...), (што...). |
| 12 | 1, 2, 4 |
| 13 | 1, 2, 5 |
| 14 | 1, 4 |
| 15 | 1, 4, 5 |
| 16 |  |

| Заданне | Варыянт 1 |
| --- | --- |
| 17 | бяззлучнікавы складаны |
| 18 | спалучальныя |
| 19 | акалічнасная частка часу |
| 20 | мастацкі |

| Заданне | Варыянт 2 |
| --- | --- |
| 1 | 2 |
| 2 | 2, 3, 4 |
| 3 | 1, 5 |
| 4 | 1, 3 |
| 5 | 1, 4 |
| 6 | 1, 2, 5 |
| 7 | 2, 5 |
| 8 | 2, 4 |
| 9 | 1, 4 |
| 10 | 1, 3, 4 |
| 11 | (Калі...), [дык...], (што...). |
| 12 | 1, 2, 4, 5 |
| 13 | 1, 3, 5 |
| 14 | 2, 3, 4 |
| 15 | 2, 4, 5 |
| 16 |   |
| 17 | складаназалежны |
| 18 | спалучальныя |
| 19 | азначальная |
| 20 | апавяданне |

# 10 клас

## Маўленне

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 2, 4, 5 | 3 |
| 2 | 2, 5 | 1, 3, 4, 5 |
| 3 | 3, 4, 5 | 2, 4, 5 |
| 4 | 1, 2, 5 | 1, 4, 5 |
| 5 | 1, 3, 4 | 2, 5 |
| 6 | Агульнасць гістарычнага лёсу (Духоўная роднасць) | Першыя прыкметы вясны (Прыход вясны) |
| 7 | іх | паралельная |
| 8 | публіцыстычны, разважанне | мастацкі, апісанне |
| 9 | выказнік | азначальная |
| 10 | мужчынскі | прыставачна-суфіксальны |

## Слова ў тэксце

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 4 | 2, 3, 5 |
| 2 | 2, 4, 5 | 1, 3, 5 |
| 3 | 2, 3 | 2, 4 |
| 4 | 2, 4, 5 | 1, 4 |
| 5 | 3, 4 | 1, 3, 4 |
| 6 | 1, 3, 4 | 2, 5 |
| 7 | найбялейшы | прыходзьце |
| 8 | стойце | успыхваючы |
| 9 | пахаладзелы | ярчэй |
| 10 | ад | калі |

## Словазлучэнне і сказ у тэксце

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 4 | 2, 3, 4 |
| 2 | 2, 3, 4 | 1, 2, 4 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 3 | 1, 3, 5 | 2, 3, 4 |
| 4 | 2, 3 | 1, 4, 5 |
| 5 | 3, 4 | 1, 3, 5 |
| 6 | 1, 4 | 1, 3, 4 |
| 7 | безасабовы | дзейнік |
| 8 | двукроп’е | паслядоўнае |
| 9 | 1 | 1 |
| 10 | мастацкі | апавяданне |

## Кантрольная тэставая работа

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 3, 5 | 3, 4, 5 |
| 2 | 1, 3, 5 | 1, 4, 5 |
| 3 | 1, 3, 4 | 2, 4 |
| 4 | 2, 3, 4 | 1, 2, 5 |
| 5 | 1, 3, 4 | 2, 3, 5 |
| 6 | 2, 4 | 1, 2, 4 |
| 7 | 1, 3 | 1, 3, 5 |
| 8 | 1, 4, 5 | 1, 2, 4 |
| 9 | 1, 2, 5 | 2, 5 |
| 10 | 1, 3, 5 | 1, 3, 4 |
| 11 | 3, 4 | 2, 4, 5 |
| 12 | 1, 3, 5 | 2, 5 |
| 13 | 1, 4, 5 | 1, 2, 4 |
| 14 | 1, 4, 5 | 1, 3, 4 |
| 15 | 2, 4, 5 | 1, 3 |
| 16 | незакончанае | залежны |
| 17 | 1, 4 | 1, 5 |
| 18 | паслядоўнае | азначальная |
| 19 | тут | яго |
| 20 | мастацкі, апісанне | публіцыстычны, разважанне |

# 11 клас

## Арфаэпічныя нормы. Акцэнталагічныя нормы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 3, 4 | 2, 3, 4 |
| 2 | 2, 4, 5 | 1, 3, 4 |
| 3 | 1, 2, 5 | 1, 3 |
| 4 | 1, 5 | 3, 5 |
| 5 | 3, 4, 5 | 1, 4, 5 |
| 6 | 1, 2, 5 | 2, 5 |
| 7 | 1, 3, 4, 5 | 1, 3, 4, 5 |
| 8 | 1, 2, 3 | 1, 2, 3 |
| 9 | 3 | 4 |
| 10 | 1, 3, 4 | 2, 5 |

## Арфаграфічныя нормы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 3, 4 | 1, 4 |
| 2 | 1, 3, 4 | 1, 3, 4 |
| 3 | 1, 4, 5 | 1, 2, 4 |
| 4 | 2, 4, 5 | 3, 4, 5 |
| 5 | 1, 2, 3 | 1, 2, 4 |
| 6 | 1, 5 | 1, 4 |
| 7 | 2, 5 | 1, 4, 5 |
| 8 | 3, 4 | 1, 4, 5 |
| 9 | 3 | 4 |
| 10 | 2, 4, 5 | 1, 2, 4 |

## Марфалагічныя нормы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 5 | 2, 5 |
| 2 | 2, 3, 5 | 2, 5 |
| 3 | 2, 4, 5 | 2, 4, 5 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 4 | 1, 3, 5 | 1, 3, 5 |
| 5 | 2, 4, 5 | 2, 4, 5 |
| 6 | 1, 4 | 1, 3 |
| 7 | 1, 4, 5 | 1, 4, 5 |
| 8 | паслядоўны | паралельны |
| 9 | глыбей, яскравей, далей | глыбей, мацней, бліжэй, магутней |
| 10 | часціца | займеннік |

## Сінтаксічныя нормы. Пунктуацыйныя нормы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 4, 5 | 2, 4, 5 |
| 2 | 2, 3 | 2, 3 |
| 3 | 1, 3, 5 | 3, 4 |
| 4 | 2, 3 | 1, 3, 4 |
| 5 | 1, 4 | 1, 2, 4, 5 |
| 6 | 1, 3 | 2, 3 |
| 7 | 2, 4, 5 | 1, 2, 5 |
| 8 | апавяданне | апісанне |
| 9 | двукроп'е | двукроп'е |
| 10 | 2, 3, 4, 5, 8 | 5, 8 |

## Кантрольная тэставая работа

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 1 | 2, 3, 5 | 2, 3, 5 |
| 2 | 1, 3, 5 | 1, 2, 3 |
| 3 | 1, 3, 4 | 2, 5 |
| 4 | 1, 2, 4 | 1, 2, 4 |
| 5 | 3, 4, 5 | 2, 3, 5 |
| 6 | 2, 4, 5 | 2, 4, 5 |
| 7 | 2, 5 | 1, 2, 3 |

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|---|
| 8 | 3, 4, 5 | 1, 2, 3 |
| 9 | 1, 3, 4 | 2, 4, 5 |
| 10 | 2, 3, 4 | 2, 4 |
| 11 | 1, 5 | 1, 2 |
| 12 | 1, 2, 4 | 1, 4 |
| 13 | 1, 2 | 3, 5 |
| 14 | 1, 2, 4 | 1, 3, 5 |
| 15 | 1, 4 | 1, 4 |
| 16 | 4 | 3 |
| 17 | 3, 4 | 1, 3, 4 |
| 18 | публіцыстычны | публіцыстычны |
| 19 | займаючы | захоўваючы |
| 20 | пахавалі | лічаць |

# Змест

*Уводзіны* ... 3

**8 клас**

Словазлучэнне ... 5
Двухсастаўныя сказы ... 10
Аднасастаўныя сказы. Няпоўныя сказы ... 15
Сказы з аднароднымі членамі ... 20
Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі ... 27
Сказы з адасобленымі членамі ... 33
Кантрольная тэставая работа ... 39

**9 клас**

Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне ... 48
Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне ... 53
Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне ... 59
Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне ... 66
Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне ... 71
Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне ... 77
Кантрольная тэставая работа ... 82

**10 клас**

Маўленне ... 93
Слова ў тэксце ... 97
Словазлучэнне і сказ у тэксце ... 101
Кантрольная тэставая работа ... 106

**11 клас**

Арфаэпічныя нормы. Акцэнталагічныя нормы ... 115
Арфаграфічныя нормы ... 120
Марфалагічныя нормы ... 124
Сінтаксічныя нормы. Пунктуацыйныя нормы ... 128
Кантрольная тэставая работа ... 135

*Адказы* ... 145